# Парушэньні правоў чалавека ў Беларусі ў 2006 годзе

*Аналітычны агляд*

Менск 2007

*Парушэньні правоў чалавека ў Беларусі ў 2006 годзе.*
*Аналітычны агляд.*

*Аўтары:*
Бяляцкі Алесь
Лабковіч Уладзімір
Рэвяка Тацяна
Стэфановіч Валянцін

*Рэдактары:*
Рэвяка Тацяна
Чавусаў Юрый

У Аглядзе прадстаўлены аналіз сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі за 2006 год. Зборнік утрымлівае найбольш відавочныя і характэрныя факты парушэньняў правоў і свабодаў грамадзянаў краіны за гэты перыяд.

Агляд падрыхтаваны на падставе асабістых зваротаў ахвяраў парушэньняў правоў чалавека, фактаў, зафіксаваных праваабаронцамі, а таксама інфармацыі з адкрытых крыніцаў (СМІ, Інтэрнэт-сайты spring96.org. svaboda.org, baj.ru, charter97.org і інш.).

Праваабарончы цэнтр «Вясна», 2007

## Уступ

Папярэдні “Агляд-Хроніка парушэньняў правоў чалавека ў 2005 годзе” склаў каля пяцісот старонак. У сувязі з аб’ёмам фактаў і падзеяў, якія неабходна было апрацаваць, яго выданьне зацягнулася і прыпала ўжо на другую палову 2006 году. І мы зразумелі, што колькасьць фактычнага матэрыялу, канкрэтных эпізодаў і выпадкаў, якія тычацца парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі за 2006 год, можа стаць проста непад’ёмным выданьнем. Таму, дзеля захаваньня аператыўнасьці і актуальнасьці Агляду, мы вырашылі зьмяніць яго фармат, адмовіцца ад скрупулёзнай факталогіі парушэньняў правоў чалавека і зрабіць яго больш аналітычным і дасьледчым.

У гэтым Аглядзе мы паставілі задачу адсачыць тыя тэндэнцыі і зьмены сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, якія адбыліся за 2006 год, прывёўшы толькі некаторыя найбольш відавочныя і характэрныя факты. Падрабязную факталогію пакідаем за будучымі гісторыкамі гэтага перыяду, тым больш, што пераважная большасьць выпадкаў, зьвязаных з парушэньнямі правоў чалавека, апісаная на інфармацыйных інтэрнэт-сайтах. А найбольш поўны іх камплект ляжыць у судовых архівах, тэчках КДБ і Адміністрацыі прэзідэнта. Будзем спадзявацца, што яны ня зьнікнуць беззваротна і некалі ўбачаць сьвет.

2006 год стаў пераломным у сталеньні нашага народу. Рыхтуючы Агляд, мы адзначылі моцны ўздым грамадзкай актыўнасьці, які быў зьвязаны з веснавой прэзідэнцкай кампаніяй. Фактаў грамадзянскай мужнасьці, моладзевай актыўнасьці, нежаданьня мірыцца з несправядлівасьцю, якая сёньня ў Беларусі перадусім зыходзіць ад уладаў, было столькі, што можна скласьці сапраўдны летапіс змаганьня беларусаў за незалежнасьць, дэмакратыю і правы чалавека. У зьвязку з гэтым рэзка павялічыліся і рэпрэсіі, якія ўлады ўжывалі супраць сваіх палітычных апанентаў.

Сістэма, створаная А.Лукашэнкам і ягонымі памагатымі, мае цалкам таталітарны характар. Агрэсіўнасьць да сваіх палітычных і ідэйных апанентаў, падазронасьць і недавер да сябе саміх, якія

працінаюць усе дзяржаўныя структуры, спробы кантролю любых праяваў грамадзянскай актыўнасьці, няздольнасьць да трансфармацыі – гэта яе характэрныя рысы. Усё большую вагу ў дзяржаўным кіраваньні набываюць рэпрэсіўныя структуры – міліцыя і яе сьпецатрады, пракуратура, падатковая інсьпекцыя і асабліва КДБ.

Усё меншае значэньне як незалежная галіна ўлады маюць суды. Вясна 2006 году паказала поўную няздольнасьць беларускіх судоў займаць аб'ектыўную пазіцыю і яскрава выявіла суцэльную залежнасьць судзьдзяў ад выканаўчай улады. Суд выкарыстоўваўся як рэпрэсіўны інструмент, накіраваны супраць палітычных апанентаў існуючай улады.

Усё большы ўплыў на жыцьцё грамадзтва аказвала сетка ідэалагічных работнікаў, створаная Лукашэнкам – плойма вызваленых ад іншай працы ідэолагаў у ВНУ, выканкамах і на прадпрыемствах. Яны чуйна назіралі за “правільнасьцю” думак беларускіх грамадзянаў, “арганізоўвалі” патрэбныя вынікі выбараў, бралі ўдзел у выключэньні студэнтаў з ВНУ і звальненьнях працоўных па палітычных матывах, стаўшы часткаю рэпрэсіўнай машыны.

Яшчэ больш заідэалагізаванымі сталі дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі. У той час, калі рэшткі незалежнай прэсы адчуваюць моцны эканамічны, гаспадарчы і палітычны прэсінг, цудам выжываючы ў неспрыяльных умовах, дзяржаўныя СМІ займаюцца адкрытай прапагандай, пляжаць “заказаных” уладамі палітычных сапернікаў, дэманструючы поўную адсутнасьць чалавечай маралі і журналісцкай этыкі. З журналісцкіх выданьняў яны пераўтварыліся ў ідэалагічную зброю на службе дзяржаўнай таталітарнай сістэмы.

Афіцыйны прафсаюз Беларусі фактычна пераўтвораны ў яшчэ адное дзяржаўнае міністэрства і зусім не займаецца абаронаю правоў працоўных. А сістэма заключэньня кантрактаў з усімі працоўнымі дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстановаў стала рэпрэсіўным інструментам у руках выканаўчых уладаў, які ўжываецца супраць грамадзянаў, ня згодных з тымі ці іншымі пазіцыямі ва ўладкаваньні нашай грамадзкай сістэмы.

Усё меншае значэньне на жыцьцё грамадзтва аказваюць такія суб'екты палітычнага і грамадзкага ўладкаваньня, як палітычныя партыі і грамадзкія арганізацыі, якія падвяргаюцца бясконцым рэпрэсіям і абмежаваньням з боку створанай сістэмы дзяржаўнага кіраваньня.

Праблема захаваньня ўлады любымі сродкамі зьяўляецца галоўнай і фундаментальнай ва ўсіх дзеяньнях сёньняшняга прэзі-

дэнта і ягонага атачэньня. У гэтым мы знаходзім тлумачэньне антыканстытуцыйным дзеяньням па зьмене Канстытуцыі ў 2004 годзе, якія далі А. Лукашэнку магчымасьць удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах неабмежаваную колькасьць разоў. У гэтым палягаюць тыя заканадаўчыя зьмены, якія дазваляюць уладам “легальна”, на падставе законаў, перасьледаваць сваіх палітычных і грамадзкіх апанентаў. А робіцца гэта часта з парушэньнем нават гэтага, не адпавядаючага стандартам правоў чалавека, заканадаўства, якое Беларусь мае на сёньня.

Таму невыпадковы быў той надзвычай высокі ўзровень рэпрэсіяў, які абрынуўся на беларускае грамадзтва ў 2006 годзе, калі любая грамадзкая актыўнасьць успрымалася як адкрытая пагроза. Улады ўжылі ўсе магчымыя сродкі, якія займелі ў сваім арсенале за мінулыя гады, каб не дапусьціць праяваў сапраўдных настрояў і думак у беларускім грамадзтве і выхаду іх на паверхню грамадзкага жыцьця, каб дэзарганізаваць і запалохаць беларускіх грамадзянаў, утрымаць іх у пасіўным і замбаваным стане.

Рэпрэсіі закранулі шырокія слаі насельніцтва. Як ніколі раней шмат было ўзбуджана крымінальных справаў супраць апанентаў дзеючага рэжыму, праведзена адміністрацыйных працэсаў за ўдзел у мітынгах, пікетах і дэманстрацыях, за распаўсюд друкаваных матэрыялаў. Як ніколі шчыравала КДБ, накіраваўшы свае высілкі на нейтралізацыю актыўнасьці беларускіх грамадзянаў. Як ніколі шмат студэнтаў і працоўных страцілі вучобу і працу з-за сваіх грамадзка-палітычных меркаваньняў. Супраць грамадзка-палітычных актывістаў былі ўжытыя і такія цяжкія, цалкам беспадстаўныя абвінавачаньні, як падрыхтоўка тэрарыстычных замахаў, згвалтаваньні, перахоўваньне зброі, перавоз наркотыкаў, а ўсіх мяркуемых удзельнікаў пасьлявыбарчых акцыяў пратэсту высокія дзяржаўныя чыны адкрыта па тэлевізіі абвясьцілі патэнцыйнымі тэрарыстамі.

Разам з тым значны вал рэпрэсіяў з боку беларускіх уладаў адлюстроўвае сапраўдны ўзровень супраціву беларускага грамадзтва, накіраваны супраць беззаконьня і сваволья. 2006 год паказаў, што значная частка беларускіх грамадзянаў жадае жыць у дэмакратычнай прававой дзяржаве, дзе б шанаваліся іхнія правы. Таму даволі абстрактны лозунг “За свабоду!”, які напачатку быў узьняты грамадзкімі арганізацыямі, а затым падхоплены і ўсёй аб’яднанай апазіцыяй, набыў у беларускім грамадзтве такое актуальнае значэньне. У гэтым кароткім выразе акумуляваныя ўсе спадзяваньні

і жаданьні беларускага грамадзтва, якое сёньня знаходзіцца ў несвабодным, запрыгоненым стане.

З 2006 году ў Беларусі пачаўся новы адлік часу. Людзі ўсё меней сталі баяцца прэсінгу і абмежаваньняў з боку ўлады. Адчуваецца ўсё больш адкрытага, а часьцей прыхаванага супраціву з боку людзей да выкананьня розных палітычных замоваў і ўдзелу ў розных кампаніях, арганізаваных уладамі.

Усё менш палохаюць рэпрэсіі грамадзкіх і палітычных актывістаў, якія гатовыя ахвяраваць уласнай свабодаю, адстойваючы дэмакратычныя ідэалы і прынцыпы. Рэпрэсаваныя актывісты маюць сур’ёзную падтрымку і спагаду ў грамадзтве, псіхалагічна яны не адчуваюць сябе адшчапенцамі і дысідэнтамі, бо вельмі шмат людзей у Беларусі стаіць на іхнім баку. Беларускае грамадзтва паступова выходзіць з таго маральнага і палітычнага крызісу, у які яго загналі беларускія ўлады.

Мы спадзяемся, што гэтае дасьледаваньне пры зьмене палітычнай сітуацыі ў Беларусі дапаможа хутка і эфектыўна пазбавіцца постсавецкай таталітарнай сістэмы, створанай сёньняшнімі беларускімі ўладамі, якая літаральна аблытвае нашае грамадзкае і сацыяльнае жыцьцё.

Дзеля таго, каб нашае грамадзтва мела добрыя шанцы для маральнага аздараўленьня, дзеля незваротнасьці дэмакратычных працэсаў, якія наступяць пасьля зьмены ўлады, мы мусім паймен-на ведаць тых асобаў, якія бралі ўдзел у арганізацыі і выкананьні рэпрэсіяў супраць грамадзянаў Беларусі, з тым, каб у будучыні яны ня мелі ніякага дачыненьня да дзяржаўнага кіраваньня, да ўлады. Народ павінен ведаць сваіх “герояў”, а “героі” павінны таксама ведаць, што прыйдзе час, і яны адкажуць за злачынствы супраць свайго народу.

Мы перакананыя, што інфармаванасьць беларускага грамадзтва, маральныя арыенціры, заснаваныя на еўрапейскіх каштоўнасьцях, разуменьне важнасьці правоў чалавека, выхаваньне асабістай годнасьці ў нашых людзей ня дасьць таталітарным уладам у Беларусі ніякага шанцу на існаваньне.

**Алесь БЯЛЯЦКІ.**

## 1. Зьмены ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, якія датычаць правоў чалавека

Згодна з Канстытуцыяй, Рэспубліка Беларусь дэкларуецца як непадзельная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава. Канстытуцыя вызначае прынцып вяршэнства права, абмяжоўвае паўнамоцтвы ўсіх дзяржаўных органаў межамі Канстытуцыі і прынятых у адпаведнасьці з ёй актаў заканадаўства. Забесьпячэньне правоў і свабодаў грамадзянаў абвяшчаецца найвышэйшай мэтай дзяржавы. Пры гэтым Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрынятых прынцыпаў міжнароднага права, забясьпечвае адпаведнасьць унутранага заканадаўства гэтым прынцыпам. Згодна з Асноўным законам, дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь павінна ажыцьцяўляцца на падставе падзелу яе на заканадаўчую, выканаўчую і судовую, а дзяржаўныя органы ў межах сваіх паўнамоцтваў павінны быць самастойнымі, узаемадзейнічаць паміж сабой, стрымліваць і ўраўнаважваць адзін аднаго.

Насуперак фармальным палажэньням Канстытуцыі, рэальны парадак ажыцьцяўленьня дзяржаўнай улады ў Беларусі не дазваляе назваць Рэспубліку Беларусь прававой дзяржавай. Калі згаданыя нормы Канстытуцыі падчас яе прыняцьця трактаваліся як дэкляраваная мэта, пэўны накірунак пабудовы незалежнай беларускай дзяржавы, то зараз іх наяўнасьць у Асноўным законе толькі падкрэсьлівае адсутнасьць альбо чыстую дэкларатыўнасьць падставовых інстытутаў, якія б дазвалялі характэрызаваць разьвіцьцё краіны ў накірунку пабудовы прававой дзяржавы.

Існуючая ў Рэспубліцы Беларусь іерархія крыніцаў права не адпавядае прынцыпам вяршэнства Канстытуцыі і закону, назіраецца поўная падпарадкаванасьць права тым актам, якія кіраўнік дзяржавы выдае адзінаасобна. Звычайная класічная іерархія нацыянальных крыніцаў права спрошчана выглядае як трохузроўневая структура, дзе на першым месцы стаіць Канстытуцыя, пад ёй – законы, а пад імі – падзаконныя акты. У Беларусі ж іерархія

нацыянальных крыніцаў права мае чатырохузроўневую структуру, паводле зьмяншэньня юрыдычнай сілы – Канстытуцыя, акты прэзідэнта (указы і часовыя дэкрэты), законы і падзаконныя акты. Такім чынам, з-пад прынцыпу законнасьці выбіваецца падстаровы элемент: законы, прынятыя прадстаўнічым органам заканадаўчай улады, робяцца нязначным элементам прававой канструкцыі і саступаюць па сіле актам адзінаасобнай службовай асобы. Без падмурку законнасьці дэвальвуецца сам правапарадак, а пра існаваньне прававой дзяржавы ня можа быць нават гаворкі. Такая іерархія прававых актаў несумяшчальная з прынцыпамі прававой дзяржавы і непазьбежна цягне за сабою неабгрунтаванае абмежаваньне і парушэньне правоў чалавека.

У 2006 г. у беларускае заканадаўства былі ўнесеныя шэраг зьменаў, палажэньні якіх тым ці іншым чынам закранаюць правы чалавека. Але найбольш істотныя зьмяненьні нарматыўнага рэгуляваньня рэалізацыі грамадзянскіх правоў і свабодаў зьвязаныя з уступленьнем у сілу з 1 студзеня 2006 году зьменаў у Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, які быў дапоўнены напрыканцы 2005 году шэрагам палітычных артыкулаў. Такім чынам, адбылася далейшая палітызацыя крымінальнага заканадаўства краіны.

Крымінальны кодэкс быў дапоўнены артыкулам 193-1 (Незаконная арганізацыя дзейнасьці грамадзкага аб’яднаньня, рэлігійнай арганізацыі альбо фонду, альбо ўдзел у іх дзейнасьці). Норма артыкулу прадугледжвае, што арганізацыя дзейнасьці альбо ўдзел у дзейнасьці арганізацый і фондаў, у адносінах да якіх уступіла ў сілу рашэньне аб прыпыненьні іх дзейнасьці альбо закрыцьці, караюцца штрафам альбо арыштам на тэрмін да шасьці месяцаў, альбо пазбаўленьнем волі на тэрмін да двух гадоў. Ва ўмовах, калі пераважная колькасьць няўрадавых арганізацыяў Беларусі працуе без рэгістрацыі, а атрымаць дзяржаўную рэгістрацыю для незалежнай ад уладаў грамадзкай структуры практычна немагчыма, гэтая норма аўтаматычна запісвае ў злачынцы тысячы беларускіх грамадзянаў. Асоба, якая добраахвотна спыніла ўдзел у такой арганізацыі і заявіла аб гэтым адпаведным дзяржаўным органам, вызваляецца ад крымінальнай адказнасьці, калі ў яе дзеяньнях няма складу іншага злачынства.

У артыкул 193 (Арганізацыя альбо кіраўніцтва грамадзкім аб’яднаньнем, рэлігійнай арганізацыяй, якія пасягаюць на асобу, правы і абавязкі грамадзянаў) была ўведзеная норма, якая павялічвае памер адказнасьці за гэтае злачынства, калі яно ўчыненае

ў форме незарэгістраванай грамадзкай арганізацыі (караецца арыштам на тэрмін да 6 месяцаў альбо пазбаўленьнем волі на тэрмін да трох гадоў).

Наяўныя нормы артыкулаў 193 і 193-1 істотным чынам абмяжоўваюць магчымасьці рэалізацыі свабоды асацыяцыяў у Рэспубліцы Беларусь. Падобныя абмежаваньні зьяўляюцца неабгрунтаванымі і супярэчаць тым міжнародным абавязацельствам, якія Рэспубліка Беларусь узяла на сябе, ратыфікаваўшы міжнародныя акты ў галіне правоў чалавека.

Артыкул 293 (Масавыя беспарадкі) быў дапоўнены трэцяй часткай, згодна з якой навучаньне альбо іншая падрыхтоўка асобаў для ўдзелу ў масавых беспарадках альбо фінансаваньне падобных справаў караюцца арыштам на тэрмін да шасьці месяцаў альбо пазбаўленьнем волі на тэрмін да трох гадоў. З улікам таго, што дадзены артыкул пра масавыя беспарадкі ўжо ўтрымліваў нормы пра арганізацыю масавых беспарадкаў (частка 1 названага артыкулу), то гэтая навэла азначае крыміналізацыю тых дзеяньняў, якія фактычна масавымі беспарадкамі не зьяўляюцца і не парушаюць грамадзкі спакой. Фактычна караецца нават не замах на масавыя беспарадкі, а ўсяго толькі намер на іх учыненьне. Туманнасьць фармулёвак, якія ўжываюцца ў дадзеным артыкуле (навучаньне альбо іншая падрыхтоўка асобаў ды фінансаваньне альбо іншае матэрыяльнае забесьпячэньне), дазваляе выкарыстоўваць гэтую норму адвольным чынам і прыцягваць да адказнасьці па гэтым артыкуле нават і без фактычнай наяўнасьці злачыннага дзеяньня як абавязковай аб’ектыўнай часткі складу злачынства. Такім чынам, паўстае пагроза неабгрунтаванага абмежаваньня свабоды сходаў у Рэспубліцы Беларусь, а таксама магчымага выкарыстаньня дадзенай нормы супраць любой адукацыйна-асьветніцкай дзейнасьці, якая, на думку дзяржслужбоўцаў, у перспектыве можа пагражаць устойлівасьці аўтарытарнага рэжыму ў Беларусі.

Артыкул 342 Крымінальнага кодэксу быў дапоўнены палажэньнем, якое прадугледжвае, што навучаньне альбо іншая падрыхтоўка асобаў для ўдзелу ў групавых дзеяньнях, якія груба парушаюць грамадзкі парадак (зьвязаныя з непадпарадкаваньнем законным патрабаваньням супрацоўнікаў улады альбо тыя, што выклікалі парушэньне працы транспарту, прадпрыемстваў, установаў альбо арганізацыяў), а роўна фінансаваньне альбо іншае матэрыяльнае забесьпячэньне такой дзейнасьці пры адсутнасьці прыкметаў больш цяжкага злачынства караецца арыштам да шасьці месяцаў альбо пазбаўленьнем волі на тэрмін да двух гадоў. Відавочна, што

дадзеная навэла ідзе ў пары з папярэдняй нормай артыкулу 293 і стварае магчымасьць прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці тых асобаў, якія вядуць асьветніцкую дзейнасьць у галіне грамадзянскай актыўнасьці. Пад дадзеную норму могуць падпадаць тыя сродкі палітычнай і грамадзянскай актыўнасьці, якія відавочна не зьвязаныя з арганізацыяй масавых беспарадкаў – акцыі негвалтоўнага супраціву, забастоўкі, перакрыцьцё транспартных шляхоў, флэш-мобы, галадоўкі  і інш. Гэты атрыкул стварае ўмовы для парушэньня шэрагу грамадзянскіх і сацыяльных правоў, гарантаваных міжнароднымі нормамі ў галіне правоў чалавека.

Згодна з новай рэдакцыяй Крымінальнага кодэксу ўзмоцненая адказнасьць за публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады альбо гвалтоўнай зьмены канстытуцыйнага ладу (артыкул 361). За гэта прадугледжанае пакараньне ад шасьці месяцаў арышту да пазбаўленьня волі на тэрмін да трох гадоў. Пры гэтым значна пашыраецца аб’ект абароны, які ахоўваецца дадзеным артыкулам і павялічваецца сьпектр магчымых сродкаў распаўсюджваньня дадзеных заклікаў: “Публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады альбо гвалтоўнай зьмены канстытуцыйнага ладу, альбо здрады дзяржаве, альбо ўчыненьню тэрарыстычнага акту, альбо дыверсіі, альбо ўчыненьню іншых дзеяньняў на шкоду зьнешняй бясьпецы Рэспублікі Беларусь, яе суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасьці, нацыянальнай бясьпецы і абараназдольнасьці, альбо распаўсюд матэрыялаў, якія ўтрымліваюць гэткія заклікі”. Паводле другой часткі дадзенага артыкулу, асабліва караюцца такія  заклікі, калі яны зьвернутыя да замежнай дзяржавы, замежнай альбо міжнароднай арганізацыі. Падобныя дзеяньні караюцца арыштам на тэрмін да  шасьці месяцаў альбо пазбаўленьнем волі на тэрмін да трох гадоў (калі гэтыя заклікі будуць распаўсюджвацца праз СМІ, пакараньне ўзрастае да  пазбаўленьня волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў). Відавочна, што настолькі туманнае вызначэньне магчымых злачынных дзеяньняў без канкрэтызацыі магчымых метадаў учыненьня злачынства дазваляе пераўтварыць дадзены артыкул у дзейсны сродак барацьбы са свабодай слова і з палітычнымі апанентамі дзеючай улады. Фактычна, любая праява незадаволенасьці дзеючым рэжымам і заклік да зьмяненьня становішча могуць быць трактаваныя як злачынныя.

Крымінальны кодэкс таксама дапоўнены новым артыкулам 369-1 (Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь). Пад дыскрэдытацыяй маецца на ўвазе “паведамленьне замежнай дзяржаве, замежнай альбо міжнароднай арганізацыі заведама ілжывай інфармацыі аб

палітычным, эканамічным і сацыяльным, ваенным альбо міжнародным становішчы Рэспублікі Беларусь, прававым палажэньні грамадзянаў Рэспублікі Беларусь альбо яе органаў улады". Такія дзеяньні караюцца арыштам на тэрмін да шасьці месяцаў альбо пазбаўленьнем волі на тэрмін да двух гадоў. Пры наяўнасьці ў Крымінальным кодэксе агульнай адказнасьці за паклёп, новая норма накіраваная фактычна выключна супраць палітычных апанентаў, праваабаронцаў і незалежных журналістаў. Дадзены артыкул – класічны прыклад палітычнага крымінальнага злачынства, які стварае пагрозу жорсткага і неабгрунтаванага парушэньня свабоды слова ў Рэспубліцы Беларусь.

9 студзеня 2006 году, напярэдадні выбараў прэзідэнта, Крымінальны кодэкс быў дапоўнены артыкулам 290-1 "Фінансаваньне тэрарыстычнай дзейнасьці", які ўстанаўлівае адказнасьць за прадастаўленьне альбо зьбіраньне грашовых сродкаў, каштоўных папераў альбо іншай маёмасьці, у тым ліку маёмасных правоў і выключных правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасьці, у мэтах выкарыстаньня ў тэрарыстычнай дзейнасьці. За такое злачынства прадугледжанае пакараньне ў выглядзе пазбаўленьня волі на тэрмін ад васьмі да дванаццаці гадоў з канфіскацыяй маёмасьці, а пры ўчыненьні злачынства групай асобаў – ад васьмі да пятнаццаці гадоў пазбаўленьня волі.

Акрамя таго, у абноўленым крымінальна-працэсуальным заканадаўстве (якое было зьмененае адначасова са зьмяненьнем Крымінальнага кодэксу і ўступіла ў дзеяньне ў 2006 годзе) прадугледжваецца магчымасьць затрыманьня органамі крымінальнага перасьледу асобаў, падазраваных у тэрарызме і ўчыненьні асабліва злоснага хуліганства, на тэрмін да 10 дзён да прымяненьня меры стрыманьня альбо вызваленьня з-пад варты.

У сьнежні 2006 году Палатай прадстаўнікоў быў прыняты, а Саветам Рэспублікі ўхвалены Закон "Аб супрацьдзеяньні экстрэмізму", які ўступае ў дзеяньне ў 2007 годзе і пагражае ўзмацненьнем палітычных рэпрэсіяў у краіне і ростам парушэньняў грамадзянскіх правоў.

У законе да экстрэмізму аднесеныя ня толькі дзеяньні, але і публічныя заклікі да экстрэмісцкай дзейнасьці, яе фінансаваньне альбо іншае садзеяньне яе ажыцьцяўленьню, у тым ліку праз прадастаўленьне нерухомасьці, навучальнай, паліграфічнай і іншай матэрыяльна-тэхнічнай базы, сродкаў электрасувязі, іншых матэры-

яльна-тэхнічных сродкаў і інфармацыйных паслугаў. Забароненае выданьне і распаўсюд праз медыі экстрэмісцкіх матэрыялаў. Любая арганізацыя, якая двойчы на працягу году ажыцьцявіла выданьне экстрэмісцкіх матэрыялаў, падлягае закрыцьцю, а грамадзяне за гэткую дзейнасьць прыцягваюцца да адказнасьці ў адпаведнасьці з заканадаўствам. Адзначым, што ў Крымінальным кодэксе Рэспублікі Беларусь да гэтага ўжо былі артыкулы, якія прадугледжваюць крымінальную адказнасьць і за распальваньне нацыянальнай, расавай, рэлігійнай і іншай варожасьці (артыкул 130), і за дзейнасьць арганізацыяў, якія пасягаюць на законныя правы асобы і грамадзянаў краіны (артыкул 193), і за стварэньне незаконнага ўзброенага фармаваньня (артыкул 287), і за заклікі да зьвяржэньня існуючага канстытуцыйнага ладу (артыкул 361). Забарону на ажыцьцяўленьне дзейнасьці, якая скіраваная на прапаганду расавай, нацыянальнай, сацыяльнай варожасьці, захоп улады неканстытуцыйным шляхам і іншыя дзеяньні такога кшталту ўтрымліваюць законы “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях”, “Аб палітычных партыях”, “Аб масавых мерапрыемствах” і інш. Гэтыя законы прадугледжваюць ліквідацыю і прыпыненьне дзейнасьці партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў за такую дзейнасьць у судовым парадку. Пры гэтым за апошнія тры гады больш за сто НДА краіны ліквідаваныя ў судовым парадку і без абвінавачаньняў у экстрэмісцкай дзейнасьці. Згодна з законам, прафілактыку праяваў экстрэмізму ажыцьцяўляюць органы пракуратуры, Міністэрства юстыцыі, КДБ і іншыя дзяржаўныя органы, у кампетэнцыі якіх вынясеньне афіцыйных папярэджаньняў арганізацыям і грамадзянам аб недапушчальнасьці “экстрэмісцкай дзейнасьці”.

Такая карэкціроўка заканадаўства наўпрост зьвязаная з падвядзеньнем прававой базы для палітычных рэпрэсіяў, што былі ўзмоцненыя напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў і ўжываліся на працягу 2006 году ў Беларусі.

Адначасова варта адзначыць, што ў 2006 годзе атрымала заканадаўчае замацаваньне ранейшая дыскрымінацыйная практыка вызваленьня ад крымінальнай адказнасьці асобаў, асуджаных па эканамічных злачынствах. У студзені 2006 году ўступіла ў сілу адпаведная папраўка да Крымінальнага кодэксу, якая прадугледжвае вызваленьне ад крымінальнай адказнасьці асобаў, якія нанесьлі эканамічную страту дзяржаве, пры вяртаньні гэтай страты і раскайваньні. Унесенымі зьменамі, у прыватнасьці, прадугледжваецца “вызаленьне ад крымінальнай адказнасьці ў сувязі з добраахвотнай

кампенсацыяй нанесенай страты". Дыскрымінацыйны характар такой практыкі абумоўлены тым, што гэткае вызваленьне прымяняецца асабіста прэзідэнтам і выключна ў дачыненьні да лаяльных дзяржаўных чыноўнікаў-карупцыянераў. Такім чынам, кіраўнік дзяржавы фактычна ўзяў на сябе судовыя функцыі, датычныя прызначэньня пакараньня і вызваленьня ад пакараньня.

6 кастрычніка 2006 году ўступілі ў дзеяньне зьмены ў Выбарчы кодэкс і іншыя акты заканадаўства, ініцыяваныя Цэнтральнай камісіяй па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Замест таго, каб наблізіць выбарчае заканадаўства да еўрапейскіх стандартаў (пашырыць правы назіральнікаў, гарантаваць наяўнасьць у выбарчых камісіях прадстаўнікоў палітычных партыяў, якія прымаюць удзел у выбарах, пашырыць магчымасьці агітацыі для кандыдатаў, дэталізаваць і зрабіць больш празрыстай працэдуру падліку галасоў), беларускія заканадаўцы ўнесьлі некаторыя касьметычныя зьмены, а па некалькіх пазіцыях легалізавалі рэпрэсіўныя практыкі, што ўжываліся раней без нарматыўнага рэгуляваньня альбо выклікалі спрэчкі адносна растлумачэньня права. Шэраг гэтых зьменаў наўпрост датычыць магчымасьці рэалізацыі грамадзянамі права на ўдзел у кіраваньні дзяржавай.

Замацаваньнем істотнага абмежаваньня свабоды сходаў зьявілася ўнясеньне зьменаў у артыкулы 5 і 6 Закону "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь", паўторанае ў частцы 8 артыкулу 45 Выбарчага кодэксу. Гэтыя зьмены прадугледжваюць, што масавыя мерапрыемствы ў мэтах агітацыі за абраньне кандыдата ў дэпутаты, прэзідэнта праводзяцца са згоды мясцовых органаў улады і рэгулююцца заканадаўствам аб масавых мерапрыемствах. Такім чынам, на сходы і мітынгі перадвыбарчага характару фактычна распаўсюджаны агульны дазваляльны парадак, які не адпавядае міжнародным стандартам у галіне свабоды мірных сходаў, а таксама абмяжоўвае грамадзянаў у праве на ўдзел у кіраваньні сваёй дзяржавай. Адзінае палягчэньне ўмоваў арганізацыі і правядзеньня такіх мерапрыемстваў заключаецца ў тым, што заява можа быць пададзеная не пазьней чым за пяць дзён да заяўленага тэрміну, а рашэньне павінна быць вынесенае на працягу трох дзён з даты рэгістрацыі заявы. Адначасова новая норма дазваляе мясцовым уладам беспадстаўна адмаўляць у дазволах на правядзеньне перадвыбарчых сходаў, адвольна зьмяняць месцы ці час іх правядзеньня. Да таго ж, у адпаведнасьці з 6 арт. Закону "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь", пры правя-

дзеньні падобных сходаў павінны быць аплочаныя паслугі міліцыі, хуткай дапамогі, камунальных службаў па прыборцы тэрыторыі, дзе праходзіць масавае мерапрыемства. Пры гэтым не ўказваецца, з якіх сродкаў праводзяцца гэтыя выплаты.

Вялікую занепакоенасьць выклікаў прыняты 24 лістапада 2006 году Дэкрэт прэзідэнта № 18 “Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у сацыяльна неўладкаваных сем’ях”, які ўступае ў сілу з 1 студзеня 2007 года. Некаторыя палажэньні Дэкрэту №18 наўпрост супярэчаць Канстытуцыі Беларусі, нормам заканадаўства і міжнародным актам у галіне правоў чалавека.

У адпаведнасьці з п. 1 Дэкрэту, дзеці падлягаюць дзяржаўнай абароне і зьмяшчэньню на дзяржаўнае забесьпячэньне ў выпадку, калі ўстаноўлена, што бацькі (бацька ці маці) вядуць амаральны лад жыцьця, што аказвае шкодны ўплыў на дзяцей, зьяўляюцца хранічнымі алкаголікамі ці наркаманамі альбо іншым чынам неналежна выконваюць свае абавязкі па выхаваньні і ўтрыманьні дзяцей, у сувязі з чым яны знаходзяцца ў сацыяльна небясьпечным становішчы. Пры гэтым Дэкрэт не дае тлумачэньня, якія паводзіны бацькоў носяць амаральны характар, што зьяўляецца сацыяльна небясьпечным становішчам. Выклікае занепакоенасьць тое, што палажэньні Дэкрэту могуць быць выкарыстаныя ў палітычных мэтах.

Найбольшую трывогу выклікаюць палажэньні Дэкрэту, якія прадугледжваюць пазасудовую працэдуру адабраньня дзяцей у бацькоў. Згодна з п. 1 дадзенага Дэкрэту, Камісія па справах няпоўнагадовых раённага (гарадзкога) выканаўчага камітэту, мясцовай адміністрацыі (далей – Камісія па справах няпоўнагадовых) па месцы знаходжаньня дзіцяці ў трохдзённы тэрмін прымае рашэньне аб прызнаньні дзіцяці падлягаючым дзяржаўнай абароне, аб адабраньні дзіцяці ў бацькоў (маці ці бацькі), устанаўленьні яму статусу дзіцяці, якое засталося без утрыманьня бацькоў, зьмяшчэньні дзіцяці на дзяржаўнае забесьпячэньне (далей – рашэньне аб адабраньні дзіцяці). Пры вынясеньні рашэньня аб адабраньні дзіцяці Камісія па справах непаўнагадовых выконвае функцыі органаў апекі. Прынятае рашэньне аб адабраньні дзіцяці зьяўляецца абавязковым для выкананьня дзяржаўнымі органамі, іншымі арганізацыямі, іх службовымі асобамі, грамадзянамі.

Гэтыя палажэньні Дэкрэту супярэчаць арт. 32 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, паводле якога дзеці могуць быць аддзеленыя ад сваёй сям’і супраць волі бацькоў і іншых асобаў, якія іх замяняюць,

толькі на падставе рашэньня суда, калі бацькі і іншыя асобы, што іх замяняюць, не выконваюць сваіх абавязкаў. Яны супярэчаць таксама і шэрагу міжнародных нормаў у галіне правоў чалавека. Так, у адпаведнасьці з арт. 9 Канвенцыі аб правах дзіцяці, прынятай Генеральнай Асамблеяй ААН 20.11.1989 году, дзяржавы-удзельніцы забясьпечваюць, каб дзіця не разлучалася са сваімі бацькамі насуперак іх жаданьню, за выключэньнем выпадкаў, калі кампетэнтныя органы, згодна з судовым рашэньнем, вызначаюць у адпаведнасьці з законам, што такое разлучэньне неабходнае ў інтарэсах дзіцяці. Такое вызначэньне можа быць неабходным у тым ці іншым канкрэтным выпадку, напрыклад, калі бацькі жорстка абыходзяцца з дзіцем ці не клапоцяцца аб ім, ці калі бацькі пражываюць паасобку і неабходна прыняць рашэньне адносна месца пражываньня дзіцяці.

Крытыку таксама выклікаюць палажэньні Дэкрэту аб прымусовым працаўладкаваньні абавязаных бацькоў. Паводле п. 9 Дэкрэту, калі ўзровень заработнай платы працуючай абавязанай асобы не дазваляе на працягу шасьці месяцаў у поўным аб'ёме выконваць абавязкі па ўтрыманьні дзяцей, гэтая асоба падлягае працаўладкаваньню на новае месца працы ў адпаведнасьці з п. 13 і 14 Дэкрэту. Кантроль за штодзённай яўкай абавязаных асобаў на працу ажыцьцяўляюць наймальнікі сумесна з органамі ўнутраных справаў і органамі дзяржаўнай службы занятасьці. Ухіленьне абавязанай асобы ад яўкі на працу, якая складае дзесяць і болей працоўных дзён на працягу трох месяцаў, альбо ўтойваньне, заніжэньне абавязанай асобай памеру заработнай платы і іншых даходаў, альбо іншае віноўнае дзеяньне (безьдзеяньне), якое пацягнула за сабой невыкананьне ці няпоўнае выкананьне штомесячных абавязацельстваў па кампенсацыі выдаткаў па ўтрыманьні дзяцей, зьяўляецца падставай дзеля прыцягненьня да крымінальнай адказнасьці ў адпаведнасьці з арт. 174 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь. Артыкул 174 Крымінальнага кодэксу (ухіленьне бацькоў ад утрыманьня дзяцей альбо ад кампенсацыі выдаткаў, якія былі затрачаныя дзяржавай на ўтрыманьне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забесьпячэньні) прадугледжвае пакараньне ў выглядзе папраўчых працаў на тэрмін да двух гадоў ці абмежаваньне волі на тэрмін да трох гадоў. Пры гэтым, паводле Дэкрэту № 18, асобы, асуджаныя па гэтым артыкуле, не падлягаюць умоўна-датэрміноваму вызваленьню. Такім чынам, Дэкрэтам № 18 замацоўваецца інстытут прымусовага працаўладкаваньня.

У дадзеным выпадку палажэньні Дэкрэту супярэчаць Канстыту-

цыі, паколькі паводле арт. 41 грамадзянам гарантуецца права на працу як найбольш варты сродак самазацьвярджэньня чалавека, гэта значыць — права на выбар прафесіі, роду заняткаў і працы ў адпаведнасьці з прызваньнем, здольнасьцямі, адукацыяй, прафесійнай падрыхтоўкай і з улікам грамадзкіх патрэбаў, а таксама на здаровыя і бесьпечныя ўмовы працы. Прымусовая праца забароненая, акрамя працы ці службы, якая вызначаецца згодна з прысудам суда ці ў адпаведнасьці з законам аб надзвычайным ці вайсковым становішчы. Паводле Канстытуцыі, праца зьяўляецца правам, а не абавязкам грамадзянаў. Прымусовая праца можа выкарыстоўвацца толькі ў адпаведнасьці з прысудам, які вынесены судом у сувязі з учыненьнем асобай дзеяньняў, якія цягнуць за сабой крымінальную адказнасьць. Разам з тым, палажэньні Дэкрэту № 18 уводзяць прымусовую працу за невыкананьне грамадзянскіх абавязацельстваў, якія ня ўтрымліваюць складу крымінальнага злачынства.

Нормы Дэкрэту № 18 у частцы прымусовага працаўладкаваньня грамадзянаў супярэчаць Канвенцыі “Аб прымусовай працы”, якая была прынятая 28 чэрвеня 1930 году Генеральнай канферэнцыяй Міжнароднай арганізацыі працы (МАП). У адпаведнасьці з п.1 арт. 1 Канвенцыі, кожная краіна-сябар МАП, якая ратыфікуе дадзеную Канвенцыю, абавязуецца ліквідаваць выкарыстаньне прымусовай і абавязковай працы ва ўсіх яе формах і праявах у як мага карацейшыя тэрміны. Паводле арт. 2 Канвенцыі, пад тэрмінам “прымусовай ці абавязковай працы” разумеецца ўсялякая праца ці служба, якая патрабуецца ад якой-небудзь асобы пад пагрозай пакараньня, для якой гэтая асоба не прапанавала добраахвотна сваіх паслугаў. Дадзены артыкул дае некаторыя дапушчальныя выключэньні. Так, тэрмін “прымусовая праца” не ўключае ў сябе: працы, якія выконваюцца ў сілу закону аб вайсковым абавязку; усялякую працу, якая зьяўляецца часткай звычайных грамадзянскіх абавязацельстваў грамадзянаў; усялякую працу, якая патрабуецца ад каго-небудзь у выніку судовага прысуду пры ўмовах, што гэтая праца выконваецца пад наглядам і кантролем дзяржаўных уладаў; працы пры надзвычайных сітуацыях (землятрус, паводка, пажар і г.д.).

Палажэньні Дэкрэту № 18, якія прадугледжваюць высяленьне абавязаных асобаў з іх жылых памяшканьняў, абмяжоўваюць і парушаюць права ўласнасьці грамадзянаў і супярэчаць патрабаваньням Грамадзянскага і Жыльлёвага кодэксаў Рэспублікі Беларусь.

Так, у адпаведнасьці з п. 15 Дэкрэту, па зысках мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў альбо ўпаўнаважаных імі арганізацыяў, абавязаныя асобы могуць быць выселеныя ў судовым парадку з

жылых памяшканьняў дзяржаўнага і прыватнага жылога фонду, якія яны займаюць, з прадастаўленьнем іншых памяшканьняў меншай плошчы і (ці) саступаючых ім па сваіх спажывецкіх якасьцях, у тым ліку па-за межамі дадзенага населенага пункту, на тэрмін, указаны ў рашэньні суда. Гэта значыць, прадугледжваецца высяленьне грамадзянаў у судовым парадку з жылых памяшканьняў, якія належаць ім на праве ўласнасьці (прыватнае жыльлё). Пры гэтым вызваленыя памяшканьні падлягаюць здачы па дамовах найму для пражываньня іншых асобаў, а для здачы такога памяшканьня ў наём нават не патрабуецца даверанасьці асобы, якой належыць гэтае памяшканьне.

Згодна з Жыльлёвым кодэксам, прадугледжваецца высяленьне з кватэраў грамадзянаў, якія пражываюць у жылых памяшканьнях на падставе дамовы найму жылога памяшканьня, г.зн., толькі жылых памяшканьняў дзяржаўнага фонду ці прыватнага пры ўмове, што яны ня маюць долі ва ўласнасьці на гэтае памяшканьне. У адпаведнасьці з п. 17 Пастановы Пленуму Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь “Аб некаторых пытаньнях прымяненьня судамі жыльлёвага заканадаўства” ад 30 сакавіка 2000 году, з жылых памяшканьняў на падставах, якія прадугледжаныя арт. 39 ЖК (у сувязі з немагчымасьцю сумеснага пражываньня), у судовым парадку без прадстаўленьня іншага жылога памяшканьня могуць быць выселеныя наймальнікі, члены іх сем’яў і іншыя асобы, якія пражываюць сумесна з імі ў дамах дзяржаўнага ці прыватнага фонду. На гэтых жа падставах могуць быць выселеныя члены сем’яў уласьнікаў жылых памяшканьняў, у тым ліку прыватызаваных, якія ня маюць долі ў праве ўласнасьці на гэтыя жылыя памяшканьні. Такім чынам, дзеючае жыльлёвае заканадаўства не прадугледжвае высяленьня з кватэраў уласьнікаў жылых памяшканьняў ці асобаў, якія маюць долю ва ўласнасьці на жылыя памяшканьні. Акрамя таго, насуперак патрабаваньням Грамадзянскага кодэксу (арт. арт. 210, 219, 236, 271 ГК), Дэкрэт №18 прадугледжвае магчымасьць распараджацца ўласнасьцю грамадзянаў без іх волі. Толькі ўласьнік добраахвотна можа прыняць рашэньне аб продажы, здачы ў наём жылога памяшканьня, якое належыць яму на праве ўласнасьці.

Выклікае заклапочанасьць і той факт, што выкарыстаньне на практыцы дадзеных палажэньняў Дэкрэту можа стварыць глебу для разнастайных злоўжываньняў з боку адпаведных службовых асобаў, надзеленых правам на высяленьне абавязаных асобаў з жылых памяшканьняў.

Пастановай Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27.12.2006

г. № 1729 зацьверджаныя Правілы прастаўленьня ў дакументах абавязаных асобаў, якія пацьвярджаюць іх асобу, адзнакі аб абавязку кампенсоўваць выдаткі, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманьне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забесьпячэньні. Паводле гэтых Правілаў, у пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, відзе на жыхарства замежнага грамадзяніна ці асобы без грамадзянства павінна прастаўляцца адпаведная адзнака (штамп). Гэта аналагічна практыцы часоў існаваньня Савецкага Саюзу, калі ў пашпартах грамадзянаў СССР рабіліся адзнакі аб наяўнасьці судзімасьцяў. Увядзеньне гэтых Правілаў можа прывесьці да разнастайных праяваў дыскрымінацыі гэтай катэгорыі грамадзянаў і ня будзе спрыяць іх далейшай сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі, а таксама можа стаць прычынаю пашырэньня катэгорыяў сацыяльных ізгояў.

12 чэрвеня 2006 году ў Закон “Аб адукацыі” ўнесеныя праўкі, якія замацавалі прымусовае працаўладкаваньньне выпускнікоў навучальных установаў. Практыка “разьмеркаваньня” існавала ў Беларусі і раней, але толькі ў 2006 годзе яна атрымала фундаментальную заканадаўчую базу. Выпускнікі вышэйшых і сярэдніх сьпецыяльных навучальных установаў Беларусі, якія атрымалі адукацыю за кошт бюджэтных сродкаў, павінны пасьля заканчэньня вучобы адпрацаваць два гады па разьмеркаваньні, а выпускнікі прафесійна-тэхнічных вучэльняў — адзін год. У выпадку адмовы ад разьмеркаваньня малады сьпецыяліст абавязаны кампенсаваць дзяржаве кошт навучаньня. Парадак вызначэньня кошту кампенсацыі прадугледжваецца ў Пастанове Савету Міністраў ад 23 верасьня 2006 году. Падобныя нормы замацоўваюць у Беларусі прымусовую працу, парушаюць права на адукацыю і права на свабоднае перамяшчэньне і выбар месца жыхарства.

20 сьнежня 2006 году быў прыняты новы Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэньнях, а 31 сьнежня — рашэньне аб уступленьні яго ў сілу з 1 сакавіка 2007 году, разам з новым Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэньнях (прыняты ў 2003 годзе). Патрэба ў радыкальным рэфармаваньні заканадаўства аб адміністрацыйных правапарушэньнях сасьпела ў Беларусі даўно. Ранейшы Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэньнях быў прыняты ў 1984 годзе і зьяўляўся найстарэйшым у беларускім заканадаўстве, не адпавядаў нормам сучаснага жыцьця і меў шмат прабелаў, асабліва ў сферы працэсуальнага рэгуляваньня прыцягненьня да адміністрацыйнай адказнасьці.



Новае адміністрацыйнае заканадаўства наблізілася па сваім зьмесьце да крымінальнага; за некаторыя правапарушэньні штра-

фы павялічыліся ў некалькі разоў і перавышаюць штрафы, што могуць накладацца ў межах крымінальнага працэсу. Пазітыўным асьпектам рэфармаваньня зьяўляецца больш дэтальная рэгуляцыя працэдуры прыцягненьня да адміністрацыйнай адказнасьці і замацаваньне прававога статусу ўдзельнікаў адміністрацыйнага працэсу. Напрыклад, гарантаванае права на абарону з боку адваката з моманту адміністрацыйнага затрыманьня.

Фізічныя асобы атрымалі права на касацыю судовага рашэньня, што раней не прадугледжвалася законам. Аднак пры гэтым судовыя рашэньні аб арышце, якія не ўступілі ў сілу, павінны выконвацца, нягледзячы на іх магчымую адмену ў парадку касацыйнага перагляду. Такім чынам, увядзеньне касацыйнага абскарджаньня па найбольш жорсткіх відах адміністрацыйнага спагнаньня (найбольш распаўсюджаныя як сродак палітычных рэпрэсіяў) фактычна зьяўляецца фармальнасьцю.

Новы КаАП прадугледжвае новы від адміністрацыйнага спагнаньня ў дачыненьні да замежных грамадзянаў і асобаў без грамадзянства за ўчыненьне шэрагу адміністрацыйных правапарушэньняў — дэпартацыя (дагэтуль дадзеная працэдура рэглhistoric рэгламентавалася Законам «Аб іміграцыі»).

Максімальны адміністрацыйны арышт па-ранейшаму абмяжоўваецца 15 суткамі, але ў выпадках, калі на затрыманага складзеныя два і болей пратаколы, суд можа павялічыць тэрмін да 25 сутак. Ня выключана, што дадзеная норма будзе выкарыстоўвацца ў адносінах да ўдзельнікаў несанкцыянаваных сходаў, паколькі тыя вельмі часта беспадстаўна абвінавачваюцца ў непадпарадкаваньні законным патрабаваньням міліцыі ў дадатак да артыкулу аб парушэньні парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў. Новы Адміністрацыйны кодэкс прадугледжвае адказнасьць з 14-гадовага ўзросту за псаваньне маёмасьці і нецэнзурную лаянку, у чым звычайна абвінавачваюць моладзевых актывістаў за графіці і іншыя праявы грамадзкай і палітычнай актыўнасьці.

## 2. Сьмяротнае пакараньне – парушэньне права на жыцьцё

Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе, дзе выносяцца і прыводзяцца ў выкананьне сьмяротныя прысуды.

Артыкул 24 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гарантуе кожнаму права на жыцьцё. Згодна з гэтым артыкулам, сьмяротнае

пакараньне да яго адмены можа прымяняцца ў адпаведнасьці з законам як выключная мера за асабліва цяжкія злачынствы і толькі па рашэньні суда. Пры гэтым Канстытуцыя ўказвае на выключны і часовы характар гэтага віду пакараньня. Артыкул 59 Крымінальнага кодэксу прадугледжвае прымяненьне сьмяротнага пакараньня за асабліва цяжкія злачынствы супраць міру і бясьпекі, а таксама за ваенныя злачынствы па 14-ці артыкулах. Пры гэтым да апошняга часу ў палажэньнях Кодэксу ня быў замацаваны часовы характар сьмяротнага пакараньня, і толькі згодна з Законам Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2006 году, былі ўнесеныя адпаведныя дапаўненьні.

Асуджаны на сьмерць мае права абскардзіць прысуд у Вярхоўным судзе, а апошняй ягонай надзеяй зьяўляецца Камісія па памілаваньнях, якая дзейнічае пры прэзідэнце Беларусі. Любое з рашэньняў гэтай Камісіі падпісвае асабіста прэзідэнт.

Усяго ў 2006 годзе ў Беларусі прысуды да сьмяротнага пакараньня былі вынесеныя ў дачыненьні да 9 чалавек (у тым ліку за першае паўгодзьдзе – 5 прысудаў). Гэта значна больш, чым у папярэднія гады (у 2002 годзе да гэтай меры былі асуджаныя 4 чалавекі, у 2003 – 4 чалавекі, у 2004 – 2 чалавекі, у 2005 годзе – 2 чалавекі), але менш узроўню 1990-х гадоў, калі да сьмяротнага пакараньня штогод асуджалася больш за 10 чалавек. Старшыня Вярхоўнага суда Беларусі Валянцін Сукала паведаміў што павелічэньне колькасьці сьмяротных прысудаў выклікана ростам серыйных забойстваў, калі пазбаўляюцца жыцьця два, тры, чатыры чалавекі: “Вядома, у гэтым выпадку і грамадства, і суды трапляюць у вельмі складаную сітуацыю, бо тут пажыцьцёвае зьняволеньне таксама зьяўлялася б несуразьмерным зробленаму”. Дадзеныя пра колькасьць выкананых сьмяротных прысудаў не публікаваліся ў 2006 годзе. Аднак, паводле зьвестак Радыё Палонія, беларускія ўлады перадалі Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтву ў Эўропе інфармацыю, што ў другой палове 2005 і першай палове 2006 году было выканана 5 сьмяротных прысудаў.

Адначасова грамадзтву навязваецца небясьпечнае меркаваньне пра неабходнасьць пашырэньня сьпісу злачынстваў, за якія магчымае вынясеньне сьмяротных прысудаў. Так, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктар Кучынскі падчас пасяджаньня парламенту 11 сьнежня выказаў думку пра магчымасьць увядзеньня сьмяротнага пакараньня ў адносінах да замежных

грамадзянаў, якія распаўсюджваюць наркотыкі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Выклікаюць занепакоенасьць і іншыя тэндэнцыі, зьвязаныя з прымяненьнем сьмяротнага пакараньня ў Беларусі. Так, судовы працэс над гэтак званай "бандай Марозава", у выніку якога 1 сьнежня былі асуджаныя да вышэйшай меры пакараньня 3 чалавекі, адбываўся ў закрытым парадку не ў судзе па месцы ўчыненьня злачынстваў (Гомель), а ў сьледчым ізалятары ў Менску, дзе прыводзяцца ў выкананьне сьмяротныя прысуды. Нягледзячы на тое, што пракуратура тлумачыла правядзеньне суда ў ізалятары вялікай колькасьцю абвінавачваемых, а закрытасьць працэсу – пытаньнямі бясьпекі, гэтая практыка выклікае вялікія нараканьні з боку праваабаронцаў.

Асабліва непакоіць магчымасьць выкарыстаньня сьмяротнага пакараньня супраць палітычных і грамадзкіх актывістаў у мэтах запалохваньня і шантажу. Найбольш яскравым прыкладам зьяўляецца сітуацыя, якая склалася напярэдадні выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Так, на прэс-канферэнцыі 16 сакавіка старшыня КДБ Сьцяпан Сухарэнка заявіў, што ўсіх незадаволеных вынікамі выбараў, якія выйдуць на вуліцы Беларусі і паспрабуюць дэстабілізаваць абстаноўку, будуць судзіць як тэрарыстаў. С. Сухарэнка таксама заявіў, што КДБ узнаўляе крымінальныя справы па артыкуле "пагроза ўчыненьня тэрарыстычнага акту", і ўсе датычныя да гэтых злачынстваў, незалежна ад пасады, будуць затрыманыя і прыцягнутыя да адказнасьці. Згодна з арт. 359 Крымінальнага кодэксу, за падобныя злачынствы прадугледжваецца сярод іншых і сьмяротнае пакараньне.

Яшчэ адзін яскравы прыклад ціску па палітычных матывах, у тым ліку – пагрозай прымяненьня сьмяротнага пакараньня, зьвязаны са справай моладзевага актывіста з Жодзіна Паўла Красоўскага. Так, П. Красоўскі быў затрыманы па падазрэньні ў арганізацыі выбухаў у Віцебску ў верасьні 2005 году, а затым да гэтых абвінавачаньняў былі далучаныя падазрэньні ў забойствах і згвалтаваньнях двух чалавек, за што прадугледжанае сьмяротнае пакараньне. Падазрэньні з моладзевага актывіста з цягам часу былі зьнятыя, але гэты выпадак прадэманстраваў, што калі інстытут сьмяротнага пакараньня легальна існуе ў дзяржаве, то няма ніякай гарантыі, што ён ня будзе выкарыстоўвацца і надалей на практыцы ў падобных сітуацыях дзеля запалохваньня палітычных апанентаў рэжыму.

Пастаянную заклапочанасьць наяўнасьцю ў Беларусі сьмяротнага пакараньня выказваюць міждзяржаўныя і міжнародныя аргані-

зацыі. 27 верасьня Савет па правах чалавека ААН ухваліў даклад Сьпецыяльнага дакладчыка ААН па Беларусі Адрыяна Севярына, у якім гаворыцца: “Рабочая група па адвольных затрыманьнях зьвяртае ўвагу на відавочны дысбаланс паўнамоцтваў пракуратуры і правоў абароны, што зьяўляецца парушэньнем міжнародных нормаў. Такое становішча выклікае вялікую занепакоенасьць, паколькі Беларусь засталася апошняй краінай Еўропы, дзе прымяняецца сьмяротнае пакараньне. У межах сістэмы, пры якой абвінавачваемыя пазбаўленыя права на абарону, вышэй верагоднасьць судовых памылак”.

Нараканьні з боку беларускай і міжнароднай грамадзкасьці выклікае ня толькі наяўнасьць вышэйшай меры пакараньня ў Рэспубліцы Беларусь, але і працэдура выкананьня: таемнасьць і закрытасьць прывядзеньня прысуду ў выкананьне, а таксама далейшыя дзеяньні, зьвязаныя з пахаваньнем асуджанага. Міжнародныя праваабарончыя арганізацыі выкананьне сьмяротнага пакараньня ў Беларусі прыроўніваюць да катаваньня, у тым ліку крытыкуюць негуманныя ўмовы ўтрыманьня асуджаных да сьмяротнага пакараньня ў Беларусі (напрыклад, пазбаўленьне прагулак на вольным паветры, кругласуткавае электрычнае асьвятленьне ў камерах), а таксама ўсю сістэму прывядзеньня ў выкананьне сьмяротных прысудаў.

23 траўня быў апублікаваны штогадовы даклад міжнароднай праваабарончай арганізацыі “Amnesty Inernational”, дзе таксама з трывогай адзначана, што Беларусь — адзіная краіна ў Еўропе, дзе не скасаванае сьмяротнае пакараньне.

## 3. Адстойваньне права на праўдзівую інфармацыю пра зьніклых

За 2006 год у справах аб выкраданьнях вядомых грамадзкіх і палітычных дзеячоў Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, бізнэсмена Анатоля Красоўскага і журналіста Дзьмітрыя Завадзкага не адбылося ніякіх зрухаў. Нагадаем, былы міністр унутраных справаў Юры Захаранка зьнік 7 траўня 1999 году, віцэ-сьпікер Вярхоўнага Савету 13-га скліканьня Віктар Ганчар разам з бізнэсоўцам Анатолем Красоўскім зьніклі 16 верасьня 1999 году, аператар ОРТ Дзьмітрый Завадзкі быў выкрадзены 7 ліпеня 2000 году.



Афіцыйнае сьледзтва па справах аб зьнікненьнях Юрыя За-

харанкі, Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага працягваецца. Сьледчую групу па гэтых справах узначальвае сьледчы Менскай гарадзкой пракуратуры Сяргей Кухаронак, аднак ніякай інфармацыі адносна ходу і вынікаў сьледзтва не паведамляецца ні родным зьніклых, ні грамадзкасьці. Адзінае, што ведаюць родныя – тое, што расьсьледаваньне працягваецца, кожныя тры месяцы з пракуратуры дасылаюцца ім адпаведныя лісты.

Расьсьледаваньне справы аб выкраданьні Дзьмітрыя Завадзкага прыпыненае. Маці журналіста Вольга Рыгораўна Завадзкая 3 траўня атрымала ліст за подпісам намесьніка начальніка аддзелу па расьсьледваньні справаў карупцыі пракуратуры Рэспублікі Беларусь, малодшага саветніка юстыцыі Івана Бранчэля, у якім паведамляецца, што “крымінальная справа, узбуджаная па факце зьнікненьня Дзьмітрыя Завадзкага, прыпыненая 31 сакавіка 2006 г. па п. 6 ч.1 арт. 246 УПК РБ у сувязі з невыяўленьнем бясьсьледна зьніклай асобы”. У той жа час 30 траўня на прэс-канферэнцыі ў Менску Генеральны пракурор Пётр Міклашэвіч заявіў, што падначаленае яму ведамства працягвае пошукі Дзьмітрыя Завадзкага: “На гэты момант месцазнаходжаньне Дзьмітрыя Завадзкага не ўстаноўлена, але пракуратура Беларусі працягвае яго пошук. І раней праводзіліся праверкі шэрагу эпізодаў па дадзенай справе, яны праводзяцца і цяпер. Месцазнаходжаньне Дзьмітрыя Завадзкага высьветліць не ўдалося”. Пры гэтым Генеральным пракурорам замоўчваецца пытаньне пра магчымае забойства журналіста, а тым самым – пра прыцягненьне да адказнасьці вінаватых у гэтым злачынстве. Нагадаем, што 14 сакавіка 2002 г. Менскі абласны суд прызнаў вінаватай у выкраданьні Дз. Завадзкага групу былога супрацоўніка сьпецпадразьдзяленьня “Алмаз” Валерыя Ігнатовіча, асудзіўшы двух чалавек (В. Ігнатовіча і М. Маліка) на пажыцьцёвае зьняволеньне, а яшчэ некалькіх — на розныя тэрміны пазбаўленьня волі, а 27 лістапада 2003 г. суд Фрунзенскага раёну г. Менску прыняў рашэньне аб прызнаньні зьніклага журналіста памерлым. Справа па выкраданьні Дзьмітрыя Завадзкага ўжо прыпынялася ў сакавіку 2004 году, а ў 2005 годзе расьсьледаваньне было ўзноўленае.

У той час, калі афіцыйныя ўлады Беларусі фактычна спынілі расьсьледаваньні справаў, толькі фармальна працягваючы сьледзтва, беларуская і міжнародная грамадзкасьць не пакідалі гэтую праблему без увагі. Кожны месяц 16-га чысла (16 верасьня былі выкрадзеныя В. Ганчар і А. Красоўскі) па ўсёй краіне адбываліся акцыі салідарнасьці з сем’ямі зьніклых і палітзьняволенымі, няг-

ледзячы на нервовую рэакцыю праваахоўных органаў, гвалтоўныя разгоны і затрыманьні ўдзельнікаў. Акцыі памяці праходзілі па ўсёй Беларусі і ў гадавіны выкраданьняў Юрыя Захаранкі і Дзьмітрыя Завадзкага. Да беларускага Дня салідарнасьці ўсё часьцей далучаліся неабыякавыя людзі з розных краінаў.

Найбольш масавай у 2006 годзе была акцыя салідарнасьці 16 верасьня ў Менску, у якой прынялі ўдзел некалькі тысячаў чалавек. Заяўку на правядзеньне мерапрыемства менскія гарадзкія ўлады задаволілі – далі дазвол на правядзеньне яго на плошчы Бангалор. Напярэдадні супрацоўнікі міліцыі зрабілі адпаведныя захады, каб паменшыць колькасьць удзельнікаў акцыі – у Менску, Віцебску, Жодзіне, Маладэчна, Салігорску і іншых гарадах выклікалі ў пракуратуру і міліцыю моладзевых актывістаў і папярэджвалі, каб тыя адмовіліся ад удзелу ў Дні салідарнасьці. Нягледзячы на тое, што акцыя была дазволеная, былі затрыманыя некалькі чалавек.

Беларускія ўлады асабліва імкнуліся кантраляваць распаўсюд незалежнай інфармацыі пра палітычныя выкраданьні ў Беларусі, а таксама пра зьвязаныя з гэтымі справамі грамадзкія акцыі – распаўсюднікі затрымліваліся, ім выносіліся адміністрацыйныя спагнаньні. 22 жніўня на мяжы падчас дагляду асабістага багажу ў афіцыйнага прадстаўніка сям’і Юрыя Захаранкі Алега Волчака былі канфіскаваныя кнігі, у тым ліку – пра абставіны выкраданьня былога міністра ўнутраных справаў. Быў складзены пратакол адміністрацыйнага правапарушэньня па артыкуле 193-5 КаАП РБ (невыкананьне парадку ўжываньня мераў эканамічнай палітыкі і іншых абмежаваньняў падчас перавозу тавараў праз мяжу), і ў кастрычніку праваабаронца быў завочна аштрафаваны на 50 базавых велічыняў. У сітуацыі замоўчваньня праблемы зьнікненьня палітычных апанентаў дзяржаўнымі беларускімі СМІ і цяжкіх умовах існаваньня незалежных медыяў, станоўчай падзеяй стала зьяўленьне афіцыйнага сайту Грамадзянскай ініцыятывы “Мы памятаем” (www.ciwr.org – у назьве выкарыстаная абрэвіятура міжнароднай назвы арганізацыі Civil Initiative We Remember). Гэты рэсурс быў створаны ў лютым з мэтай інфармаваньня грамадзкасьці пра становішча са справамі выкрадзеных.

Патрабаваньні міжнароднай і беларускай грамадзкасьці аб правядзеньні аб’ектыўнага, бесстароньняга расьсьледаваньня выкраданьняў вядомых у Беларусі людзей афіцыйнымі ўладамі ігнараваліся. Адным з патрабаваньняў зьяўляецца адхіленьне ад пасадаў на час сьледзтва беларускіх высокапастаўленых асобаў,

якія падазраюцца ў магчымай датычнасьці да арганізацыі і ўчыненьня выкраданьняў. Згодна з меркаваньнем сьпецдакладчыка Камітэту Парламенцкай Асамблеі Савету Еўропы па юрыдычных пытаньнях і правах чалавека Хрыстаса Пургурыдэса, да гвалтоўных выкраданьняў у Беларусі могуць быць датычныя цяперашні дзяржсакратар Савету Бясьпекі Віктар Шэйман, міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў, былы міністр унутраных справаў Юрый Сівакоў і камандзір сьпецыяльнага аддзелу хуткага рэагаваньня палкоўнік Дзьмітрый Паўлічэнка. Пазіцыя ПАСЕ была адлюстраваная ў адпаведнай Рэзалюцыі, прынятай 27 студзеня, дзе таксама нагадвалася, што дадзенае патрабаваньне ўтрымлівалася ў папярэдняй Рэзалюцыі ПАСЕ, аднак беларускія ўлады яго ня выканалі.

Гэты асьпект таксама падкрэсьліў 27 верасьня ў сваім дакладзе сьпецыяльны дакладчык ААН па пытаньні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі Адрыян Севярын: “Аб персаналізацыі і селектыўнасьці сістэмы адпраўленьня правасудзьдзя ў Беларусі сьведчыць тое, што ўрад да гэтага часу адмаўляецца праліць сьвятло на факт датычнасьці вышэйшых службовых асобаў да зьнікненьняў Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзьмітрыя Завадзкага”. Адрыян Севярын таксама заклікаў Савет па правах чалавека ААН зьвярнуцца да Упраўленьня Вярхоўнага камісара з просьбай аб неадкладным стварэньні групы эксьпертаў-юрыстаў дзеля расьсьледаваньня датычнасьці вышэйшых службоўцаў ураду Беларусі да зьнікненьняў і верагодных забойстваў палітыкаў і журналіста, а таксама падрыхтоўкі канкрэтных прапановаў адносна магчымасьці іх перасьледу.

Настойлівы заклік да ўраду Беларусі “адхіліць ад пасадаў афіцыйных асобаў, якія, як сьцьвярджаецца, датычныя да справаў аб гвалтоўных зьнікненьнях, адвольных сьмяротных пакараньнях (…) на перыяд сьледзтва па такіх справах і забясьпечыць прыняцьце ўсіх неабходных мераў дзеля ўсебаковага і бесстароньняга расьсьледаваньня такіх справаў, прыцягнуць асобаў, якім інкрымінуюцца гэтыя злачынствы, да адказнасьці ў незалежным судзе і, у выпадку прызнаньня іх вінаватымі, забясьпечыць, каб яны былі пакараныя згодна з міжнароднымі абавязацельствамі Беларусі ў галіне правоў чалавека” ўтрымліваецца ў Рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН па Беларусі, прынятай 19 сьнежня 2006 году.

У пасланьні Еўрапейскага Саюзу народу Беларусі ад 22 кастрычніка таксама закранутая праблема неналежнага расьсьледаваньня беларускімі ўладамі фактаў выкраданьня палітычных апанентаў:

“Для пабудовы глыбейшых дачыненьняў, якія мы б жадалі мець паміж ЕС і народам Беларусі, для спыненьня палітыкі самаізаляцыі, якую беларускі ўрад навязаў сваім грамадзянам, мы гаворым, што беларускім уладам трэба, па-першае, і галоўным чынам: належным чынам і незалежна дасьледаваць або перагледзець выпадкі зьнікненьня людзей (…)”.

Заявіў пра свой намер “дамагацца поўнага незалежнага расьсьледаваньня зьнікненьня Віктара Ганчара і настойваць на неабходнасьці маніторынгу сітуацыі беларускім парламентам” Міжпарламенцкі саюз падчас 114-й асамблеі 9 траўня. Нагадаем, што на папярэдняй асамблеі ў Жэневе прадстаўнік беларускай дэлегацыі Анатоль Салаўёў заверыў парламентароў, што беларускія дэпутаты трымаюць справу В.Ганчара на пастаянным кантролі. Гэтыя заявы зьняпраўдзіла жонка зьніклага палітыка Зінаіда Ганчар і накіравала адмысловы ліст старшыні МПС, у выніку чаго беларускія парламентары былі вымушаныя прызнацца ў сваёй бязьдзейнасьці датычна кантролю над расьсьледаваньнем зьнікненьня іх калегі.

27 лютага ў Вашынгтоне падчас сустрэчы прэзідэнта Злучаных Штатаў Амерыкі са Сьвятланай Завадзкай і Ірынай Красоўскай Джордж Буш падкрэсьліў сваю асабістую падтрымку высілкам жанчын дамагчыся правасудзьдзя ў справах выкраданьня іх родных.

Важным крокам на шляху ўмацаваньня сістэмы міжнароднага права стала адзінагалоснае прыняцьце 20 сьнежня Генеральнай Асамблеяй ААН Міжнароднай Канвенцыі для абароны ўсіх асобаў ад гвалтоўных зьнікненьняў. 6 лютага 2007 году на сьпецыяльнай цырымоніі ў Парыжы Канвенцыя павінна быць адкрытая для падпісаньня краінамі-ўдзельніцамі ААН і ўступіць у сілу на трыццаты дзень пасьля здаваньня на захоўваньне Генеральнаму сакратару ААН 20-й ратыфікацыйнай граматы або дакументу аб далучэньні. Канвенцыя загадвае дзяржавам прымаць эфектыўныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, судовыя і іншыя меры для прадухіленьня і спыненьня актаў гвалтоўнага зьнікненьня. Яна забараняе існаваньне сакрэтных турмаў і абавязвае паведамляць сем’ям аб лёсе іх затрыманых сваякоў. Дакумент прадугледжвае стварэньне адмысловага Камітэту па гвалтоўных зьнікненьнях, які разглядае даклады краінаў-удзельніцаў і скаргі прыватных асобаў. Дзяржавы, якія ратыфікуюць Канвенцыю, павінныя даваць справаздачу перад Камітэтам, як яны яе выконваюць. У дакуменце падкрэсьліваецца, што пры некаторых абставінах гвалтоўныя зьнікненьні могуць прызнавацца злачынствам супраць чалавечнасьці. У гэтай якасьці яны трапляюць і пад міжнародную крымінальную юрысдыкцыю.

У сёньняшняй сітуацыі, калі ў арганізацыі і ўчыненьні палітычных выкраданьняў у Беларусі падазраюцца самі ўлады, цяжка чакаць падпісаньня і ратыфікацыі Канвенцыі нашай краінай. Разам з тым, беларускія праваабаронцы, родныя зьніклых, грамадзкасьць гатовыя дамагацца таго, каб важны міжнародны інструмент паспрыяў раскрыцьцю гэтых злачынстваў.

## 4. Крымінальны перасьлед па палітычных матывах

Для Беларусі 2006 год характарызаваўся рэзкім павелічэньнем колькасьці палітычна матываваных крымінальных справаў і падазраваных па іх асобаў, а таксама колькасьці палітзьняволеных.

У месцах пазбаўленьня волі працягвалі знаходзіцца палітык Мікалай Статкевіч, моладзевы лідэр Павел Севярынец, асуджаныя ў 2005 годзе да двух гадоў абмежаваньня волі паводле арт. 342 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя ці ўдзел у групавых дзеяньнях, якія парушаюць грамадзкі парадак) за арганізацыю акцыяў пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў парламенцкіх выбараў і рэспубліканскага рэферэндуму 2004 году. 25 жніўня П. Севярынцу было адмоўлена ва ўмоўна-датэрміновым вызваленьні ў сувязі з тым, што зьняволены “ня стаў на шлях выпраўленьня”. 26 верасьня Мікалаю Статкевічу было адмоўлена ва ўмоўна-датэрміновым вызваленьні на тых жа падставах.

Разам з тым, на працягу году з беларускіх турмаў былі вызваленыя чатыры палітзьняволеныя, асуджаныя ў папярэднія гады.

14 красавіка па рашэньні суда аб умоўна-датэрміновым вызваленьні з аршанскай калоніі быў вызвалены экс-міністр зьнешнеэканамічных сувязяў, Надзвычайны і Паўнамоцны Амбасадар Рэспублікі Беларусь Міхаіл Марыніч, які правёў у зьняволеньні два гады. М.Марыніч быў асуджаны 30 сьнежня 2004 г. на пяць гадоў пазбаўленьня волі з канфіскацыяй маёмасьці паводле ч. 4 арт. 210 Крымінальнага кодэксу па абвінавачаньні ў прысваеньні кампутараў, якія належалі амбасадзе ЗША. Пазьней тэрмін зьняволеньня М. Марыніча быў скарочаны да трох з паловай гадоў і ўжытая амністыя.

15 траўня з калоніі “Воўчыя норы” Івацэвіцкага раёну быў вызвалены лідэр прадпрымальніцкага руху з Гародні Валеры Леванеўскі, асуджаны 7 верасьня 2004 году да двух гадоў пазбаўленьня волі па

ч. 2 арт. 368 Крымінальнага кодэксу (абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). В. Леванеўскі цалкам адбыў увесь тэрмін пакараньня.

15 лістапада пасьля адбыцьця году і шасьці месяцаў пакараньня з калоніі "Віцьба" Віцебскай вобласьці выйшаў на волю эксдэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Сяргей Скрабец. Палітык з траўня 2005 году знаходзіўся пад вартай; 14 лютага 2006 – быў асуджаны на два з паловай гады пазбаўленьня волі паводле ч. 1 арт. 13 (падрыхтоўка да злачынства) і ч. 2 арт. 431 КК РБ (дача хабару), а таксама па абвінавачаньні ў выманьваньні крэдытаў і незаконнай прапрымальніцкай дзейнасьці. У кастрычніку Сяргей Скрабец быў амніставаны, і тэрмін яго пакараньня скараціўся на адзін год.

22 сьнежня ў сувязі з адбыцьцём пакараньня (год і шэсьць месяцаў абмежаваньня волі) са сьпецкамендатуры ў вёсцы Баршчоўка Рэчыцкага раёну быў вызвалены палітзьняволены Андрэй Клімаў. Палітык быў асуджаны 10 чэрвеня 2005 году па арт. 342 Крымінальнага кодэксу за арганізацыю мірнай дэманстрацыі ў Менску 25 сакавіка таго ж году.

Крымінальныя справы па палітычных матывах вяліся супраць 41 грамадзка-палітычнага актывіста, 21 з якіх быў асуджаны да розных відаў пакараньня ад штрафаў да арыштаў, абмежаваньня і пазбаўленьня волі. Адносна 12 чалавек справы былі спыненыя на этапе папярэдняга сьледзтва ў сувязі з адсутнасьцю ў іх дзеяньнях складу крымінальнага злачынства. Да канца 2006 году працягваліся сьледчыя дзеяньні, а таксама не былі вынесеныя рашэньні па крымінальных справах у адносінах да 9 актывістаў дэмакратычнага руху.

Своеасаблівы рэкорд крымінальнага перасьледу па палітычных матывах у вялікай ступені быў зьвязаны з правядзеньнем кампаніі па выбарах прэзідэнта Беларусі, і – як сьледзтва – ростам палітычнай і грамадзкай актыўнасьці грамадзянаў.

Выбары былі абвешчаныя паводле Пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад 16 сьнежня 2005 году, а напярэдадні, 15 сьнежня, Палата прадстаўнікоў амаль адзінагалосна прыняла Закон Рэспублікі Беларусь "Аб унясеньні дадаткаў і зьменаў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаньнях узмацненьня адказнасьці за дзеяньні, скіраваныя супраць чалавека і грамадзкай бясьпекі". Гэтыя папраўкі ў Крымінальны кодэкс сталі прававой асновай для разгортаваньня маштабнай кампаніі палітычных рэпрэсіяў супраць апанентаў дзеючага рэжыму. Названыя зьмены ўступілі ў дзеяньне з 1 студзеня

2006 году, і ўжо праз месяц была распачатая першая крымінальная справа па адным з новых артыкулаў.

Улады таксама актыўна выкарыстоўвалі і іншыя артыкулы Крымінальнага кодэксу ў палітычных мэтах, асабліва ў дачыненьні да актывістаў моладзевых рухаў. Вельмі часта напісаньне палітычных графіці на будынках кваліфікавалася як хуліганства ці злоснае хуліганства. Пры гэтым улады, па-першае, атрымлівалі магчымасьць кваліфікаваць дзеяньні апазіцыйных актывістаў па больш жорсткіх артыкулах Крымінальнага кодэксу і ўтрымліваць абвінавачаных пад вартай да суда, а па-другое, прадставіць іх у вачах грамадзкасьці не палітычнымі вязьнямі, а дробнымі крымінальнікамі, якія ня маюць нічога агульнага з палітычнай дзейнасьцю.

Атрымала свой далейшы працяг практыка выкарыстаньня артыкулаў Крымінальнага кодэксу, якія прадугледжваюць адказнасьць за абразу і паклёп у адносінах да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і іншых службовых асобаў краіны. Нават карыкатуры і сатырычныя мультфільмы пра кіраўніка краіны і іншых службовых асобаў у шэрагу выпадкаў кваліфікаваліся як абраза.

Улады неаднаразова ўжывалі разнастайныя правакацыі ў мэтах далейшага крымінальнага перасьледу па палітычных матывах. Яскравымі прыкладамі зьяўляюцца справы, узбуджаныя нібыта за распаўсюд наркотыкаў, фальшывых грошай, спробы абвінаваціць моладзевых актывістаў у датычнасьці да арганізацыі тэрарыстычных актаў, выбухаў, серыйных забойстваў і згвалтаваньняў. Паказальнай у гэтым сэнсе зьяўлялася справа актывістаў незарэгістраванай грамадзянскай ініцыятывы “Партнёрства”, якія публічна, праз дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, былі абвінавачаныя ў арганізацыі тэрарыстычных актаў і іншых мерапрыемстваў, скіраваных на дэстабілізацыю абстаноўкі ў краіне падчас выбараў прэзідэнта. Аднак гэтыя абвінавачаньні нават не разглядаліся ні падчас папярэдняга сьледзтва, ні падчас судовага разгляду справы.

### *1. Крымінальная справа супраць Аляксандра Казакова і Зьміцера Зубро.*

Актывісты руху “Зубр” Аляксандр Казакоў і Зьміцер Зубро былі затрыманыя ў ноч на 28 сьнежня 2005 году за палітычныя графіці (напісаньне лічбы “16”, якая заклікае да ўдзелу ў Дні салідарнасьці з палітзьняволенымі). Маладыя людзі правялі больш за двое сутак у ізалятары часовага ўтрыманьня і былі адпушчаныя пад падпіску аб нявыезьдзе. Ім было прад’яўленае абвінавачаньне па ч. 2 арт.

363 Крымінальнага кодэксу (аказаньне супраціўленьня супрацоўніку міліцыі). 7 красавіка судзьдзя суда Цэнтральнага раёну г. Менску Валеры Есьман асудзіў Аляксандра Казакова і Зьміцера Зубро да 2 гадоў абмежаваньня волі. Моладзевыя актывісты зьехалі за межы Рэспублікі Беларусь.

***2. Крымінальныя справы супраць Паўла Красоўскага.***

На пачатку 2006 году ў г. Жодзіна была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 369 Крымінальнага кодэксу (публічная абраза службовых асобаў) у адносінах да актывіста моладзевага дэмакратычнага руху Паўла Красоўскага за публікацыю ў бюлетэні “Назіральнік” сатырычных карыкатураў на кіраўніцтва гораду. Карыкатуры былі знойдзеныя падчас вобыску ў кватэры Паўла Красоўскага ў сьнежні 2005 г. Дадзеная справа была спыненая, аднак у далейшым супраць моладзевага актывіста былі вылучаныя новыя крымінальныя абвінавачаньні.

4 кастрычніка ў кватэры Паўла Красоўскага зноў адбыўсяператрус, падчас якога быў канфіскаваны кампутарны блок, дыскі і друкаваная прадукцыя. Затым Красоўскага на міліцэйскай машыне даставілі ў Віцебск, дзе дапытвалі па справе аб выбухах у Віцебску 14 і 22 верасьня 2005 году. Сьледчыя заявілі, што моладзевы актывіст падобны на фотаробат злачынцы. У выніку ён быў прызнаны падазраваным у падрыхтоўцы злачынства, скіраванага на забойства асабліва небясьпечным спосабам у адпаведнасьці з артыкулам 139 ч.2 Крымінальнага кодэксу. У гэты ж дзень Красоўскага накіравалі ў ізалятар часовага ўтрыманьня г. Віцебску. 11 кастрычніка галоўны сьледчы Рэспубліканскай пракуратуры па асабліва важных справах Аляксандр Расолька дадаткова вынес пастанову аб прызнаньні Паўла Красоўскага падазраваным ва ўчыненьні шэрагу згвалтаваньняў і забойстваў няпоўнагадовых дзяўчынак у розных гарадах Беларусі ў 1999 годзе. Паколькі 15 кастрычніка скончыўся тэрмін утрыманьня Красоўскага пад вартай без прад’яўленьня абвінавачаньня, а доказаў, якія б сьведчылі пра ягоную датычнасьць да названых злачынстваў не было выяўлена, малады чалавек быў выпушчаны з ізалятару часовага ўтрыманьня. Пазьней крымінальная справа адносна датычнасьці Красоўскага да забойстваў і згвалтаваньняў непаўнагадовых дзяўчат была спыненая, а па справе, узбуджанай у сувязі з выбухамі ў Віцебску, ён працягвае праходзіць у якасьці падазраванага, аднак актыўных сьледчых мерапрыемстваў у дачыненьні да яго не праводзіцца.

### *3. Крымінальная справа супраць Зьмітра Касьяровіча.*

Крымінальная справа супраць актывіста Партыі БНФ Зьмітра Касьпяровіча, затрыманага ў ноч з 17 на 18 студзеня, была ўзбуджаная па падазрэньні ў зьнявазе дзяржаўных сімвалаў. З.Касьпяровіч спрабаваў зьняць афіцыйны сьцяг з будынку Менгарвыканкаму, бо лічыць яго сталінскім. Па арт. 370 Крымінальнага кодэксу “Зьнявага дзяржаўных сімвалаў” не прадугледжваецца пазбаўленьне волі (максімальнае пакараньне — 1 год абмежаваньня волі), а таксама ўтрыманьне пад вартай да суда. Аднак абвінавачаньне З. Касьпяровічу было прад’яўленае па ч. 1 арт. 339 КК (хуліганства), і пакараньне, прадугледжанае па гэтым артыкуле — 3 гады пазбаўленьня волі. Мерай стрыманьня пракуратура абрала ўтрыманьне пад вартай, да суда Зьміцер Касьпяровіч знаходзіўся ў СІЗА г. Менску.

Затрыманыя ў межах гэтай справы Павел Батуеў і Зьміцер Гаўрусік пасьля праведзеных сьледчых дзеяньняў (допыты, вобыскі) былі адпушчаныя на свабоду без прад’яўленьня абвінавачаньня, справа супраць іх была спыненая.

27 лютага суд Маскоўскага раёну Менску вынес рашэньне па справе Зьмітра Касьпяровіча — арышт тэрмінам на пяць месяцаў. Актывіст не пагадзіўся з абвінавачаньнем і заявіў, што гатовы адказваць за зьнявагу дзяржаўнага сьцягу, але не за хуліганства. Прысуд быў абскарджаны адвакатам у касацыйным парадку ў судовай калегіі па крымінальных справах Менскага гарадзкога суда, аднак скарга была пакінутая без задавальненьня, а прысуд бяз зьменаў.

Пакараньне З. Касьпяровіч адбываў у турме г. Жодзіна. 28 красавіка быў вызвалены ўмоўна-датэрмінова.

### *4. Крымінальная справа супраць Артура Фінькевіча.*

Актывіст “Маладога Фронту” Артур Фінькевіч быў затрыманы ўначы 30 студзеня ў Менску за напісаньне палітычных графіці. Крымінальная справа супраць яго была ўзбуджаная па ч.2 арт. 339 КК РБ (злоснае хуліганства), і абвінавачаньне прад`яўленае менавіта па гэтым артыкуле. Сьледчыя органы наўмысна кваліфікавалі напісаньне палітычных графіці як злоснае хуліганства, паколькі гэтая кваліфікацыя дазваляе пазбаўляць моладзевых актывістаў волі і зьмяшчаць у СІЗА; адказнасьць па дадзеным артыкуле прадугледжаная да 6 гадоў пазбаўленьня волі.

Пазьней у справе нечакана зьявілася эксьпертыза шкоды, якую Артур Фінькевіч нібыта нанёс будынкам. Сума шкоды паводле гэтай эксьпертызы, склала 35 мільёнаў 196 тысячаў 970 рублёў. А.Фінькевічу дадаткова было прад'яўленае абвінавачаньне па ч. 3 арт. 218 КК РБ (наўмыснае прычыненьне стратаў ці псаваньне маёмасьці, якое пацягнула за сабой шкоду ў асабліва буйным памеры), за што прадугледжанае пакараньне ў выглядзе пазбаўленьня волі тэрмінам ад 7 да 12 гадоў. Аднак падчас судовага паседжаньня абвінавачаньні па дадзеным артыкуле было зьнятае, паколькі сума шкоды паменшылася да 2 мільёнаў 207 тысячаў рублёў.

10 траўня судом Першамайскага раёну Менску Артур Фінькевіч быў асуджаны па абвінавачаньні ў злосным хуліганстве да году і шасьці месяцаў абмежаваньня волі. З 29 чэрвеня моладзевы лідэр накіраваны адбываць пакараньне ў магілёўскую сьпецкамендатуру № 43.

***5. Крымінальная справа***
***супраць Уладзіміра Хоміча і Максіма Кокарава.***

2 сакавіка ў Нясьвіжы за графіці "Мы хочам новага!" і "Достал!" мясцовы РАУС узбудзіў крымінальную справу ў дачыненьні да актывістаў "Маладога Фронту" Уладзіміра Хоміча і Максіма Кокарава па арт. 341 Крымінальнага кодэксу (апаганьваньне збудаваньняў і псаваньне маёмасьці).

На этапе папярэдняга сьледзтва моладзевыя актывісты знаходзіліся пад падпіскай аб нявыезьдзе. Справа адносна Уладзіміра Хоміча і Максіма Кокарава была спыненая.

***6. Крымінальная справа***
***супраць Сяргея Ляшкевіча.***

2 сакавіка ў Шчучыне адбыліся ператрусы ў кватэрах мясцовых актывістаў Васіля Бязьмена і Сяргея Ляшкевіча. У абодвух пасьля вышуку былі забраныя кампутарныя носьбіты інфармацыі, а таксама некаторыя друкаваныя выданьні, паперы з асабістага архіву. Сяргей Ляшкевіч быў затрыманы і некалькі дзён знаходзіўся ў Шчучынскім сьледчым ізалятары. Супраць яго была заведзеная крымінальная справа па ч. 3 арт. 293 Крымінальнага кодэксу РБ (масавыя беспарадкі).

Падчас судовага працэсу паказаньні супраць С.Ляшкевіча даваў раней нікому невядомы грамадзянін, які знаходзіўся пад вартай за крадзёж маёмасьці. Паводле ягоных паказаньняў, Ляшкевіч нібыта дэманстраваў яму фільмы, у якіх паказвалася, як дэманстранты

супрацьдзейнічаюць міліцыі падчас масавых мерапрыемстваў. Сьведка адзначаў, што такім чынам актыівст рыхтаваў яго да ўдзелу ў пасьлявыбарчых дэманстрацыях (гэта былі кадры з дакументальнага фільму Ю. Хашчавацкага "Звычайны прэзідэнт"). Шчучынскі раённы суд палічыў віну Сяргея Ляшкевіча даказанай, паклаўшы ў аснову прысуду гэтыя цьмяныя і сумнеўныя доказы, і 29 траўня асудзіў 28-гадовага актывіста на 5 месяцаў пазбаўленьня волі.

27 ліпеня Сяргей Ляшкевіч быў вызвалены з Глыбоцкай турмы ў сувязі з адбыцьцём тэрміну пакараньня.

***7. Крымінальныя справы супраць Аляксандра Казуліна — кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.***

1 сакавіка супраць кандыдата ў прэзідэнты, лідэра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Аляксандра Казуліна была ўзбуджаная крымінальная справа па ч. 2 арт. 339 Крымінальнага кодэксу РБ (злоснае хуліганства) у сувязі з інцыдэнтам 17 лютага. У той дзень А. Казуліна разам з ягонымі прыхільнікамі без тлумачэньня прычынаў не пусьцілі ў будынак Нацыянальнага прэс-цэнтру, дзе была прызначаная прэс-канферэнцыя кандыдата ў прэзідэнты. Пры спробе прайсьці ў будынак, каб даведацца прычыны адмовы, супраць Казуліна была ўжытая фізічная сіла, аднак у выніку ён сам быў абвінавачаны ў "абразе і ўжываньні фізічнага гвалту адносна супрацоўнікаў аховы канцэртнай залы "Мінск" і супрацоўніка міліцыі".

Другая справа была распачатая ў сувязі з паводзінамі Аляксандра Казуліна 2 сакавіка, калі ён з групай прыхільнікаў спрабаваў зарэгістравацца ў якасьці дэлегата Усебеларускага народнага сходу, але быў затрыманы і жорстка зьбіты прадстаўнікамі сьпецслужбаў і асабіста камандзірам СОБРу палкоўнікам Д. Паўлічэнкам. Пасьля затрыманьня Аляксандр Казулін быў дастаўлены ў РУУС Кастрычніцкага раёну сталіцы, дзе разьбіў партрэт А. Лукашэнкі. Крымінальная па гэтым эпізодзе была ўзбуджаная паводле ч. 1 арт. 339 КК РБ (хуліганства).

25 сакавіка Аляксандр Казулін быў затрыманы падчас сьвяткаваньня Дня Волі, калі ён з групай дэманстрантаў накіроўваўся да Менскага сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку, каб выказаць падтрымку зьняволеным удзельнікам пасьлявыбарчых акцыяў пратэсту. Да суда А. Казулін знаходзіўся пад вартай у СІЗА г. Жодзіна.

30 сакавіка экс-кандыдату ў прэзідэнты Аляксандру Казуліну было прад'яўленае абвінавачаньне па трох эпізодах: па падзеях у Менску 17 лютага і 2 сакавіка – арт. 339 ч. 2 КК РБ (злоснае

хуліганства); па падзеях 25 сакавіка – арт. 342 КК РБ (арганізацыя групавых дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак і зьвязаныя з непадпарадкаваньнем законным патрабаваньням прадстаўнікоў улады ці якія пацягнулі парушэньне працы транспарту, прадпрыемстваў, установаў ці арганізацыяў, альбо актыўны ўдзел у такіх дзеяньнях пры адстутнасьці прыкметаў больш цяжкага злачынства).

13 ліпеня судзьдзя суда Маскоўскага раёну г. Менску Аляксей Рыбакоў прызнаў Аляксандра Казуліна вінаватым па вылучаных абвінавачаньнях і асудзіў да пяці з паловай гадоў пазбаўленьня волі ў калоніі агульнага рэжыму. 19 верасьня калегія па крымінальных справах Менскага гарадзкога суда разгледзела касацыйную скаргу палітыка і пакінула яе без задавальненьня, а прысуд суда Маскоўскага раёну г. Менску бяз зьменаў.

Аляксандр Казулін накіраваны адбываць пакараньне ў калоніі агульнага рэжыму “Віцьба-3” Віцебскай вобласьці.

### *8. Крымінальная справа супраць Цімафея Дранчука, Аляксандра Шалайкі, Міколы Астрэйкі, Эніры Браніцкай.*

22 лютага былі затрыманыя Цімафей Дранчук, Мікола Астрэйка, Эніра Браніцкая і Аляксандр Шалайка, актывісты Грамадзянскай ініцыятывы “Партнёрства”, якая праводзіла назіраньне за выбарамі прэзідэнта. Супрацоўнікі КДБ правяліператрусы ў офісах арганізацыі ў Менску і рэгіёнах, а таксама ў кватэрах актывістаў, канфіскаваўшы ўсе носьбіты інфармацыі. Фармальнай падставай для сьледчых дзеяньняў і затрыманьняў зьяўлялася нібыта датычнасьць актывістаў да распаўсюду сатырычных мультфільмаў на палітычныя тэмы, па факце чаго раней ужо была ўзбуджаная крымінальная справа.

1 сакавіка старшыня КДБ Сьцяпан Сухарэнка заявіў на прэсканфэрэнцыі, што апазіцыя запланавала шэраг правакацыяў на дзень выбараў, каардынаваць якія меліся арыштаваныя сябры арганізацыі “Партнёрства”. Паводле С.Сухарэнкі, падчас апазіцыйнага мітынгу запланаваныя некалькі выбухаў, “зьяўленьне крыві і ахвяраў разьвязвае рукі арганізатарам акцыі пратэсту, пасьля чаго пачынаецца захоп будынкаў органаў улады, вакзалаў, перагароджваюцца чыгуначныя каляіны з мэтай поўнага спыненьня функцыянаваньня краіны”. Акрамя таго, “Партнёрства” нібыта падрыхтавала фальшывыя пратаколы “экзіт-пулаў”, паводле якіх перамогу на выбарах атрымаў апазіцыйны кандыдат Аляксандр Мілінкевіч.

2 сакавіка Цімафею Дранчуку, Міколу Астрэйку, Эніры Браніцкай і Аляксандру Шалайку было прад'яўленае абвінавачаньне па ч. 2 арт. 193 Крымінальнага кодэксу РБ (арганізацыя ці кіраваньне дзейнасьцю грамадзкага аб'яднаньня, рэлігійнай арганізацыяй, якая пасягае на асобу, правы і абавязкі грамадзянаў). Усе чацьвёра актывістаў "Партнёрства" падчас сьледзтва знаходзіліся ў сьледчым ізалятары КДБ, а затым былі пераведзеныя ў СІЗА МУС у Менску.

4 жніўня падчас судовага разьбіральніцтва ў судзе Цэнтральнага раёну г. Менску абвінавачаньні па ч. 2 арт. 193 КК РБ былі зьнятыя, а прысуд судзьдзя Леанід Ясіновіч вынес па арт. 193.1 КК РБ (незаконная арганізацыя дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня, рэлігійнай арганізацыі ці фонду ці ўдзел у іх дзейнасьці): Мікола Астрэйка быў асуджаны да двух гадоў пазбаўленьня волі з адбываньнем пакараньня ў калоніі агульнага рэжыму, Цімафей Дранчук – да аднаго году пазбаўленьня волі з адбываньнем пакараньня ў калоніі агульнага рэжыму, Аляксандр Шалайка і Эніра Браніцкая – да шасьці месяцаў арышту.

Суд праходзіў у закрытым рэжыме. На яго не дапускаліся ні сваякі абвінавачаных, ні журналісты і прадстаўнікі праваабарончых арганізацыяў.

21 жніўня Эніра Браніцкая і Аляксандр Шалайка былі вызваленыя, паколькі скончыўся тэрмін іхняга арышту.

Мікола Астрэйка быў вызвалены ў лістападзе ў сувязі з заменай вынесенага пакараньня на больш мяккае – папраўчыя работы.

Цімафей Дранчук быў вызвалены 26 сьнежня ўмоўна-датэрмінова, адбыўшы 9 месяцаў у зьняволеньні.

### *9. Крымінальная справа супраць Яўгена Суворава.*

Яўген Сувораў быў затрыманы міліцыяй 14 лютага ў Магілёве за вывешваньне расьцяжкі з заклікам узяць удзел у Дні беларускай салідарнасьці. Спачатку ён быў абвінавачаны ў парушэньні арт. 156 Адміністрацыйнага кодэксу (дробнае хуліганства), аднак затрыманьне было выкарыстанае толькі як нагода для ўтрыманьня маладога чалавека пад вартай. Адміністрацыйны пратакол пры гэтым нават не разглядаўся.

Супраць Яўгена Суворава была ўзбуджаная справа па арт. 435 ч.1 Крымінальнага кодэксу (ухіленьне ад мерапрыемстваў, зьвязаных з усеагульным вайсковым абавязкам). Крымінальны перасьлед зьяўляўся толькі падставай дзеля заключэньня актыўнага маладога чалавека пад варту. Гэта пацьвярджаецца тым, што па заключэ-

ньні прызыўной камісіі Яўген Сувораў прызнаны непрыдатным да праходжаньня страявой вайсковай службы ў мірны час з-за праблемаў са зрокам. Хлопец ніколі не хаваўся ад уладаў, зьяўляўся па позвах у ваенкамат.

На працягу ўсяго папярэдняга сьледзтва Яўген Сувораў утрымліваўся ў Магілёўскім СІЗА. У выніку судовага разгляду справы Яўген Сувораў быў прыгавораны да штрафу ў памеры 20 базавых адзінак.

### *10. Крымінальная справа супраць Анастасіі Азаркі.*

Крымінальная справа супраць Анастасіі Азаркі была ўзбуджаная УУС Менаблвыканкаму 5 сакавіка па арт. 193.1 КК РБ (незаконная арганізацыя дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня, рэлігійнай арганізацыі ці фонду альбо ўдзел у іх дзейнасьці). Дзяўчыну падазравалі ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацы “Малады Фронт”.

Крымінальная справа была спыненая.

### *11. Крымінальная справа супраць Сяргея Марчыка.*

10 красавіка супраць моладзевага актывіста з Баранавічаў Сяргея Марчыка была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 193-1 КК РБ — дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі “Малады Фронт”. 13 красавіка на кватэрах Сяргея Марчыка і ягоных паплечнікаў Андрэя Юруця і Віктара Кісьлюка сьледчыя органы правяліператрусы, канфіскавалі маладафронтаўскія матэрыялы і выданьні дэмакратычнага руху, а таксама прыватную аргтэхніку. Крымінальная справа была заведзеная толькі супраць Сяргей Марчыка, астатнія праходзяць па ёй у якасьці сьведкаў.

Сяргей Марчык зьехаў за межы Беларусі.

### *12. Крымінальная справа супраць Юрыя Радзівіла*

Юры Радзівіл, кіроўца кандыдата ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандра Казуліна, быў затрыманы асобамі ў цывільным 2 сакавіка. Машына Юрыя Радзівіла, з якой вяліся відэаздымкі масавага затрыманьня і зьбіцьця журналістаў і людзей ля РУУС Кастрычніцкага раёну Менску, была абстраляная супрацоўнікамі сьпецпадразьдзяленьня МУС па барацьбе з тэрарызмам “Алмаз” (камандзір – палкоўнік міліцыі Мікалай Карпянкоў). Юры Радзівіл

накіраваў заяву пракурору гораду Менску Н. Н. Куліку з патрабаваньнем узбудзіць крымінальную справу ў адносінах да неўстаноўленых цывільных асобаў, якія выкарысталі супраць яго агнястрэльную зброю, аднак пракурор даў згоду на ўзбуджэньне крымінальнай справы супраць яго самога.

Супраць Юрыя Радзівіла было вылучае абвінавачаньне па ч.2 арт. 363 КК РБ (супраціўленьне супрацоўніку міліцыі ці іншай асобе, якая ахоўвае грамадзкі парадак). На працягу ўсяго часу правядзеньня папярэдняга сьледзтва па справе ён знаходзіўся ў СІЗА г. Менску.

18 траўня Юры Радзівіл быў асуджаны судом Маскоўскага раёну г. Менску да трох месяцаў арышту. 2 ліпеня ў сувязі з адбыцьцём тэрміну пакараньня ён быў вызвалены.

### *13. Крымінальная справа супраць Івана Крука*

Актывіст АГП і праваабаронца Іван Крук зьяўляўся кіраўніком Астравецкага раённага штабу кандыдата ў прэзідэнты РБ Аляксандра Мілінкевіча. Крымінальная справа супраць яго была ўзбуджаная 3 лютага сьледчым пракуратуры Астравецкага раёну паводле абвінавачаньня ў гвалтоўных дзеяньнях у дачыненьні да супрацоўнікаў міліцыі — ч. 2 арт. 363 КК (супраціўленьне супрацоўніку міліцыі ці іншай асобе, якая ахоўвае грамадзкі парадак). Падставай для абвінавачаньня стала тое, што Іван Крук падчас вобыску, які праводзіўся без законных падставаў у ягонай кватэры, разьбіў уласны кампутар аб падлогу.

15 траўня судом Астравецкага раёну Іван Крук быў прыгавораны да 6 месяцаў арышту. Накіраваны адбываць пакараньне ў калонію г. Глыбокае Віцебскай вобласьці.

### *14. Крымінальная справа супраць старшыні РГА "Беларускі Хельсінскі камітэт" Тацяны Працькі.*

1 сакавіка Дэпартамент фінансавых расьсьледаваньняў Камітэту дзяржкантролю аднавіў крымінальную справу адносна РГА "Беларускі Хельсінскі камітэт" па ч. 2 арт. 243 КК РБ (ухіленьне ад выплаты падаткаў, збораў). Абвінавачанай у справе была прызнаная старшыня БХК Тацяна Працька, якая, паводле падатковай інсьпекцыі, падазравалася ва ўхіленьні ад выплаты каля 70 тысячаў даляраў падаткаў.

Справа датычыць падаткаў за грашовую дапамогу, атрыманую паводле праграмаў Еўрасаюзу TACIS. Гэтая дапамога аказвалася

Беларусі пры ўмове, што ня будзе абкладацца падаткамі. Вышэйшы гаспадарчы суд спачатку стаў на бок праваабаронцаў, але на пачатку году адмяніў сваё рашэньне.

28 сакавіка крымінальная справа была спыненая ў сувязі з адсутнасьцю ў дзеяньнях Т. Процькі грамадзка небясьпечнага дзеяньня.

### *15. Крымінальная справа супраць Андрэя Панасіка.*

Крымінальная справа супраць грамадзкага актывіста з г. Масты Гарадзенскай вобласьці Андрэя Панасіка была ўзбуджаная 11 сакавіка згодна з арт. 193.1 КК РБ (незаконная арганізацыя дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня, рэлігійнай арганізацыі ці фонду альбо ўдзел у іх дзейнасьці) па падазраньні ў датычнасьці да незарэгістраванай Грамадзянскай ініцыятывы "Партнёрства".

Справа была спынененая.

### *16. Крымінальная справа супраць Мікіты Сасіма.*

14 сакавіка каардынатара моладзевага руху "Зубр" Мікіту Сасіма разам з Наталяй Ушко, Нікай Лазоўскай і Мікітам Шуцянковым увечары без усялякай прычыны затрымалі каля станцыі метро "Пушкінская" ў Менску і даставілі ў Фрунзенскі РУУС.

З міліцэйскага патарунку Мікіта Сасім трапіў у 9-ю клінічную бальніцу сталіцы з абвастрэньнем апендыцыту, яму зрабілі аперацыю. 16 сакавіка ў бальніцу да Сасіма прыйшлі супрацоўнікі міліцыі і, прад'явіўшы пастанову Баранавіцкага гарадзкога аддзелу ўнутраных справаў, даставілі ў Баранавіцкі ГАУС, а затым у баранавіцкую гарадзкую бальніцу. Там быў праведзены допыт моладзевага актывіста па факце ўзбуджэньня крымінальнай справы па арт. 435 ч.1 Крымінальнага кодэксу (ухіленьне ад мерапрыемстваў, зьвязаных з усеагульным вайсковым абавязкам). Гэта ўжо другая спроба ўзбуджэньня крымінальнай справы ў дачыненьні да М. Сасіма па падобным абвінавачаньні, прычым першы раз Баранавіцкі ГАУС адмовіў ваенкамату ва ўзбуджэньні справы толькі 5 сьнежня 2005 году, паколькі не знайшоў аб'ектыўных дадзеных, якія б сьведчылі аб ухіленьні маладога чалавека ад вайсковай службы.

Да суда Мікіта Сасім утрымліваўся пад вартай у СІЗА г. Баранавічы. 12 траўня суд г. Баранавічы вынес прысуд – 3 месяцы арышту. 16 чэрвеня Мікіта Сасім быў вызвалены з-пад варты ў сувязі з адбыцьцём тэрміну пакараньня.

### *17. Крымінальная справа супраць Эдварда Зелянкова.*

Моладзевы актывіст са Жлобіну Эдуард Зелянкоў быў затрыманы 13 сакавіка за нанясеньне графіці. Крымінальная справа супраць яго была ўзбуджаная па артыкулах 193.1 (дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі) і 339 (хуліганства) Крымінальнага кодэксу. Следзтва вялося аддзелам унутраных справаў Цэнтральнага раёну г. Гомелю.

На пачатку чэрвеня абвінавачаньне ў хуліганстве з Зелянкова было зьнятае за адсутнасьцю складу злачынства і пакінутае абвінавачаньне ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі “Малады Фронт”. Паводле рашэньня суда Жлобінскага раёну, Эдвард Зелянкоў быў асуджаны да штрафу.

### *18. Крымінальная справа супраць Мікалая Разумава.*

14 сакавіка пракуратура г. Оршы ўзбудзіла крымінальную справу супраць колішняга лідэра рабочага руху Мікалая Разумава па арт. 367 КК РБ (паклёп у дачыненьні да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). Справа датычылася выказваньняў М. Разумава 24 лютага, падчас сустрэчы з выбаршчыкамі кандыдата ў прэзідэнты А.Мілінкевіча, адносна датычнасьці А. Лукашэнкі да забойства Юрыя Захаранкі і Віктара Ганчара. Да суда М. Разумаў знаходзіўся пад вартай у СІЗА, яму была зробленая псіхіятрычная эксьпертыза.

16 чэрвеня судзьдзя Аршанскага суда Таццяна Рыбакова прызнала Мікалая Разумава вінаватым і прыгаварыла яго да 3 гадоў абмежаваньня волі. У сувязі з тым, што М. Разумаву МРЭК была ўстаноўленая непрацоўная група інваліднасьці, абмежаваньне волі было замененае на больш мяккае пакараньне.

### *19. Крымінальная справа супраць Юліі Касьпер.*

Крымінальная справа супраць актывісткі Юліі Касьпер была ўзбуджаная 20 лютага пракуратурай Ленінскага раёну г. Гародні па арт. 192 КК РБ (парушэньне заканадаўства аб выбарах) па фактах нібыта ўчыненьня падлогу ў падпісных лістах па збору подпісаў у падтрымку Аляксандра Казуліна.

1 ліпеня была вынесеная пастанова аб спыненьні крымінальнай справы.

### *20. Крымінальная справа супраць Зьмітра Дашкевіча.*

Зьміцер Дашкевіч быў арыштаваны 15 верасьня па падазрэньні ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі “Малады Фронт” у межах крымінальнай справы, узбуджанай згодна з арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу. Моладзевага актывіста выклікалі на допыт у пракуратуру, дзе азнаёмілі з пастановай аб абраньні меры стрыманьня ў выглядзе ўзяцьця пад варту, а затым адразу ж адвезьлі ў ізалятар. Арышт З. Дашкевіча быў санкцыянаваны Генеральным пракурорам Беларусі П. Міклашэвічам.

Крымінальную справу супраць актывістаў “Маладога Фронту” распачалі супрацоўнікі Камітэту барацьбы з тэрарызмам. Раённыя пракуратуры, згодна з распараджэньнем КДБ, у межах справы дапыталі дзясяткі людзей. У сьпіс падазраваных, апроч Зьмітра Дашкевіча, трапілі Сяржук Лісічонак, Алег Корбан і Барыс Гарэцкі, аднак пазьней справы супраць гэтых моладзевых актывістаў былі спыненыя.

1 лістапада судзьдзя суда Кастрычніцкага раёну г. Менску Ала Булаш прызнала Зьмітра Дашкевіча вінаватым і прыгаварыла яго да году і шасьці месяцаў пазбаўленьня волі. Суд насіў закрыты характар. Менскі гарадзкі суд не задаволіў касацыйную скаргу Дашкевіча і пакінуў прысуд суда першай інстанцыі без зьменаў.

Яшчэ да ўступленьня прысуду ў законную сілу Зьміцер Дашкевіч быў накіраваны ў Шклоўскую калонію Магілёўскай вобласьці, дзе і адбывае пакараньне.

### *21. Крымінальная справа супраць Вадзіма Логінава і Аляксея Крывінцова.*

Крымінальная справа супраць гарадзенцаў Вадзіма Логінава і Аляксея Крывінцова была ўзбуджаная па факце напісаньня 22 верасьня графіці супраць БРСМ па арт. 341 Крымінальнага кодэксу (апаганьванне будынкаў і псаваньне маёмасьці) паводле пастановы начальніка РАУС адміністрацыі Ленінскага раёну г. Гародні падпалкоўніка міліцыі А.Н. Зіновіка.

Матэрыяльныя страты дазнавальнік міліцыі старэйшы лейтэнант Д.Н. Шкулепа ацаніў у 51 420 і 300 000 беларускіх рублёў. Выдаткі на рамонт сьценаў маладымі людзьмі былі выплачаныя.

Паводле прысуду суда Ленінскага раёну г. Гародні Вадзіму Логінаву і Аляксею Крывінцову вынесеныя штрафы.

### 22. Крымінальная справа супраць Дзяніса Дзянісава і Тацяны Елавой.

Крымінальная справа супраць Тацяны Елавой з Менску і Дзяніса Дзянісава з Віцебску была ўзбуджаная па арт. 342 ч.1 Крымінальнага кодэксу «Арганізацыя і падрыхтоўка групавых дзеяньняў, што груба парушаюць грамадзкі парадак» у выніку падзеяў 18-га чэрвеня, калі ў Віцебску заявіла пра сябе новая ініцыятыва “Бунт” і ў абласным цэнтры зьявілася мноства апазіцыйных графіці, а над летнім амфітэатрам быў узьняты бел-чырвона-белы сьцяг.

Паводле афіцыйнага міліцэйскага паведамленьня, «дадзеныя грамадзяне падрыхтавалі, спланавалі і арганізавалі правядзеньне на тэрыторыі Кастрычніцкага раёну г. Віцебску групавой несанкцыянаванай акцыі, накіраванай на грубае парушэньне грамадзкага парадку і зрыў культурна-масавых мерапрыемстваў». Падазраваных разам з іншымі ўдзельнікамі віцебскіх падзеяў неаднаразова выклікалі на допыты па гэтай справе (на допытах па гэтай справе пабывала больш за 80 асобаў), у кватэры Тацьцяны Елавой і кватэрах іншых актывістаў арганізацыі былі праведзеныя вобыскі.

Тацьцяна Елавая здолела пакінуць тэрыторыю Беларусі, супраць Дзяніса Дзянісава сьледчыя дзеяньні працягваюцца.

### 23. Крымінальная справа супраць Мікалая Аўтуховіча.

7 ліпеня ў Кастрычніцкім раённым судзе Гародні на тры гады і шэсьць месяцаў зьняволеньня з канфіскацыяй маёмасьці быў асуджаны ваўкавыскі прадпрымальнік, адзін з лідэраў прадпрымальніцкага руху Гарадзеншчыны Мікалай Аўтуховіч. Ён прызнаны вінаватым ва ўчыненьні злачынства, прадугледжанага ч.2 арт. 243 Крымінальнага кодэксу – ухіленьні ад выплаты падаткаў, што нанесла страты ў асабліва буйным памеры.

Пакараньне накіраваны адбываць у калонію г. Менску.

### 24. Крымінальная справа супраць Андрэя Абозава, Паўла Марозава, Алега Мініча.

Сябры грамадзянскай ініцыятывы “Трэці шлях” Алег Мініч, Андрэй Абозаў і Павел Марозаў падазраюцца ў абразе Аляксандра Лукашэнкі. З 16 жніўня 2005 г. менская пракуратура сумесна з КДБ вядуць крымінальную справу згодна з арт. 368 КК РБ. Падставай для крымінальнай справы сталі мультфільмы палітычнага зьместу, разьмешчаныя на інтэрнэт-сайце арганізацыі. 20 лістапада сьледчы менскай пракуратуры азнаёміў Паўла Марозава з пастановай

аб прызнаньні яго падазраваным ва ўчыненьні дададзенага крымінальнага злачынства.

Актывісты арганізацыі “Трэці шлях” пакінулі тэрыторыю Беларусі.

### *25. Крымінальная справа супраць Кацярыны Садоўскай.*

Сябра беларускага аддзяленьня Пскоўскага рэгіянальнага грамадзкага аб’яднаньня “Веча” 60-гадовую Кацярыну Садоўскую затрымалі 25 ліпеня паводле крымінальнай справы, узбуджанай па арт. 368 КК РБ (абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). Спачатку яе трымалі ў псіхіятрычным шпіталі, а потым перавялі ў сьледчы ізалятар.

Падставай дзеля крымінальнай справы стаў неадпраўлены ліст, знойдзены падчасператрусу ў кватэры К.Садоўскай, у якім жанчына абвінаваціла кіраўніка дзяржавы ў крымінальных злачынствах і назвала яго “монстрам”. Лінгвістычная экспертыза пастанавіла, што ўжытае слова зьяўляецца параўнаньнем з жывёлай і абражае асобу.

24 кастрычніка судзьдзя Ленінскага раённага суда г.Менску Тацяна Жулкоўская пакарала Кацярыну Садоўскую на два гады зьняволеньня ў калоніі агульнага рэжыму. Кацярына Садоўская накіраваная адбываць пакараньне ў Гомельскую жаночую калонію. 22 сьнежня Менскі гарадзкі суд пакінуў прысуд бяз зьменаў.

### *26. Крымінальная справа супраць Мечыслава Яскевіча.*

Актывіст “Саюзу палякаў на Беларусі” Мечыслаў Яскевіч абвінавачваецца ў парушэньні арт. 399 Крымінальнага кодэксу РБ – “хуліганства” нібыта за бойку на прыпынку. 5 лістапада ён быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі і зьмешчаны ў сьпецпрыёмнік Кастрычніцкага РАУС Гародні. 7 лістапада Яскевіча вызвалілі з-пад варты. Матэрыялы крымінальнай справы перададзеныя для разгляду ў суд Кастрычніцкага раёну Гародні.

Гэта ня першы выпадак правакацыяў і крымінальнага перасьледу актывістаў “Саюзу палякаў на Беларусі”. 29 кастрычніка на мяжы з Літвой былі затрыманыя старшыня арганізацыі Анжаліка Борыс і некалькі актывістаў на падставе выяўленага ў аўтамабілі пакецiку з невядомым парашком, які аказаўся амфетамінам. Гарадзенская рэгіянальная мытня ўзбудзіла крымінальную справу па факце кантрабанды наркотыкаў. Актывісты “Саюзу палякаў на

Беларусі" называюць падобныя дзеяньні «правакацыяй беларускіх праваахоўных органаў».

### *27. Крымінальная справа супраць Канстанціна Лукашова.*

19 сьнежня па месцы працы ў Інстытуце геахіміі і геафізікі Нацыянальнай Акадэміі навук супрацоўнікамі міліцыі быў затрыманы Канстанцін Лукашоў. 20 сьнежня ён быў узяты пад варту ў якасьці падазраванага па крымінальнай справе па арт. 364 КК РБ (гвалт ці пагроза прымяненьня гвалту ў адносінах да супрацоўнікаў міліцыі), узбуджанай па падзеях 28 сакавіка.

У той дзень Канстанцін Лукашоў на машыне вывез са шпіталю свайго брата Вячаслава Сіўчыка, які быў дастаўлены туды са сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку ў выніку пагаршэньня стану здароўя. Па меркаваньні сьледзтва, у той дзень Канстанцін Лукашоў нібыта ўчыніў наўмысны наезд на супрацоўніка міліцыі, які выконваў свае службовыя абавязкі.

К. Лукашоў быў узяты пад варту ў СІЗА з матывіроўкай, што ён нібыта хаваўся ад сьледзтва і быў у вышуку, пры гэтым ён кожны дзень хадзіў на працу і вёў актыўную перапіску з органамі пракуратуры і іншымі дзяржаўнымі органамі.

Да канца 2006 году Канстанцін Лукашоў працягваў знаходзіцца пад вартай у СІЗА г. Менску.

## 5. Перасьлед незалежных сродкаў масавай інфармацыі і журналістаў, парушэньне правоў грамадзянаў на свабоду слова і атрыманьне праўдзівай інфармацыі

Артыкулы 33 і 34 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гарантуюць кожнаму права на свабоду меркаваньняў, перакананьняў і іх свабоднае выказваньне, права на атрыманьне, захоўваньне і распаўсюд поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі. Права кожнага чалавека на свабоднае выказваньне свайго меркаваньня замацаванае і ў асноўных дакументах ААН — Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах (арт. 19).

Разам з тым, у Беларусі кантроль за інфармацыйнай прасторай стаў сродкам палітычнага выжываньня ўлады. Найперш гэта выяві-

лася ў татальным кантролі за інфармацыяй унутры краіны: замест аб’ектыўных зьвестак грамадзяне атрымліваюць прапагандысцкія стэрэатыпы, што стала магчымым дзякуючы фактычнай манапалізацыі дзяржавай электронных медыяў, усебаковай падтрымцы дзяржаўных выданьняў і зьнішчэньні незалежных СМІ.

Сутнасьць дзяржаўнай палітыкі ў галіне інфармацыі была выкладзеная А. Лукашэнкам 26 студзеня 2006 году падчас уручэньня ўзнагародаў супрацоўнікам беларускага тэлебачаньня: “Дзяржава аказвае ўсебаковую падтрымку дзяржаўным сродкам масавай інфармацыі. Толькі такім чынам улада можа выконваць свае важнейшыя функцыі: забясьпечваць палітычную стабільнасьць, актыўна супрацьстаяць унутраным і зьнешнім пагрозам”.

Асноўны прававы акт, які рэгулюе арганізацыю і дзейнасьць СМІ ў Беларусі, – Закон “Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі” (прыняты ў 1995 годзе), размовы пра ўдасканальваньне якога вяліся яшчэ з канца 1990-х. Так, у 2001 годзе ў Страсбургу былы кіраўнік Дзяржкамдруку Беларусі Міхаіл Падгайны паабяцаў прадставіць на эксьпертызу еўрапейскіх структураў падрыхтаваны праект новага Закону аб СМІ, аднак гэтага так і не было зроблена. Законапраект ня быў унесены на разгляд беларускага парламенту ў папярэднія гады, у планах працы Палаты прадстаўнікоў на 2006 год новай рэдакцыі Закону аб СМІ таксама не аказалася.

Неаднаразова ўказвалася, што асноўныя зьмены ў закон будуць тычыцца стварэньня “пэўных прававых рамак для інтэрнэт-выданьняў”, што можа прывесьці да кантролю над адной з нямногіх крыніцаў альтэрнатыўнай інфармацыі. Эксперты ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”, прааналізаваўшы “працоўны” варыянт праекту Закону аб СМІ узору 2003 году – апошняга, які ўдалося ім атрымаць, выказалі меркаваньне, што азначэньне “сеткавых СМІ” дазваляе аднесьці да іх і карпаратыўныя сайты юрыдычных асобаў, якія рэгулярна абнаўляюць стужкі навінаў пра арганізацыі, і інтэрнэт-версіі ўжо зарэгістраваных выданьняў, і персанальныя інтэрнэт-старонкі і інш. Пры гэтым усе сеткавыя СМІ, якія рэгулярна займаюцца зборам, захоўваньнем, апрацоўкай і распаўсюдам праз глабальныя інфармацыйныя сеткі інфармацыйных матэрыялаў, павінныя будуць рэгістравацца. Гэта, у сваю чаргу, створыць нічым не апраўданыя перашкоды для разьмяшчэньня інфармацыі ў Інтэрнэце.

У краіне склалася трывалая тэндэнцыя пагаршэньня сітуацыі з выкананьнем грамадзянскіх і палітычных правоў, у тым ліку і са

свабодай выказваньня, падчас правядзеньня значных палітычных кампаніяў. Менавіта такім быў 2006-ы — годам правядзеньня прэзідэнцкіх выбараў, які адзначыўся масавымі парушэньнямі свабоды слова і меркаваньняў, сістэматычным і мэтанакіраваным перасьледам і абмежаваньнем дзейнасьці незалежных сродкаў масавай інфармацыі і журналістаў. Прычым пасьля завяршэньня кампаніі па выбарах прэзідэнта сітуацыя не зьмянілася.

На працягу году выкарыстоўвалі наступныя формы барацьбы са свабодай слова: спыненьне альбо прыпыненьне дзейнасьці медыяў, крымінальныя справы за публікацыі ў СМІ, затрыманьні і арышты журналістаў, пісьмовыя папярэджаньні ў сувязі з прафесійнай дзейнасьцю, адмовы ў прадастаўленьні інфармацыі, перашкоды ў вырабе і распаўсюдзе медыяў, падача неабгрунтаваных грамадзянскіх зыскаў у судовыя інстанцыі, абмежавальнае выкарыстаньне інстытуту акрэдытацыі, нядопуск замежных журналістаў на тэрыторыю краіны і іншыя.

Не адбылося станоўчых зрухаў у расьследаваньні справы аб зьнікненьні ў 2000 годзе беларускага журналіста, аператара ОРТ Дзьмітрыя Завадзкага. Наадварот, 31 сакавіка справа прыпыненая “ў сувязі з невыяўленьнем бясьсьледна зьніклай асобы”. Пры гэтым пракуратурай не ўзбуджаецца справа адносна магчымага забойства журналіста, а тым самым – прыцягненьня да адказнасьці вінаватых у гэтым злачынстве. Увесну ўдава Завадзкага Сьвятлана заснавала “Фонд імя Дзьмітрыя Завадзкага”, галоўная мэта якога — дамагчыся праўды ў справе аб зьнікненьні Дз. Завадзкага і «забясьпечыць дапамогу беларускім журналістам, якія пакутуюць ад рэпрэсіяў аўтарытарнай беларускай улады». У кастрычніку зьявіўся сайт «Фонду Дзьмітрыя Завадзкага» (http://www.zavadsky.org).

У 2006 годзе беларускія праваахоўныя органы не выявілі забойцаў журналісткі Веранікі Чаркасавай, якая загінула ад шматлікіх раненьняў 20 кастрычніка 2004 году ва ўласнай кватэры. Нагадаем, што сын журналісткі Антон Філімонаў і яе айчым Уладзімір Мялешка пэўны час лічыліся падазраванымі ў забойстве Чаркасавай, аднак потым гэтае падазрэньне было з іх зьнятае. Разам з тым, 27 сьнежня 2005 году Антона Філімонава затрымалі супрацоўнікі Першамайскага РУУС г.Менску па падазрэньні ў вырабе беларускіх грашовых купюраў. У яго і яшчэ чатырох яго знаёмых знайшлі некалькі фальшывых купюраў, і ў дачыненьні да іх была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 221 КК РБ. Яны правялі некалькі сутак у сьледчым ізалятары часовага ўтрыманьня, аднак 30 сьнежня

ўсіх, акрамя Антона, адпусьцілі. Было ўстаноўлена, што падчас утрыманьня ў СІЗА ў дачыненьні да падлетка праводзіліся дзеяньні, “накіраваныя на праверку яго магчымай спрычыненасьці да забойства Веранікі Чаркасавай”, хаця афіцыйнае сьледзтва гэта абвяргала. 11 красавіка суд Першамайскага раёну г. Менску асудзіў Антона Філімонава на два з паловай гады пазбаўленьня волі з адтэрміноўкай выкананьня прысуду на 2 гады. Расьсьледаваньне справы аб забойстве Веранікі Чаркасавай прыпыненае 14 сакавіка “ў сувязі з невысьвятленьнем асобы, якая падлягае прыцягненьню ў якасьці абвінавачанага” (з гэткай жа фармулёўкай сьледзтва прыпынялі ў канцы сьнежня 2005 году; у канцы лютага яго зноў аднавілі — усяго на некалькі тыдняў).

Не пастаўленая кропка ў расьсьледаваньні сьмерці пазаштатнага карэспандэнта газеты “Народная Воля” Васіля Гроднікава, які памёр 18 кастрычніка 2005 году пры нявысьветленых абставінах ад чэрапна-мазгавой траўмы. 17 лютага намесьнік Генеральнага пракурора Віктар Прус на паседжаньні калегіі рэспубліканскай пракуратуры заявіў, што сьледчы Менскай міжрайпракуратуры прыйшоў да высновы, што сьмерць магла надысьці ад падзеньня немаладога мужчыны з вышыні свайго росту. У сьнежні 2005 году сабраныя матэрыялы праверыла рэспубліканская пракуратура і таксама не знайшла ніякіх дадзеных, што пазаштатны карэспандэнт стаў ахвярай іншых асобаў. Тым ня менш, брат Васіля Гроднікава выказаў сумневы ў аб’ектыўнасьці праверкі праваахоўных органаў і дамагаецца дасканалага расьсьледаваньня прычынаў сьмерці журналіста.

Абмежаваньне права на свабоду меркаваньняў і іх свабоднае выяўленьне праяўлялася ў выкарыстаньні супраць крытыкаў існуючага рэжыму артыкулаў Крымінальнага кодэксу. У студзені 2006 году была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 369 КК (публічная абраза службовых асобаў) супраць моладзевага актывіста з г.Жодзіна Паўла Красоўскага, які апублікаваў у бюлетэні “Назіральнік” сатырычныя карыкатуры на кіраўніцтва гораду. Крымінальная справа пасьля некалькіх месяцаў расьсьледаваньня была спыненая. Працягваліся сьледчыя дзеяньні па крымінальнай справе, узбуджанай 16 жніўня 2005 году па арт. 368 Крымінальнага кодэксу (абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) супраць стваральнікаў мультфільмаў палітычнага зьместу, якія былі разьмешчаныя на сайце Грамадзянскай ініцыятывы “Трэці шлях” (mult.3dway.org). Сябры мультклубу, у адносінах да якіх праводзіліся сьледчыя дзеяньні па гэтай справе, пакінулі Беларусь.

Беларусь стала адзінай краінай у сьвеце, дзе за передрук карыкатурных выяваў прарока Мухамеда, якія раней справакавалі міжнародны скандал, была ўзбуджаная крымінальная справа. Гэта адбылося 23 лютага па факце публікацыі ў недзяржаўнай газеце “Згода” артыкулу “Палітычны крэатыў”, ілюстраванага карыкатурамі, нягледзячы на тое, што газета не была распаўсюджаная. Справа была ўзбуджаная па ч. 1 арт. 130 КК РБ (распальваньне расавай, нацыянальнай альбо рэлігійнай варожасьці) па выніках праверкі, праведзенай Пракуратурай РБ і КДБ нібыта на падставе звароту ў праваахоўныя органы Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў і мусульманскіх супольнасьцяў Беларусі. Напярэдадні зьявілася заява Міністэрства замежных справаў, у якой МЗС “рашуча асудзіў любыя наўмысныя дзеяньні, якія могуць пацягнуць распальваньне міжрэлігійнай варожасьці, распаўсюд... недаверу паміж нацыянальнымі і рэлігійнымі супольнасьцямі, якія жывуць у Беларусі”. Адначасова галоўны рэдактар выданьня Аляксей Кароль заявіў, што ў самім артыкуле ня ўтрымліваецца нічога, пра што гаворыцца ў заяве МЗС, і што выданьне з павагай ставіцца да ўсіх канфесіяў. 6 сакавіка Міністэрства інфармацыі падало ў Вышэйшы Гаспадарчы суд зыск аб спыненьні дзейнасьці газеты “Згода”. 7 сакавіка ВГС прыняў зыск да разгляду, а таксама, па просьбе міністэрства, прыпыніў газету яшчэ да суда, каб за гэты час “адказчык ня мог груба парушыць патрабаваньні закону аб друку”. Падставай для закрыцьця “Згоды”, згодна з зыскам Мінінфармацыі, стала неаднаразовае парушэньне рэдакцыяй патрабаваньняў арт. 5 Закону “Аб друку і іншых СМІ” (першае папярэджаньне па гэтым артыкуле было вынесенае 9 лістапада 2005 году і тычылася гумарыстычных калажаў з выявамі дзяржаўных асобаў; другое было вынесена 23 лютага за передрук малюнкаў, што сталіся прычынай “карыкатурнага скандалу”). 17 сакавіка судзьдзя Вышэйшага гаспадарчага суда Аксана Міхнюк задаволіла зыск Мінінфармацыі і прыняла рашэньне аб спыненьні дзейнасьці газеты.

Неймаверна цяжкімі ўмовамі працы адзначыўся 2006 год для недзяржаўных выданьняў. Найбольш адчувальным ударам па незалежнай прэсе стала забарона на распаўсюд праз падпіску і сетку “Белсаюздрук” большасьці недзяржаўных газетаў, як цэнтральных, так і рэгіянальных. Прымаючы рашэньне выключыць з падпіснога каталогу на 2006 год большасьць незалежных газетаў, “Белпошта” пайшла на адкрытае парушэньне Закону «Аб паштовай сувязі». Перад гэтым, у 2004 годзе, быў уведзены ліцэнзаваны парадак

паштовай дастаўкі друкаваных выданьняў да чытачоў – ліцэнзія на гэта была выдадзена толькі дзяржаўным прадпрыемствам. Адначасова быў практычна спынены гандаль недзяржаўнымі выданьнямі праз дзяржаўную сетку “Белсаюздрук”. Гэтая практыка была працягнутая і на наступны год – на першае паўгодзьдзе 2007 году вядучыя недзяржаўныя грамадзка-палітычныя газеты не трапілі ў падпісны каталог “Белпошты”. Дзяржаўнае прадпрыемства-манапаліст паштовай сувязі “Белпошта” адмовілася супрацоўнічаць з недзяржаўнымі нацыянальнымі газетамі “Народная воля”, “Наша Ніва”, “Товарищ”, “СНплюс. Свободные новости плюс”. У падпісным каталогу не апынулася таксама каля дзясятку рэгіянальных незалежных выданьняў: “Брестский курьер”, “Витебский курьер”, “Борисовские новости”, “Газета Слонимская”, баранавіцкая газета “Intex-press”, “Ляхавіцкі час”, “Вольнае Глыбокае”, “Ганцавіцкі час”, пінскі тыднёвік “Мясцовы час”. Такім чынам, недзяржаўныя выданьні, якія не трапілі ў каталог, страцілі адзіную магчымасьць распаўсюджвацца праз падпіску, а іх чытачы — атрымліваць гэтыя газеты зручным і папулярным спосабам — у паштовую скрыню. І на просьбы рэдакцыяў, і на патрабаваньні чытачоў уключыць газеты ў каталог, кіраўніцтва “Белпошты” аднастайна адказвала, што “паколькі абавязак па ўключэньні друкаванага выданьня ў каталог не прадугледжаны заканадаўствам, выбар друкаваных выданьняў для фармаваньня каталогу з мэтай наступнага іх распаўсюду праз падпіску зьяўляецца правам РУП “Белпошта”, якое рэалізуецца ім у адпаведнасьці з заканадаўствам”.

З некаторымі выданьнямі, на якія вялася падпіска на 2006 год, “Белпошта” тэрмінова і ў аднабаковым парадку на пачатку году скасавала дамовы на распаўсюд. Так, 10 лютага рэдакцыя недзяржаўнай рэгіянальнай газеты “Химик” атрымала пра гэта афіцыйнае паведамленьне ад начальніка наваполацкага гарадзкога вузла паштовай сувязі Алены Клімавай. Аналагічнае пасланьне атрымаў “Химик” і з Полацкага раённага вузла паштовай сувязі: начальнік РУПС Парамонаў папрасіў “лічыць несапраўднай” дамову на эксьпедыяваньне, перавозку і дастаўку падпіснога накладу газеты на 2006 год.

Адначасова перасьледаваліся прыватныя распаўсюднікі друкаваных выданьняў. 30 студзеня супрацоўнікі РАУС г. Жлобіну (Гомельская вобласьць) забралі 694 асобнікі газеты “Товарищ” і 282 асобнікі “Народнай волі” з машыны грамадзкага актывіста Уладзіміра Кацоры.



21 лютага ў Рагачове міліцыя забрала ў грамадзкага распаў-

сюдніка Валерыя Рыбчанкі 3985 асобнікаў газеты "Товарищ" і 600 асобнікаў газеты "Народная воля". Увечары таго ж дня ў Магілёве быў затрыманы Уладзімір Шанцаў, які прывёз з Менску ў вобласьць 26 000 афіцыйных передвыбарных улётак А.Мілінкевіча і 400 асобнікаў газеты "Товарищ". У той жа дзень у раённым цэнтры Ветка міліцыя затрымала Марыю Багдановіч і Людмілу Судзілоўскую з Гомелю, якія раздавалі жыхарам райцэнтру газеты "Народная воля" і "Товарищ".

21 красавіка галоўнаму рэдактару "Газеты Слонімскай" Віктару Валадашчуку паведамілі, што загадчык аддзелу гандлю і бытавых паслугаў мясцовага райвыканкаму Ігар Трафімовіч пагражаў індывідуальным прадпрымальнікам, якія ўзялі на рэалізацыю "ГС", што іх гандлёвыя кропкі будуць ліквідаваныя.

26 чэрвеня суд Чыгуначнага раёну Віцебску аштрафаваў грамадзкіх актывістаў Барыса Хамайду і Алеся Мудрычэнку на адну базавую велічыню за распаўсюд недзяржаўных газетаў "Витебский курьер М", "Наша ніва" і часопісу "ARCHE" па ч.1 арт. 148 КаАП (гандаль у неналежным месцы).

10 жніўня за распаўсюд недзяржаўнай газеты "Народная воля" ў Пінску быў затрыманы грамадзкі актывіст Аляксандр Рамановіч. Супрацоўнікі міліцыі Пінскага ГАУС канфіскавалі 261 асобнік газеты, а спадара Рамановіча адвезьлі ў аддзяленьне, дзе на яго быў складзены пратакол.

5 кастрычніка былі канфіскаваныя з асартыменту адной з менскіх крамаў 20 асобнікаў газеты "Наша Ніва". Трое мужчынаў, якія назваліся супрацоўнікамі КДБ, забралі асобнікі газеты, патлумачыўшы свае дзеяньні тым, што нібыта "Наша Ніва" забароненая для распаўсюду ў Менску. Між тым, газета "Наша Ніва" зарэгістраваная Міністэрствам інфармацыі і мае права распаўсюджвацца на ўсёй тэрыторыі Беларусі, а з крамай, адкуль былі канфіскаваныя асобнікі, існавала адпаведная дамова на продаж.

10 кастрычніка старшыня Лунінецкага райвыканкаму В. Гарун забараніў прадаваць у кіёску "Брэстаблсаюздруку", які знаходзіцца ў будынку выканкаму, недзяржаўную газету «Информ-прогулка», нягледзячы на тое, паміж рэдакцыяй і прадпрыемствам "Брэстаблсаюздрук" існавала афіцыйная дамова на распаўсюд газеты.

У той жа час зафіксаваныя факты прымусовай падпіскі на дзяржаўныя газеты. Так, у студзені быў абнародаваны дакумент, які прызначаўся "для службовага карыстаньня", у якім в.а. начальніка вытворчасьці "Менскай пошты" В.В. Пугач загадвала ўсім паштовым аддзяленьням працягнуць падпіску на газету адміністрацыі прэзі-

дэнта «Советская Белоруссия» да 10 студзеня "ў сувязі з тым, што наклады не адпавядаюць узроўню 01.01.2005 г.". В.В.Пугач таксама абавязала кожнае аддзяленьне паштовай сувязі дадаткова афор-міць падпіску на гэтае выданьне ў сярэднім на 50 асобнікаў. "У выпадку невыкананьня дадзенага распараджэньня, газета «Совет-ская Белоруссия» будзе накіроўвацца ў аддзяленьне сувязі дзеля поўнай рэалізацыі ў розьніцу," – сказана ў дакуменце.

Недзяржаўныя выданьні, як і ў папярэднія гады, неаднаразова сутыкаліся з неабгрунтаванымі адмовамі з боку друкарняў. Частка газетаў, у тым ліку і найбуйнейшыя выданьні, як "Народная воля", "БДГ. Деловая газета", "Товарищ" былі вымушаныя друкавацца за мяжой, што стварала дадатковыя перашкоды іх дзейнасьці. Вельмі часта пасьля перасячэньня мяжы наклады газетаў затрымліваліся праваахоўнымі ці мытнымі органамі без законных падставаў. Най-больш распаўсюджанай такая практыка была падчас кампаніі па выбарах прэзідэнта.

Асабліваму перасьледу падвяргалася найбольш масавая не-дзяржаўная газета "Народная воля". 3 студзеня пры перасячэньні расейска-беларускай мяжы супрацоўнікі аддзелу кантрабанды мытнай службы затрымалі ўвесь наклад першага нумару выданьня, спаслаўшыся на тое, што адзін з суправаджальных дакументаў ня быў афармлены належным чынам. Пасьля таго, як прадстаўнікі Смаленскай друкарні пацьвердзілі законнасьць друку газеты, на-клад быў вызвалены і дастаўлены ў Менск. Наступнае затрымань-не на мяжы "Народнай волі" адбылося 10 студзеня, і зноў пасьля высьвятленьня законнасьці выхаду газеты наклад быў вернуты рэдакцыі. 3 сакавіка на мяжы з Расейскай Федэрацыяй беларускія мытныя службы зноў спынілі 2 грузавікі з вялікім накладам "На-роднай волі" — агулам 250 тысячаў асобнікаў. Рэдакцыя цалкам прысьвяціла нумар падзеям 2 сакавіка ў Менску: найперш — зь-біцьцю кандыдата ў прэзідэнты А. Казуліна (і ўсім падзеям, што спа-дарожнічалі гэтаму інцыдэнту), а таксама сустрэчы з выбаршчыкамі А.Мілінкевіча. 14 і 17 сакавіка таксама былі затрыманыя наклады "Народнай волі" і дастаўленыя ва Упраўленьне ўнутраных справаў Віцебскага аблвыканкаму. Нягледзячы на тое, што рэдакцыя зьвяр-нулася да Генеральнага пракурора РБ, міністра ўнутраных справаў, начальніка Віцебскага абласнога ўпраўленьня ўнутраных справаў і да пракурора Віцебскай вобласьці з патрабаваньнем вызваліць наклады газеты, да дня выбараў яны так і не дайшлі да чытачоў.

Ня выключана, што менавіта пад ціскам беларускіх уладаў і

сьпецслужбаў напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў былі скасаваныя дамовы расейскіх друкарняў на выраб беларускіх недзяржаўных газетаў. Так, 13 сакавіка былі скасаваныя дамовы Смаленскага паліграфічнага камбінату на друк "Народнай волі" і газеты "Товарищ", ня быў надрукаваны нумар "БДГ. Деловая газета".

Неабгрунтаваным затрыманьням і канфіскацыі падвяргаліся і іншыя выданьні. Некаторыя прыклады: 5 студзеня ў рэдактара сьветлагорскай газеты "Рэгіянальныя навіны" Тэльмана Масьлюкова супрацоўнікі міліцыі канфіскавалі 297 асобнікаў выданьня; 16 студзеня на беларуска-расейскай мяжы быў арыштаваны наклад незалежнай рэгіянальнай газеты "Вольны горад", якую дастаўлялі ў Крычаў з друкарні ў Смаленску; 17 студзеня пад Скідалем (Гарадзенская вобласьць) міліцыя затрымала машыну, у якой знаходзіўся наклад часопісу "Магазын польскі ў выгнаньні".

Некаторыя выданьні пад ціскам неверагодна цяжкіх умоваў спынілі сваю дзейнасьць. 23 сакавіка выдавец і галоўны рэдактар папулярнага недзяржаўнага выданьня "БДГ. Деловая газета" Пётр Марцаў абвясьціў аб прыпыненьні выхаду газеты "да высьвятленьня ўмоваў працы ў сувязі з няпэўнасьцю абстаноўкі" з друкаваньнем, увозам газеты ў Беларусь і распаўсюдам. Нагадаем, што газета друкавалася ў Смаленску з 2003 году, была пазбаўленая магчымасьці распаўсюджвацца па падпісцы і ўраздроб, у тым ліку і праз прыватных распаўсюднікаў. Журналісты выданьня перайшлі на інтэрнэт-версію. У ліпені па тых жа прычынах – "у сувязі са складаным эканамічным становішчам" — прыпыніла выхад недзяржаўная наваполацкая гарадзкая газета "Химик".

19 верасьня Міністэрства інфармацыі прыпыніла выхад часопісу "ARCHE" тэрмінам на тры месяцы. Адпаведны загад падпісаў кіраўнік ведамства Уладзімір Русакевіч са спасылкай на арт.16 Закону «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі». У гэты ж дзень часопісу было вынесенае другое па ліку на працягу году папярэджаньне аб парушэньні заканадаўства. У абодвух дакументах сьцьвярджалася, што зроблена гэта ў сувязі з тым, што, надрукаваўшы публікацыі грамадзка-палітычнага характару, часопіс "ARCHE. Пачатак" зьмяніў тэматыку (сьпецыялізацыю) і не паведаміў аб гэтым у Мінінфармацыі ў вызначаны тэрмін дзеля ўнясеньня адпаведных зьменаў у рэгістрацыйнае пасьведчаньне. 21 красавіка заснавальніку часопісу было вынесенае папярэджаньне аб парушэньні арт. 11 Закону "Аб друку і іншых СМІ" (перарэгістрацыя сродкаў

масавай інфармацыі). “Дадзенае зьмяненьне заснавальнік ня ўнёс дагэтуль, аднак у часопісе (№9 ад 2006 г.) працягваюць публікавацца пад рубрыкамі “Аналітыка”, “Гісторыя” і іншымі матэрыялы грамадзка-палітычнага характару”, — сьцьвярджалася ў загадзе Ул. Русакевіча аб прыпыненьні дзейнасьці часопісу (выданьне зарэгістраванае як літаратурна-мастацкае, навуковае і навукова-папулярнае). Разам з тым, юрыст ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў” Андрэй Бастунец зьвярнуў увагу, што ў адпаведнасьці з арт. 10 Закону аб друку, у заяве аб рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі павінна ўказвацца прыблізная (а не дакладная) тэматыка і (альбо) сьпецыялізацыя. Вынясеньне якіх-небудзь санкцыяў СМІ ў сувязі з іх зьместам Андрэй Бастунец лічыць цэнзурай, якая забароненая ў адпаведнасьці з арт. 33 Канстытуцыі РБ і арт. 4 Закону аб друку. Абскарджаньне ў судзе рашэньня Міністэрства інфармацыі не прынесла станоўчых вынікаў.

Папярэджаньні Міністэрства інфармацыі з розных нагодаў, як сродак узьдзеяньня на рэдакцыі, на працягу году шырока выкарыстоўваліся ў адносінах да незалежных выданьняў: 12 траўня пісьмовае папярэджаньне атрымала рэдакцыя недзяржаўнай газеты “Химик” (Наваполацк), 31 траўня вынесенае папярэджаньне рэдакцыі і заснавальніку недзяржаўнага гістарычна-літаратурнага часопісу “Лідскі летапісец”, 6 сьнежня — недзяржаўнай рэгіянальнай грамадзка-палітычнай газеце “Витебский курьер М” і інш. Найбольшы рэзананс атрымала вынясеньне 16 лістапада Міністэрствам інфармацыі  папярэджаньня адзінай беларускамоўнай недзяржаўнай газеце “Наша Ніва” напярэдадні яе 100-гадовага юбілею. “У выходных дадзеных нумароў газеты за лістапад не ўказваецца сапраўдны адрас рэдакцыі, што зьяўляецца парушэньнем артыкулу 26 Закону Рэспублікі Беларусь “Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі”, – паведамлялася ў папярэджаньні за подпісам намесьніка міністра інфармацыі Л. Ананіч. Разам з тым, рэдакцыя “Нашай Нівы” чатыры разы за 2006 год была вымушаная мяняць памяшканьне офісу і, адпаведна, зьмяняць юрыдычны адрас. У кожным выпадку арэндадаўцы тэрмінова без тлумачэньня прычынаў разрывалі дамовы на арэнду офісу, як толькі выдавец газеты прадастаўляў інфармацыю пра новы юрыдычны адрас у Міністэрства інфармацыі і ўпраўленьне юстыцыі Менскага гарвыканкаму. У красавіку “Наша Ніва” атрымала ліст аб адмове ў рэгістрацыі на тэрыторыі Менску за подпісам намесьніка старшыні Менскага гарвыканкаму М. Ціцянкова, у якім сьцьвярджалася, што

“разьмяшчэньне газеты “Наша Ніва” ў горадзе Менску немэтазгоднае”. Менгарвыканкам матываваў сваё рашэньне тым, што галоўны рэдактар газеты падвяргаўся адміністрацыйнаму арышту (галоўны рэдактар “НН” А. Дынько быў затрыманы 21 сакавіка, падчас пасьлявыбарчых пратэстаў, а потым асуджаны па абвінавачаньні ў “нецэнзурнай лаянцы”). Тады газета накіравала ў гарвыканкам скаргу, у якой зьвяртала ўвагу чыноўнікаў на тое, што беларускае заканадаўства ня ўтрымлівае паняцьця “мэтазгоднасьці”, а Закон аб друку і іншых СМІ не прадугледжвае ўзгадненьне разьмяшчэньня выданьняў з мясцовымі выканаўчымі ўладамі. Варта дадаць, што пасьля адмовы ў разьмяшчэньні газеты ў каталогу на падпіску і продаж выданьня праз дзяржаўныя сеткі распаўсюду, 10 красавіка Міністэрства сувязі адмовіла “Нашай Ніве” ў яе просьбе на атрыманьне ліцэнзіі на самастойнае правядзеньне падпіскі.

Распаўсюджаным сродкам эканамічнага ціску на недзяржаўныя выданьні зьяўляліся судовыя зыскі з боку дзяржаўных чыноўнікаў аб абароне гонару і годнасьці з патрабаваньнямі велізарных матэрыяльных кампенсацыяў. Так, 22 чэрвеня суд Савецкага раёну г. Менску часткова задаволіў зыск кіраўніка Дзяржаўнага мытнага камітэту Беларусі Аляксандра Шпілеўскага да выдаўца газеты “Комсомольская правда в Белоруссии” — ЗАТ “БелКП-ПРЕСС”, пастанавіўшы спагнаць з адказчыка 60 млн. рублёў у якасьці кампенсацыі маральнай шкоды. Нагодай для зыску стала памылковае апублікаваньне фотаздымку А. Шпілеўскага ў газеце ад 4 траўня. У рубрыцы “Цытата тыдня” было зьмешчанае выказваньне Мікалая Шпілеўскага (агента беларускага футбаліста Аляксандра Глеба), якое з-за тэхнічнай памылкі праілюстравалі фотаздымкам Аляксандра Шпілеўскага. Кіраўніцтва рэдакцыі адразу ж зьвязалася з прэс-службай А. Шпілеўскага і папрасіла прабачэньня, а таксама накіравала яму ліст з просьбай аб асабістай сустрэчы. У наступным нумары былі апублікаваныя пісьмовыя тлумачэньні гэтай недарэчнай сітуацыі — у той форме, у якой пажадаў іх убачыць “пакрыўджаны бок”. Канфлікт нібыта быў улагоджаны, і таму для журналістаў стала поўнай нечаканасьцю, калі праз некалькі тыдняў А. Шпілеўскі падаў зыск аб абароне гонару, годнасьці, дзелавой рэпутацыі і кампенсацыі маральнай шкоды на суму 80 млн. рублёў.

Перадузятасьць і адсутнасьць аб’ектыўнасьці па падобных справах пацьвярджаецца тым, што зыскі па абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі супраць дзяржаўных медыяў, як правіла, не задавальняліся судамі. Яскравы прыклад таму – зыск лідэра

АГП Анатоля Лябедзькі па факце распаўсюду зьняважальнай і паклёпніцай інфармацыі ў фільме “Теория заговора. Управляемый хаос”, які дэманстраваўся на Першым нацыянальным тэлеканале 20 лютага. У фільме на фоне відэаздымкаў сустрэчы лідэра АГП з грузінскімі партыйнымі лідэрамі за кадрам было сказана, што А.Лябедзька “хоча паспрабаваць вывесьці на вуліцу звар’яцелы натоўп”, а таксама яму прыпісалі фразу: “Мы не остановимся перед тысячами жертв”. Анатоль Лябедзька прасіў суд прызнаць зьвесткі, распаўсюджаныя ў фільме “Теория заговора”, не адпавядаючымі рэчаіснасьці; спагнаць з адказчыкаў грашовую кампенсацыю ў адзін мільярд рублёў. 10 красавіка суд Першамайскага раёну Менску зыск лідэра АГП адхіліў у поўным аб’ёме, палічыўшы, што гэтая інфармацыя не была зьняважальнай для А. Лябедзькі.

З цяжкасьцямі ў працы сутыкаліся і інфармацыйныя інтэрнэт-рэсурсы. Падчас значных падзеяў у краіне, асабліва напярэдадні і ў дзень выбараў прэзідэнта, найбольш наведвальныя інтэрнэт-старонкі былі заблакаваныя. 2 сакавіка, пасьля зьяўленьня інфармацыі пра зьбіцьцё кандыдата ў прэзідэнты А. Казуліна інтэрнэт-сайт “Хартыі-97” быў заблакаваны з дапамогай Dos-атакі з больш як 2500 унікальных IP-адрасоў, у выніку чаго вэб-сервер не спраўляўся з нагрузкай; паралельна вялася спроба ўзламаць сайт. У дзень выбараў, 19 сакавіка, не працаваў сайт кандыдата А. Мілінкевіча www.milinkevich.org; практычна ўвесь дзень па звычайным адрасе (www.charter97.org) быў недаступны сайт “Хартыі-97”, і нават прапанаваныя наведнікам “люстэркі” сайту ў другой палове дня перасталі адкрывацца; сайт Беларускай службы Радыё Свабода www.svaboda.org таксама падвяргаўся DOS-атакам 3 альбо 4 разы. 18-19 сакавіка не адказваў на запыты сайт газеты “Наша ніва” (www.nn.by), сайт www.zubr-belarus.com, практычна недаступныя былі інфармацыйныя рэсурсы БелаПАН: www.belapan.com и www.naviny. by. Сярод недаступных альбо цяжкадаступных у дзень выбараў сайтаў трапілі таксама ucpb.org — сайт Аб’яднанай грамадзянскай партыі, livejournal.com (папулярны ў Беларусі сервіс інтэрнэт-дзёньнікаў), leader.ru — сайт са сьпісам проксі-сервераў (ён указваўся ўсімі беларускімі грамадзка-палітычнымі сайтамі ў якасьці сьпісу проксі). Асноўнымі прычынамі адсутнасьці доступу да шэрагу сайтаў сьпецыялісты назвалі ня толькі блакаваньне IP і DOS-атакі, але і фільтрацыю трафіку, што дазваляла замарудзіць працу для беларускіх карыстальнікаў, а таксама перахопліваць паролі ад сайтаў.



2006 год быў беспрэцэдэнтным па абмежаваньнях дзейнасьці,

ціску і рэпрэсіях супраць журналістаў. Выкарыстоўваліся пракурорскія папярэджаньні за публікацыі, абмяжоўваўся доступ да інфармацыі ў адносінах да журналістаў недзяржаўных выданьняў, амаль кожная акцыя суправаджалася затрыманьнямі і арыштамі, часам – зьбіцьцём журналістаў.

17 траўня пракуратура г. Менску вынесла афіцыйнае папярэджаньне вядомай беларускай журналістцы Ірыне Халіп за шэраг артыкулаў у расейскай “Новой газете”, прысьвечаных прэзідэнцкім выбарам у Беларусі і пасьлявыбарным пратэстам. Пракуратура ўбачыла ў публікацыях парушэньне адразу двух артыкулаў Крымінальнага кодэксу: “Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь” і “Паклёп у дачыненьні да Прэзідэнта РБ” і папярэдзіла, што ў выпадку паўторнага парушэньня журналістку прыцягнуць да “вызначанай законам адказнасьці”.

Ніводзін фотакарэспандэнт беларускіх і замежных СМІ не атрымаў акрэдытацыі на працэдуру рэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты, якая адбывалася 17 лютага ў Палацы Рэспублікі Менску. Фотаздымкі рабіліся толькі карэспандэнтамі дзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва БелТА.

3 лютага журналістку недзяржаўнага выданьня “Газета Слонімская” (Гарадзенская вобласьць) Яніну Маславу не пусьцілі ў будынак мясцовага Дому культуры, дзе адбывалася вылучэньне дэлегатаў на Трэці ўсебеларускі сход.

Журналістам недзяржаўнай газеты “Мясцовы час” не дазволілі прысутнічаць падчас прыёму грамадзянаў, які ладзіў 23 жніўня ў Пінскім гарвыканкаме памочнік прэзідэнта, галоўны інсьпектар па Берасьцейскай вобласьці Уладзімір Пузырэўскі. Супрацоўнік выканкаму, які арганізоўваў сустрэчу, заявіў, што яму не падабаецца, як газета падае інфармацыю і асьвятляе работу выканкаму.

Недзяржаўнай газеце “Бобруйский курьер” было адмоўлена ў акрэдытацыі на фестывалі “Дажынкі-2006”, які праходзіў у Бабруйску напрыканцы верасьня, па прычыне “адсутнасьці ўзаемадзейнасьці газеты з уладамі”. Аб гэтым галоўнаму рэдактару газеты Анатолю Санаценку паведаміў супрацоўнік упраўленьня ідэалагічнай работы Магілёўскага аблвыканкаму Міхаіл Халамаў.

Фактарам ціску на журналістаў, а таксама медыі з мэтай паўплываць на іх рэдакцыйную палітыку, стала папярэджаньне Міністэрства юстыцыі ад 13 сакавіка аб адказнасьці “за дэстабілізацыю абстаноўкі ў краіне, спробу скампраметаваць і дэзарганізаваць нармальную працу дзяржаўных органаў, прававы парадак у краіне”.

“Падчас выбарчай кампаніі, што праходзіць цяпер у Рэспубліцы Беларусь, з падачы некаторых асобаў распаўсюджваецца паклёпніцкая інфармацыя, дапускаюцца зьневажальныя выпады ў бок дзейнага кіраўніка дзяржавы, вычвараецца яго роля ва ўмацаваньні беларускай дзяржаўнасьці, сацыяльна-эканамічных дасягненьнях рэспублікі, будаўніцтве Саюзнай дзяржавы з Расіяй. Ставіцца пад сумнеў законнасьць удзелу А.Г. Лукашэнкі ў выбарчай кампаніі ў якасьці кандыдата ў Прэзідэнты. Паклёпніцкія і зьневажальныя зьвесткі, якія распаўсюджваюцца, ня маюць нічога агульнага з канстытуцыйным правам грамадзянаў на атрыманьне праўдзівай інфармацыі, свабоду меркаваньняў і перакананьняў... Адказнасьць асобаў, сродкаў масавай інфармацыі за распальваньне ў рэспубліцы антыдзяржаўнай істэрыі, спробу дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне ляжыць на гэтых асобах і перасьледуецца законам”, — сказана ў заяве Мінюсту.

Найбольшыя рэпрэсіі выкарыстоўваліся супраць журналістаў пры асьвятленьні імі ходу прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. 2 сакавіка падчас інцыдэнту з кандыдатам у прэзідэнты А. Казуліным ад прадстаўнікоў праваахоўных органаў пацярпелі і былі затрыманыя шэраг журналістаў беларускіх і замежных СМІ. Карэспандэнт агенцтва “Reuters”, расейскі грамадзянін Дзьмітрый Мадорскі быў вымушаны зьвярнуцца па медыцынскую дапамогу, пацярпеў журналіст агенцтва “БелаПАН” Сяргей Пульша. Фотажурналісты Сяргей Грыц (“Associated Press”), Васіль Фядосенка (“Reuters”), Юлія Дарашкевіч (“Наша ніва”) былі затрыманыя каля Кастрычніцкага РУУС, але ў хуткім часе адпушчаныя. Былі затрыманыя карэспандэнт “Комсомольской правды в Белоруссии” Алег Улевіч, журналіст “Белгазеты” Дзьмітрый Брушко, а таксама супрацоўнік прэс-службы кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандра Казуліна журналіст Андрэй Максімаў.

Пракуратура адмовілася ўзбуджаць крымінальную справу па дадзеным факце парушэньня правоў журналістаў работнікамі праваахоўных органаў “у сувязі з адсутнасьцю ў дзеяньнях супрацоўнікаў СПБТ “Алмаз”... складу злачынства”. Хаця пракуратура не адмаўляла, што супрацоўнікі правапарадку ўмешваліся ў працу журналістаў, аднак гэтыя дзеяньні апраўдала тым, што “з мэтай недапушчэньня масавых беспарадкаў і пранікненьня агрэсіўна настроеных людзей у будынак РУУС” міліцыя вымушаная была ўвесьці план “Шчыт”, а згодна з арт.16 п.19 ч.1 Закону “Аб міліцыі”, ахоўнікам парадку “прадастаўляецца права часова абмяжоўваць

рух пешаходаў на вуліцах і дарогах, а таксама доступ грамадзянаў на асобныя ўчасткі мясцовасьці і аб’екты, абавязваць іх пакінуць месца для забесьпячэньня асабістай і грамадзкай бясьпекі”. Пры гэтым ігнараваны арт. 39 Закону “Аб друку і іншых СМІ”, які дае журналістам права прысутнічаць у раёнах стыхійных бедзтваў, аварыяў і катастрофаў, ваенных дзеяньняў, мясцовасьцях, дзе абвешчанае надзвычайнае становішча, на мітынгах, дэманстрацыях, на месцы іншых грамадзка значных падзеяў і перадаваць інфармацыю аб іх.

Пры затрыманьні 2 сакавіка быў жорстка зьбіты карэспандэнт “Комсомольской правды в Белоруссии” Алег Улевіч, які з дыягназам “закрытая чэрапна-мазгавая траўма і пералом касьцей носу” быў дастаўлены ў 9-ю клінічную бальніцу. Пры гэтым, па сьведчаньні журналіста, супрацоўнікі міліцыі пачалі біць яго якраз тады, калі ён прад’явіў журналісцкае пасьведчаньне. У канцы сакавіка Маскоўскі РУУС г. Менску ўзбудзіў крымінальную справу ў дачыненьні да “нявысьветленай асобы”, што нанесла цялесныя пашкоджаньні Алегу Улевічу. Крымінальная справа некалькі разоў на працягу году прыпынялася і зноў аднаўлялася. 11 жніўня журналіст атрымаў ліст за подпісам супрацоўніка Упраўленьня дазнаньня папярэдняга расьсьледаваньня (УДПР) ГУУС Менгарвыканкаму А.Бортнікава з паведамленьнем, што папярэдняе расьсьледаваньне па справе спыненае “ў сувязі з неўстанаўленьнем асобы, якую належыць прыцягнуць да адказнасьці ў якасьці абвінавачанага”. Такім чынам, нягледзячы на тое, што сьведкамі інцыдэнту былі каля 30 супрацоўнікаў міліцыі, трое з якіх вялі аператыўныя відэаздымкі, і каля 20 грамадзянаў, сьледчыя дзяржаўныя органы адмовіліся прыцягнуць да адказнасьці злачынцаў у пагонах.

Разам з тым, шырока асьвятляўся ў дзяржаўных СМІ з негатыўнымі каментарамі факт закіданьня сьнежкамі здымачнай групы БТ падчас акцыі, прысьвечанай Дню Волі ў Менску 25 сакавіка. Была ўзбуджаная крымінальная справа, вынікі якой так і невядомыя, магчыма, таму, што “шматлікія траўмы”, нанесеныя журналістам БТ так і не былі выяўленыя судмедэксьпертызай.

Гарантыяў бясьпекі для прадстаўнікоў прэсы не абяцалі сілавікі падчас асьвятленьня вулічных падзеяў 19 сакавіка ў цэнтры Менску. Міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў заявіў, што ўсе супрацоўнікі МУС папярэджаныя адносна забароны на ўжываньне сілы ў дачыненьні да журналістаў, але, разам з тым, стопрацэнтнай гарантыі недатыкальнасьці прэсы не абяцаў.

З 14 да 27 сакавіка, падчас асьвятленьня падзеяў, зьвязаных

з прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі, па дадзеных ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў, быў затрыманы і асуджаны 41 журналіст – як беларускіх, так і замежных медыяў:

1. Александровіч Вадзім (“Белорусы и рынок”, Менск). Асуджаны на 10 сутак арышту 22 сакавіка.

2. Банцар Ігар (“Glos znad Niemna na uchodzstwie”, Гародня). Асуджаны на 10 сутак арышту 21 сакавіка.

3. Ваніна Таццяна (сябра БАЖ). Арыштаваная на 10 сутак 27 сакавіка. Затрыманая ўначы з 23 на 24 на Кастрычніцкай плошчы.

4. Васількоў Віталь (“Нямецкая хваля”, Магілёў). Арыштаваны на 7 сутак 23 сакавіка.

5. Гердзій Мікалай (“Вольны горад”, Крычаў). Асуджаны на 2 сутак 18 сакавіка.

6. Дземчанка Вольга (Газета “Однако”, Менск). Штраф у памеры 20 базавых велічыняў 21 сакавіка.

7. Дынько Андрэй (“Наша ніва”, Менск). Асуджаны на 10 сутак арышту 22 сакавіка.

8. Казначэеў Вадзім (вольны журналіст). Асуджаны на 10 сутак 27 сакавіка. Затрыманы ўначы з 23 на 24 на Кастрычніцкай плошчы.

9. Кастэнка Дар’я (вольная журналістка, супрацоўнічала з часопісам “Асвета і адукацыя”, аўтарка “Сакавіцкіх дзёньнікаў” у LiveJournal (http://bullochka.livejournal.com/186406.html). Асуджаная на 10 сутак арышту 27 сакавіка.

10. Лаўроўская Ірына (“Брескткий курьер”). Аштрафаваная на 2 базавыя велічыні 23 сакавіка.

11. Лукашэвіч Алена (вольны журналіст). 23 сакавіка аштрафаваная судом на 2 базавыя велічыні.

12. Лява Арцём (штатны супрацоўнік “Нашай нівы”, фотарэдактар). Арыштаваны на 15 сутак 24 сакавіка.

13. Мажэйка Павел (прэс-сакратар А. Мілінкевіча). Затрыманы 25 сакавіка ў Меінску. У той жа дзень адпушчаны.

14. Няроўны Сяргей (“Вольны горад”, Крычаў). Асуджаны на 3 сутак 18 сакавіка.

15. Пачобут Андрэй (“Magazyn polski na uchodzstwie”, Гародня). Асуджаны на 10 сутак арышту 14 сакавіка. Выйшаў на волю 24 сакавіка. У той жа дзень была спроба паўторнага затрыманьня.

16. Пісальнік Анджэй (“Glos znad Niemna na uchodzstwie”, Гародня). Асуджаны на 12 сутак арышту 21 сакавіка. Затрыманьне адбылося ў дзень выхаду журналіста на волю пасьля адбываньня пяці сутак папярэдняга адміністрацыйнага арышту (суд быў 15 сакавіка).

17. Радс Аляксей (інтэрнэт-рэсурс forum.grodno.net, Гародня). Асуджаны на 10 сутак арышту 21 сакавіка.

18. Роман Іван (Пазаштатны карэспандэнт “Салідарнасці”, Гародня). Асуджаны на 13 сутак арышту 23 сакавіка “за хуліганства”. 20 сакавіка быў囗 аштрафаваны на 2 базавыя велічыні судом у Лідзе.

19. Салаш Сяргей (журналіст барысаўскай газеты “Offside”, актывіст штабу А. Мілінкевіча). Асуджаны на 13 сутак арышту 23 сакавіка.

20. Салей Аляксей (інтэрнэт-сайт “Пагоня”, Гародня). Асуджаны на 6 сутак арышту 27 сакавіка.

21. Сьнітко Тацяна (пазаштатны карэспандэнт “Нашай нівы”, карэспандэнт расейскага праваабарончага інфармацыйнага агенцтва “ПРИМА-News”). Затрыманая ўначы з 23 на 24 на Кастрычніцкай плошчы. 27 сакавіка аштрафаваная на 30 базавых велічыняў.

22. Тарас Антон (вольны журналіст). 23 сакавіка арыштаваны на 11 сутак.

23. Шантаровіч Андрэй (“Местная газета”, Ваўкавыск). Асуджаны на 3 сутак 18 сакавіка.

24. Шчукін Валеры (“Народная воля”, Віцебск). Затрыманы ўвечары 24 сакавіка. 27 сакавіка адпушчаны на волю да суда. За дзень да гэтага, 23 сакавіка, выйшаў на волю пасьля 7 сутак арышту.

25. Шэін Аляксей (прэс-група А. Мілінкевіча, Менск). Асуджаны на 5 сутак арышту 20 сакавіка.

26. Чавусаў Юрый (журналіст інтэрнэт-парталу Асамблеі няўрадавых арганізацыяў, аўтар часопісаў “Палітычная сфера”, “ARCHE”). Асуджаны на 10 сутак арышту 21 сакавіка.

27. Чарняўка Ірына (інтэрнэт-рэсурс www.euramost.org, Гародня). Затрыманая міліцыяй увечары 24 сакавіка па дарозе на вакзал. Адпушчаная ў той жа дзень.

28. Ярашук Віктар (“Мясцовы час”, Пінск). Асуджаны на 6 сутак 23 сакавіка; 15 сакавіка таксама быў арыштаваны на 5 сутак.

Замежныя журналісты:

29. Гіоргабіані Ніно (Грамадзкае тэлебачаньне Грузіі). Асуджаная на 5 сутак арышту 27 сакавіка.

30. Глезін Эдуард (“Правое дело”, Расія). Асуджаны на 15 сутак арышту 27 сакавіка.

31. Гурневіч Дзьмітрый (Пазаштатны карэспандэнт Радыё “Polonia”, Польшча). Асуджаны на 10 сутак 21 сакавіка.

32. Калісан Алан (“Wall street journal”, ЗША). Пацярпеў пад час акцыі 25 сакавіка ў Менску.

33. Казлоўскі Алег (“Правое дело”, Расія). Асуджаны на 15 сутак арышту 27 сакавіка.

34. Лагідзэ Георгій (Грамадзкае тэлебачаньне Грузіі). Асуджаны на 15 сутак арышту 27 сакавіка.

35. Левуа Фрэдэрык (канадзкі журналіст, працаваў без акрэдытацыі). Асуджаны на 15 сутак арышту 24 сакавіка.

36. Любка Андрэй (“Карпацкі голас”, Украіна). Асуджаны на 15 сутак 22 сакавіка.

37. Мілё Ларэн (журналістка французскай газеты “Ліберасьён”). Была затрыманая на Кастрычніцкай плошчы ўвечары 24 сакавіка, але пасьля адпушчаная.

38. Падрабінек Аляксандр (галоўны рэдактар расейскага інфармацыйнага агенцтва “Прима-news”). Асуджаны на 15 сутак 27 сакавіка.

39. Самаліньска Вераніка (“Gazeta Wyborcza”, Польшча). Асуджаная на 10 сутак арышту 27 сакавіка.

40. Шарамет Павел (“Первый канал”, Расія). Затрыманы 25 сакавіка ў Менску. З вечара 25 сакавіка да 13.00 27 сакавіка ўтрымліваўся ў сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку. 27 сакавіка адпушчаны на волю з умовай – пакінуць Беларусь на працягу 24 гадзінаў.

Апраўданыя:

41. Серабро Сяржук (“Витебский курьер”, Віцебск) – толькі яго суд апраўдаў, прызнаўшы, што журналіст выконваў прафесійныя абавязкі.

Пракуратура г. Менску і ГУУС Менгарвыканкаму не палічылі, што былі парушаныя правы журналістаў, што апынуліся за кратамі ў канцы сакавіка, пра што яны накіравалі адпаведныя адказы на заявы ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”.

Затрыманьням падвяргаліся падчас ажыцьцяўленьня сваіх прафесійных абавязкаў журналісты на працягу ўсяго году. 4 траўня Наталя Валакіда (прэс-служба АГП) і Тацяна Сьнітко (“Наша ніва”, “Прима-news”) былі затрыманыя каля будынку суда Першамайскага раёну г. Менску, дзе праходзілі ў гэты час слуханьні па справе моладзевага лідэра Артура Фінькевіча. Прыкладна паўгадзіны журналісткі правялі ў Першамайскім РУУС, пасьля чаго іх адпусьцілі.

31 жніўня ў Бабруйску міліцыянты затрымалі і адвезьлі ў пастарунак 11 журналістаў, якія назіралі за акцыяй пратэсту дэпутата мясцовага гарсавету і грамадзкага актывіста Аляксандра Чыгіра. Іх каля трох гадзінаў пратрымалі ў Гарадзкім аддзеле міліцыі, дзе праверылі дакументы і з кожным намесьнік начальніка ГАУС Сяргей Глушко правёў “прафілактычную” размову.

26 кастрычніка журналістка Радыё Свабода Галіна Абакунчык

і карэспандэнт газеты “Белорусы и рынок” Ксенія Авімава былі затрыманыя падчас асьвятленьня спробы наладзіць пікет паблізу будынку Адміністрацыі Прэзідэнта барысаўскім актывістам Алесем Абрамовічам. Затрыманьне праводзілі супрацоўнікі службы аховы Прэзідэнта, паводзілі сябе груба, спрабавалі адабраць журналісцкую тэхніку. Затрыманых журналістаў і арганізатара пікетаваньня даставілі ў разьмешчаны паблізу гарадзкі аддзел міліцыі, пасьля чаго журналісты былі адпучшаныя.

Чацьвёра фотакарэспандэнтаў былі затрыманыя ўвечары 16 лістапада падчас разгону акцыі да Дня беларускай салідарнасьці, якая ладзілася на чыгуначным вакзале. Юлію Дарашкевіч (газета “Наша Ніва”), Сергея Грыца (агенцтва “Асашыэйтэд Прэс”) Васіля Фядосенку (агенцтва “Рэйтэр”) і Аляксея Мацюшкова (тыднёвік “Обозреватель”) міліцыянты правялі ў аддзяленьне міліцыі чыгуначнага вакзалу, праверылі дакументы і адпусьцілі, патлумачыўшы, што рабіць фотаздымкі на тэрыторыі вакзалу без сьпецыяльнага дазволу забараняецца.

Абмежаваньням прафесійнай дзейнасьці, адмовам у допуску на тэрыторыю Беларусі, затрыманьням і арыштам падвяргаліся прадстаўнікі замежных СМІ. 27 студзеня на беларуска-ўкраінскай мяжы мытнікі забралі ў здымачнай групы ўкраінскага тэлеканалу “Інтэр” відэакасеты па падазрэньні ў наяўнасьці на іх матэрыялаў “антыдзяржаўнага характару” (у адзьнятых матэрыялах ішла гаворка пра падрыхтоўку да прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі).

19 лютага карэспандэнта польскай “Gazety Wyborczej” Вацлава Радзівіновіча не ўпусьцілі ў Беларусь. Супрацоўнікі беларускай памежнай службы паведамілі яму, што ён знаходзіцца ў ліку асобаў, якія ня маюць права ўязджаць на тэрыторыю краіны, нягледзячы на тое, што Радзівіновіч меў гадавую візу і дзеючую акрэдытацыю беларускага МЗС.

12 сакавіка ў Менску падчас наўпроставага ўключэньня з месца сустрэчы з выбаршчыкамі кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча міліцыя на некалькі гадзінаў затрымала Ганну Гаражэнку, журналістку ўкраінскага “5 каналу”. Яе вызвалілі толькі пасьля ўмяшальніцтва ўкраінскага консула, хаця Г.Гаражэнка была афіцыйна акрэдытаваная пры беларускім МЗС. Падчас затрыманьня былі пашкоджаныя камера “5 каналу” і мікрафон.

10 лістапада Міністэрства замежных справаў Беларусі без тлумачэньня прычынаў адмовіла ў выдачы ўязных візаў замежным журналістам: кіраўніку беларускай рэдакцыі радыё “Нямецкая хваля” Карнэліі Рабітц і нямецкаму журналісту Інгу Петцу.

28 лістапада падчас юбілейнага саміту СНД у прэс-цэнтр, які быў разьмешчаны ў Нацыянальнай бібліятэцы, не былі дапушчаныя тры расейскія журналісты: карэспандэнт “Московского комсомольца” Наталя Галімава, фотажурналісты “Коммерсанта” Дзьмітрый Азараў і “Московского комсомольца” Аляксандр Астаф’еў. За некалькі гадзінаў да пачатку мерапрыемства ім паведамілі, што іх прозьвішчы выкрасьленыя са сьпісу акрэдытаваных журналістаў. Прэс-сакратар прэзідэнта Беларусі Павел Лёгкі назваў асноўнай прычынай  адмовы журналістам “абразу кіраўніка беларускай дзяржавы і сістэматычную зьнявагу Беларусі”. Некалькі дзясяткаў расейскіх журналістаў, якія мелі акрэдытацыю на саміце, у знак салідарнасьці з калегамі адмовіліся працягваць працу ў прэс-цэнтры.

Заклапочанасьць сітуацыяй са свабодай выказваньня меркаваньняў у Беларусі, правам на незалежную інфармацыю, перасьледам журналістаў на працягу году неаднаразова выказвалі міжнародныя журналісцкія арганізацыі ўсяго сьвету. 2 траўня “Камітэт абароны журналістаў” (CPJ, Нью-Ёрк) у сваім дакладзе адзначыў: “Большасьць вяшчальных і друкаваных медыяў у Беларусі падпарадкоўваюцца дзяржаве і нястрыманыя ў сваіх усхваленьнях А. Лукашэнкі. Намінальна незалежныя радыё- і тэлестанцыі пазьбягаюць кранаць вострапалітычныя тэмы. Дзяржава закрыла дзесяткі незалежных газетаў за апошнія гады, і тыя нешматлікія, што засталіся, падвяргаюцца шалёнаму ціску з боку ўладаў”. Арганізацыя з трывогай адзначыла таксама, што некалькі дзесяткаў беларускіх і замежных журналістаў былі незаконна зьняволеныя пад час кампаніі выбараў прэзідэнта.

У Рэзалюцыі па Беларусі, прынятай 19 сьнежня, Генеральная Асамблея ААН выказала глыбокую занепакоенасьць “з нагоды таго, што не спыняюцца ціск і затрыманьні беларускіх журналістаў, якія распавядаюць пра дэманстрацыі на месцах; з нагоды пастаянна паступаючых паведамленьняў пра ціск і закрыцьцё (…) незалежных сродкаў масавай інфармацыі”. Генеральная Асамблея настойліва заклікала ўрад Беларусі “спыніць палітычна матываваны судовы перасьлед, ціск і запалохваньне (...) незалежных сродкаў масавай інфармацыі; паважаць права на свабоду слова; правесьці належнае расьсьледаваньне і прыцягнуць да адказнасьці асобаў, вінаватых у дрэнным абыходжаньні з мясцовымі і замежнымі журналістамі і іх арышце ў сувязі з выбарамі 19 сакавіка 2006 году і дэманстрацыямі пасьля іх завяршэньня”.

У пасланьні народу Беларусі ад 22 кастрычніка Еўрапейскі Саюз адным з патрабаваньняў да ўладаў Беларусі называе “павагу правоў грамадзянаў на незалежную інфармацыю, а таксама на свабоду слова, у прыватнасьці, дазволіўшы журналістам працаваць бяз ціску ці перасьледу, не зачыняючы газетаў і не перашкаджаючы іх распаўсюду”. Еўрапейскі Саюз выказаў гатоўнасьць працаваць над тым, каб прадастаўляць грамадзянам Беларусі доступ да незалежнай інфармацыі, каб даць ім магчымасьць пачуць усе бакі аргументаў перад прыняцьцем уласных рашэньняў. “ЕС будзе працягваць падтрымліваць друкаваную прэсу і вяшчаньне незалежных тэле- і радыёпраграмаў у Беларусі”, — сказана ў пасланьні.

## 6. Перасьлед палітычных апанентаў і іншадумцаў, навязваньне дзяржаўнай ідэалогіі

Грамадзка-палітычная сістэма, пабудаваня ў краіне, выключае сапраўдны плюралізм меркаваньняў. З аднаго боку, у краіне існуюць зарэгістраваныя палітычныя партыі, грамадзкія арганізацыі ды іншыя аб’яднаньні грамадзянаў. З другога боку, на працягу апошніх гадоў, і асабліва ў 2006 годзе, магчымасьці для свабоды грамадзкіх і палітычных думак і дзеяньняў у краіне планамерна звужаліся. Узмацненьне парушэньняў права на плюралізм меркаваньняў у краіне адбывалася на фоне веснавой выбарчай прэзідэнцкай кампаніі.

Працягвалі падвяргацца рэпрэсіям актывісты і лідэры палітычных партыяў. На працягу году за ўдзел у грамадзка-палітычнай дзейнасьці былі затрыманыя, арыштаваныя, звольненыя з працы, адчулі на сабе іншыя віды рэпрэсіяў з боку ўладаў сотні сяброў палітычных партыяў. Некаторыя з іх патрапілі ў зьняволеньне на працяглы тэрмін. Найбольш красамоўны прыклад зьвязаны са зьняволеньнем на пяць з паловай гадоў кандыдата ў прэзідэнты, старшыні БСДП (Грамада) Аляксандра Казуліна. Паказальны таксама арышт 27 красавіка на 15 сутак зьняволеньня практычна ўсіх буйнейшых палітычных лідэраў краіны: кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча, старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі, старшыні ліквідаванай уладамі ў 2004 годзе Беларускай Партыі працы Аляксандра Бухвостава, і на 14 сутак — старшыні Партыі камуністаў Беларускай Сяргея Калякіна. 26-га красавіка пры загадкавых абставінах невядомымі людзьмі быў затрыманы і зьбіты старшыня Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька.

Можна канстатаваць, што ўсё больш пашыраюцца ваяўнічыя і

правакацыйныя дзеяньні беларускіх уладаў у дачыненьні да палітычных апанентаў. Так, у 2006 годзе старшыня “Саюзу палякаў на Беларусі”, прадстаўніца польскай нацыянальнай меншасьці Анжаліка Борыс падазравалася ў правозе праз мяжу наркотыкаў, моладзевы актывіст з Жодзіна, сябра Партыі БНФ Павел Красоўскі – у арганізацыі выбухаў, згвалтаваньнях і забойствах, грамадзкі актывіст з Баранавічаў, сябра БСДП(Г) Віктар Сырыца – у захоўваньні зброі, грамадзкі актывіст з Жодзіна Аляксандр Камароўскі – у вырабе фальшывай валюты. Усе гэтыя абвінавачаньні мелі палітычны падтэкст і былі накіраваныя на абмежаваньне актыўнасьці палітычных і грамадзкіх лідэраў.

Уладамі, з дапамогаю шэрагу рэпрэсіўных законаў і практычных пазазаконных мерапрыемстваў, была зьведзеная да мінімуму роля партыяў падчас прэзідэнцкай кампаніі ўвесну 2006 году і кампаніі выбараў ў мясцовыя Саветы ўвосень-узімку 2006 году. Больш за тое, сябры іх не былі дапушчаныя ў выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў і такім чынам партыі, як палітычныя суб’екты, фактычна былі адхіленыя ад выбарчага працэсу. Так, згодна з афіцыйнай статыстыкай, у склад участковых выбарчых камісіяў па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў увосень 2006 году ўвайшло 70 877 асобаў. Сярод іх вылучаных палітычнымі партыямі – усяго 113 асобаў, а ад апазіцыйных партыяў толькі адзін прадстаўнік АГП стаў сябрам участковай камісіі.

Відавочна, што беларускія ўлады адназначна пайшлі на замацаваньне ў краіне грамадзка-палітычнай сістэмы без істотнага ўдзелу палітычных партыяў, роля іх у Беларусі ўсё больш зводзіцца да дэкаратыўнай. Палітычныя партыі жорстка абмежаваныя ў сваіх дзеяньнях, пастаўленыя ў неспрыяльныя ўмовы, ня маюць рэальных магчымасьцяў уплываць на грамадзка-палітычную сітуацыю ў краіне і знаходзяцца па-за існуючай рэальнай палітычнай сістэмай беларускай улады.

У падобнай сітуацыі знаходзяцца таксама беларускія няўрадавыя арганізацыі, становішча якіх у краіне зьяўляецца яшчэ адным індыкатарам адсутнасьці плюралізму ў беларускім грамадзтве. Працягваўся працэс ліквідацыі няўрадавых арганізацыяў – улады спрабавалі такім чынам пазбавіцца ад рэальнага існаваньня сацыяльнай разнастайнасьці ў беларускім грамадзтве. У першую чаргу з “грамадзкай сцэны” краіны прыбіраліся няўрадавыя арганізацыі, якія складалі канкурэнцыю ў сваіх сферах дзейнасьці дзяржаўным структурам і так званым “дзяржаўным грамадзкім аб’яднаньням”.

Падобным чынам улады спрабавалі вырашыць “праблему”

з “Саюзам беларускіх пісьменьнікаў”, які на пачатку 2006 году быў канчаткова пазбаўлены памяшканьняў у Доме літаратараў, а ў сакавіку 2006 году супраць СБП Міністэрствам юстыцыі быў вылучаны зыск аб ліквідацыі арганізацыі. Мінюст абвінавачваў СПБ у адсутнасьці арыгіналу статуту арганізацыі, выкарыстаньні незарэгістраванай сімволікі на шыльдзе пры ўваходзе ў Дом літаратара і няправільна аформленай пячатцы арганізацыі. Хаця зразумела, што асноўнай прычынай зыску была прынцыповая пазіцыя сяброў “Саюзу беларускіх пісьменьнікаў” у дачыненьні да антынацыянальнай, русіфікатарскай палітыкі беларускіх уладаў, занядбаньня беларускай культуры і беларускага школьніцтва. Пэўную адмоўную ролю ў гэтай гісторыі адыграў і створаны пры дапамозе ўладаў альтэрнатыўны “Саюз пісьменьнікаў Беларусі”, які заняў падкрэсьлена лаяльную пазіцыю да існуючай улады.

Беларускія ўлады рознымі спосабамі сьвядома падтрымліваюць у краіне атмасферу страху і боязі, выкарыстоўваючы розныя пазазаконныя прыёмы і захады, што карэнным чынам супярэчыць разьвіцьцю плюралізму меркаваньняў у беларускім грамадзтве. Сюды трэба аднесьці і дзейнасьць сьпецслужбаў, найперш КДБ, асноўная актыўнасьць якога накіраваная на стрыманьне грамадзка-палітычнай актыўнасьці моладзі праз запалохваньне актывістаў і спробы вярбоўкі сяброў моладзевых арганізацыяў.

Адной з распаўсюджаных формаў стасункаў з палітычнай і грамадзкай апазіцыяй зьяўляецца адміністрацыйны перасьлед грамадзкіх актывістаў з мэтай спыненьня іхняй актыўнасьці. У 2006 годзе набыло масавы характар асуджэньне палітычных апанентаў у адміністрацыйным парадку да арышту на тэрмін да 15 сутак па ілжывых абвінавачаньнях з боку супрацоўнікаў міліцыі альбо іх памагатых.

18 верасьня ў горадзе Салігорску моладзевы актывіст Алег Борын, па сьведчаньні міліцыянта А.Шолахава “ў 17.00 быў выкліканы на гутарку, аднак ва ўказаны час не зьявіўся ў апорны пункт. Шолахаў сумесна з калегам Кецко сустрэлі парушальніка ў 17 гадзінаў 10 хвілінаў каля ганку крамы. Пры гэтым А.Борын выражаўся нецэнзурным матам, на заўвагі не рэагаваў. Парушальнік быў затрыманы і дастаўлены ў Салігорскі ГРАУС”. Нічога дзіўнага, што другі грамадзкі актывіст з Салігорску Аляксей Валабуеў, сябра Борына, па сьведчаньнях міліцыянта В.Прызбы, у гэты самы час “размаўляў па тэлефоне, пры гэтым парушальнік гучна выражаўся нецэнзурным матам. Яны (міліцыянты В.Прызба і Д. Юшкевіч) падышлі да А.Валабуева,

прадставіліся, паказалі пасьведчаньні, папрасілі прайсьці з імі, але ён адмаўляўся, упіраўся і працягваў размаўляць па тэлефоне. Парушальніку накінулі кайданкі і даставілі ў Салігорскі ГРАУС". У выніку салігорскія актывісты былі аштрафаваныя.

17 жніўня быў асуджаны на пяць сутак арышту Кірыла Паражынскі, які "ў 20 гадзінаў у в.Бацэвічы па вул. Ленінскай (Клічаўскі раён Магілёўскай вобласьці) сабраў групу асобаў з 4-х чалавек, устанавіў на праезнай частцы белы сьцяг з надпісам "16", сьвечкі ў колькасьці 10 штук, два маленькія сьцягі з бела-чырвоным колерам, і праводзіў акцыю "Дзень Салідарнасьці" ці несанкцыянаваны пікет. Віну прызнаў".

Апагеем масавых рэпрэсіяў у 2006 годзе трэба лічыць затрыманьні напярэдадні і адразу пасьля прэзідэнцкіх выбараў 19 сакавіка, калі па краіне  былі арыштаваныя і асуджаныя больш за тысячу асобаў і з іх – больш за 500 асобаў уначы з 23 на 24 сакавіка падчас ліквідацыі намётавага гарадка на Кастрычніцкай плошчы ў Менску, які паўстаў у знак пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў. Усяго колькасьць зафіксаваных праваабаронцамі затрыманых і асуджаных да адміністрацыйнага арышту ў перыяд кампаніі па выбарах прэзідэнта перавысіла 1000 чалавек, прычым значная колькасьць гэтых людзей былі  асуджаныя па хлусьлівых абвінавачаньнях з боку сьведкаў-міліцыянтаў.

Да інструментаў запалохваньня, якія выкарыстоўваюць беларускія ўлады, адносіцца і прымяненьне фізічнага гвалту, катаваньні палітычных апанентаў. Дастаткова згадаць выпадак, які адбыўся ў Менску 2 сакавіка, калі адзін з кандыдатаў у прэзідэнты Аляксандр Казулін, а таксама актывісты ягонага выбарчага штабу і журналісты былі зьбітыя супрацоўнікамі сьпецпадразьдзяленьняў МУС. Апранутыя ў цывільнае сьпецназаўцы пад камандаваньнем палкоўніка Дзьмітрыя Паўлічэнкі, падчас спробы А.Казуліна зарэгістравацца на Усебеларускі сход, павалілі апазіцыйнага палітыка на падлогу і зьбівалі нагамі. Пры затрыманьні актывісту каманды А.Казуліна Івану Лабачову зламалі скабы, Уладзіміру Севярыну разьбілі галаву; былі зьбітыя журналісты: тэлеаператар агенства "Reuters" Дзьмітры Мадорскі, фотакарэспандэнт газеты "Комсомольская правда" в Белоруссии" Алег Улевіч, якому пры арышце зламалі нос. Зразумела, што акцыі гвалту над палітычнымі апанентамі спланаваныя ў калідорах беларускай улады.

Дзясяткі студэнтаў за палітычныя перакананьні былі выключаныя











***Менск, вясна 2006 году – перад выбарамі прэзідэнта краіны...***






*Менск, 19 сакавіка 2006 году.*

*Першыя намёты на «майдане»...*

*Будзем стаяць да апошняга...*








*Менск,
20-23 сакавіка,
пляц
Каліноўскага:
«Верым. Можам.
Пераможам!».*








*На падыходзе да пляцу...*



*Пляц Каліноўскага: дзень і ноч.*





*Арыштаваныя «каліноўцы».*



*Сьпецтэхніка, да выбараў...*










*Бацькі некалькі дзён ня ведалі, дзе іх дзеці...*








*Менск,*
*25 сакавіка*
*2006 году.*










*Менск,*
*25 сакавіка*
*2006 году.*







*Яшчэ была надзея на мірны зыход...*











*Дзесяткі зьбітых і арыштаваных – вынік дэманстрацыі 25 сакавіка.*



*Аляксандр Казулін прыйшоў рэгістравацца на лукашэнкаўскі «сход».*



*«Рэгістрацыя»...*



***Адзін з арганізатараў перамогі Лукашэнкі – Дзьмітрый Паўлічэнка.***



***«Невядомыя ў цывільным» страляюць па машыне кіроўцы А.Казуліна.***



***Сьпецназ не пускае А.Мілінкевіча на сустрэчу з выбаршчыкамі.***



*Аляксандр Шалайка
і Эніра Браніцкая
на прэс-канферэнцыі
пасьля вызваленьня.*



*Зьміцер Дашкевіч за кратамі...*




*Паўла Севярынца на «хіміі» наведаў Зьміцер Дашкевіч.*



*Андрэй Клімаў выйшаў на волю,*
*а лідэр БНФ Вінцук Вячорка ў зале*
*суда зьбіраецца «на суткі».*






*Лідэр апазіцыі*
*Аляксандр Мілінкевіч – арыштаваны...*



*Мікола Статкевіч на «хіміі» ў Баранавічах.*



*Палітзьняволены*
*Сяргей Скрабец*
*страціў у турме больш*
*за 20 кілаграмаў...*








*У 2006 годзе асаблівую папулярнасьць набылі моладзевыя флэш-мобы.*











***Арышты...***
***Арышты...***
***Арышты...***












*«Дзяды»-2006.*

*«Чарнобыльскі шлях»-2006.*

*На акцыях салідарнасьці.*







*Рэдакцыя газеты «Народная воля» вымушаная сама распаўсюджваць сваё выданьне.*



*Высяленьне рэдакцыі газеты «Витебский курьер».*







*Акцыя салідарнасьці з газетай «Наша Ніва».*




*Штомесяц 16 чысла адбываліся Дні Салідарнасьці.*













*Улады высяляюць пісьменьнікаў з іх Дому. Партрэтам класікаў там таксама няма месца.*







*Пастар царквы «Новае жыцьцё» Вячаслаў Ганчарэнка – лаўрэат прэміі «За асабістую мужнасьць».*

*Галадоўка вернікаў царквы «Новае жыцьцё».*










*Праваабаронцы на акцыі салідарнасьці з палітзьняволенымі.*



*Праваабаронца Алесь Бяляцкі.*



*«Людзі ў цывільным» зьбіваюць праваабаронцу Валянціна Стэфановіча.*



*Праваабаронца з Берасьця Уладзімір Вялічкін.*

*Імгненьні 2006-га...*











з навучальных установаў. З Баранавіцкага дзяржаўнага ўнівэрсітэту (рэктар Васіль Качурка) быў выключаны студэнт Сяржук Марчык, з Менскага дзяржаўнага педагагічнага ўнівэрсітэту (рэктар Пётр Кухарчык) – выключаныя больш за дзесяць моладзевых актывістаў, з Менскага дзяржаўнага эканамічнага універсітэту (рэктар Уладзімір Шымаў) – выключаная актывістка міжнароднага студэнцкага руху Тацяна Хома, з Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны (рэктар А.Етусевіч) – выключаная моладзевая актывістка Любоў Кучынская, з Гарадзенскага дзяржаўнага універсітэту (рэктар Яўген Роўба) – выключаны Яўген Скрабутан, з Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі за ўдзел у мясцовых выбарах – адлічаныя студэнты Аляксандар Страчук і Дзяніс Сарокін. Прычым, трэба адзначыць, вялікую ролю ў "зачыстцы" сярод студэнтаў адыгралі прадстаўнікі рэгіянальнай ідэалагічнай вертыкалі і намесьнікі рэктараў універсітэтаў па ідэалогіі, у кола абавязкаў якіх уваходзіць адсочваньне палітычнай "нядобранадзейнасьці" сярод беларускіх студэнтаў.

Такой самай чысткай за палітычныя перакананьні займаліся некаторыя кіраўнікі і ідэолагі дзяржаўных установаў і прадпрыемстваў. 23 сакавіка з пасады дацэнта кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўнівэрсітэту быў звольнены дацэнт Юры Бачышча за тое, што ён нібыта распаўсюджваў сярод студэнтаў "відэаматэрыялы, у якіх ганьбуецца гонар і годнасьць Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь". Юрыя Бачышчу звольнілі з працы за "ўчыненьне амаральнага ўчынку". Больш за тое, рэктар універсітэту П.Кухарчык зьвярнуўся ў пракуратуру Маскоўскага раёну г. Менску з заявай узбудзіць супраць дацэнта крымінальную справу.

28 сьнежня з Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатру імя Максіма Горкага быў звольнены актор вышэйшай катэгорыі Павел Харланчук-Южакоў згодна атэстацыйнай характарыстыкай, падпісанай мастацкім кіраўніком тэатру Барысам Луцэнкам, у якой гаворыцца, што "ў сакавіку 2006 г. П.Харланчук-Южакоў узяў удзел у акцыі, накіраванай супраць дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь. За свае дзеяньні П.Л. Харланчук-Южакоў быў прыцягнуты праваахоўнымі органамі да адміністрацыйнай адказнасьці. П.Л. Харланчук-Южакоў парушыў маральна-духоўныя асновы тэатру, замест прызнаньня дапушчанай памылкі на сходзе трупы паводзіў сябе з надзвычайным выклікам і неэтычна, нягледзячы на шматлікія гутаркі з ім кіраўнікоў тэатру. Тым самым ён супрацьпаставіў свае асабістыя перакананьні агульнапрынятым нормам захаваньня законнасьці".

Адразу пасьля прэзідэнцкай выбарчай кампаніі былі пазбаўле-

ныя працы дзясяткі актывістаў перадвыбарчых штабоў незалежных дэмакратычных кандыдатаў. Сярод іх – грамадзкі актывіст Андрэй Юркоў, які працаваў восем гадоў галоўным сьпецыялістам маркетынгу на прадпрыемстве "Вучгас" Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках; Алег Дзячкоў, які выкладаў у адной з магілёўскіх сярэдніх школаў сьпецыяльны абавязковы курс "Магілёвазнаўства"; Вікторыя Салей, якая працавала дэфектолагам дзіцячага садку ў Мастах; настаўнік фізікі, інфарматыкі і астраноміі менскай школы №161 Аляксей Більдзюк; выкладчык Берасьцейскага дзяржаўнага унівэрсітэту Валянцін Лазарэнкаў і многія іншыя. Асабліва адзначым звальненьне з працы ўвесну старшыні "Саюзу беларускіх пісьменьнікаў", дацэнта Беларускага дзяржаўнага унівэрсітэту Алеся Пашкевіча. Пашырэньне кантрактнай формы найму пры абсалютным дамінаваньні дзяржаўных прадпрыемстваў на рынку працы стварае надзвычай спрыяльныя ўмовы для палітычнага ціску шляхам звальненьня ці пагрозы звальненьня.

Напачатку лістапада ў Клецкім раёне была звольненая сябра Партыі БНФ настаўніца ангельскай і беларускай моваў Грыцэвіцкай сярэдняй школы Іна Кебікава. Прычынай стаўся яе намер балатавацца ў якасьці кандыдата ў дэпутаты на мясцовых выбарах. Пазьней суд аднавіў настаўніцу на працы з-за відавочных парушэньняў, якія адбыліся пры ажыцьцяўленьні працэдуры звальненьня, але выпадкі, калі суд здольны абараніць незаконна звольненых, застаюцца адзінкавымі.

Яшчэ дзясяткі грамадзкіх актывістаў пад ціскам з боку адміністрацыі прадпрыемстваў і ўстановаў былі вымушаныя звольніцца з працы. Напрыклад, сябра Сойму Партыі БНФ з Лунінца Віталя Каратыша, які працаваў дырэктарам мясцовага Дому культуры, прымусілі напісаць заяву аб звальненьні з працы за ўдзел у перадвыбарчай кампаніі Аляксандра Мілінкевіча. Па словах В. Каратыша, яму таксама сказалі, што ягоная "палітычная пасада" кіраўніка штабу А. Мілінкевіча па Лунінецкім раёне несумяшчальная з дзяржаўнай працай. Пад ціскам наймальніка быў вымушаны звольніцца з працы актывіст каманды А.Мілінкевіча Віктар Вайцюк, які працаваў у прыватнай фірме "Мікс" электрамеханікам электронна-касавых апаратаў. У чэрвені старшыню сьветлагорскай суполкі ТБМ Андрэя Музычэнку, які працаваў на раённым вузьле электрычнай сувязі, прымусілі падаць заяву аб звальненьні. У сьнежні 2005 году міліцыя дастаўляла Андрэя ў аддзел унутраных справаў за тое, што ён удзельнічаў у акцыі салідарнасьці, 24 сакавіка яго арыштавалі ў Менску на 15 сутак за ўдзел у акцыі пратэсту. Музычэнку было

растлумачана, што з-за яго дзейнасьці могуць быць праблемы і ў іншых работнікаў прадпрыемства.

Вельмі жорстка на працягу 2006 году перасьледаваліся моладзевыя актывісты. Відавочна, што ўлады баяліся страціць манаполію ўплыву на моладзь і таму ўсялякімі спосабамі імкнуліся не дапусьціць грамадзкага і палітычнага плюралізму ў моладзевым асяродзьдзі. Апроч згаданых выключэньняў з ВНУ, актыўна ўжываўся метад узбуджэньня крымінальных справаў як сродку ўціску. Толькі па крымінальнай справе супраць незарэгістраванай арганізацыі “Малады Фронт” па ўсёй краіне ў якасьці сьведкаў было дапытана больш за 50 асобаў, па справе арганізацыі “Бунт” прайшло праз допыты 80 чалавек.

Не спрыяе разьвіцьцю плюралізму ў краіне і пазіцыя дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, якія займаліся непрыхаванай прапагандаю на карысьць існуючай улады і ганьбаваньнем палітычнай апазіцыі. Спробы ў судзе адстаяць гонар і годнасьць ці абвергнуць хлусьлівую інфармацыю прадстаўнікамі палітычнай апазіцыі, як правіла, не прыносілі станоўчых вынікаў. Так адбылося са зваротамі ў суд у сакавіку кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна са скаргаю на незаконныя дзеяньні Цэнтрвыбаркаму і Нацыянальнай дзяржаўнай радыёкампаніі з прычыны скарачэньня ягонага выбарчага выступу на тэлебачаньні і бязьдзейнасьці ў гэтым выпадку ЦВК. Гэткі ж вынік звароту ў суд старшыні АГП Анатоля Лябедзькі да Белтэлерадыёкампаніі аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі і кампенсацыі маральных стратаў у сувязі з распаўсюджваньнем зьневажальнай і паклёпніцкай інфармацыі ў фільме “Тэорыя змовы. Кіруемы хаос”, зробленым гэтай кампаніяй. У абодвух выпадках суд не задаволіў выстаўленыя зыскі.

Неаднаразова адзначаліся выпадкі мэтавага затрыманьня носьбітаў інфармацыі ў грамадзкіх актывістаў, якія займаліся выданьнім рэгіянальных бюлетэняў ці працавалі як журналісты з рэспубліканскімі і замежнымі інфармацыйнымі выданьнямі. Такім чынам з розных прычынаў былі забраныя кампутары ў моладзевых актывістаў з Баранавічаў Сяргея Марчыка, з Жодзіна — Паўла Красоўскага, у грамадзкіх актывістаў з Гародні Віктара Хільмановіча, Зьміцера Салаўёва з Наваполацку, Віктара Сырыцы з Баранавічаў, Вацлава Арэшкі з Менску, таямніча зьнік вінчэсьцер на кампутары ў грамадзкага актывіста з Рэчыцы Валерыя Пуціцкага.

Сталай практыкай зьяўляецца асабісты дагляд і дагляд рэчаў палітычных, грамадзкіх актывістаў, журналістаў і студэнтаў пры

перасячэньні гэтымі асобамі мяжы Рэспублікі Беларусь. Створаныя сьпісы асобаў, якія абавязкова мусяць быць дагледжаныя пры перасячэньні мяжы – падчас перадвыбарчай кампаніі ў дзясяткаў з гэтых людзей былі адабраныя асабістыя рэчы, носьбіты інфармацыі (ноўтбукі, дыскі, часопісы альбо кнігі) і грошы.

Дзеля абмежаваньня інфармацыі пра грамадзка-палітычныя падзеі ў Беларусі, ускладненьня кантактаў паміж замежнымі грамадзкімі дзеячамі і палітыкамі з беларускімі апазіцыйнымі дзеячамі ўлады актыўна выкарыстоўвалі візавыя абмежаваньні. Дзясяткі з такіх асобаў не атрымалі беларускія візы ці не былі дапушчаныя ў Беларусь пры перасячэньні мяжы. Так, у сакавіку не была дапушчаная ў Беларусь здымачная група ўкраінскага “5 каналу”; у красавіку — дзьве здымачныя групы Польскага грамадзкага тэлебачаньня, візы ў журналістаў без ніякіх тлумачэньняў быліануляваныя пры перасячэньні мяжы. Не атрымалі беларускія візы ў лістападзе генеральны сакратар Швецкага Хельсінскага камітэту Роберт Хорт, а таксама некалькі дэпутатаў Бундэстагу і прадстаўнікі дэлегацыі Еўрапейскага парламенту па сувязях з Беларусьсю.

Пры адсутнасьці палітычнага плюралізму ў краіне натуральным зьяўляецца існаваньне цэнзуры ў сродках масавай інфармацыі Беларусі. Аднак, па сутнасьці, выпадкаў непрыхаванага цэнзураваньня незалежнай інфармацыі было няшмат. І гэта зьвязана з рэзкім падзелам СМІ на праўладныя, якія фінансуюцца ўрадам і выконваюць ролю ідэалагічнага рупару беларускіх уладаў, забаўляльна-камерцыйныя, якія не даюць ніякай грамадзка-палітычнай інфармацыі і на незалежныя дэмакратычныя выданьні.

У праўладных выданьнях першага накірунку казаць пра зьяўленьне альтэрнатыўнай думкі, альтэрнатыўнага матэрыялу, дзе б пытаньне разглядалася ў іншым ракурсе, чым гэта бачаць беларускія ўлады, у прынцыпе немагчыма. Жорсткая ідэалагізацыя, прапагандысцкая скіраванасьць, непрымірымасьць, нецярпімасьць, безадказнасьць, якія вынікаюць з гарантаванай уладамі беспакаранасьці, выпуск заведама ілжывых матэрыялаў, якія скажаюць рэаліі грамадзка-палітычнага жыцьця – характэрныя рысы такіх выданьняў. Улады шчодра фінансуюць такія выданьні, прадастаўляюць фінансавыя і матэрыяльныя ільготы, забясьпечваюць прэферэнцыі на права атрыманьня інфармацыі ў дзяржаўных структурах, дапамагаюць у распаўсюдзе, арганізоўваюць прымусовую падпіску на іх. Матэрыяльныя расходы на іх утрыманьне закладзеныя ў дзяржаўны бюджэт краіны. Але ў адказ патрабуецца поўная лаяльнасьць і безумоўная падтрымка ўсіх крокаў беларускай улады.

Па сутнасьці, праўладныя выданьні зьяўляюцца інструментам афіцыйнай дзяржаўнай ідэалогіі і выконваюць адпаведныя задачы. Пра гэта ня раз адкрыта заяўлялася кіраўніцтвам краіны і чыноўнікамі рознага ўзроўню. Так, прэзідэнт А.Лукашэнка 26 студзеня падчас уручэньня дзяржаўных узнагародаў работнікам беларускіх тэлеканалаў заявіў, што “Шмат хто падтрымлівае маю пазіцыю ў тым, што ідэалогія не прыватызуецца, СМІ павінны падтрымлівацца дзяржавай”. Цікава, што словы “ідэалогія” і “СМІ” ўжытыя як сінонімы, і гэта фактычна адпавядае разуменьню А. Лукашэнкі прызначэньня сродкаў масавай інфармацыі ў краіне.

Падобнае разуменьне прызначэньня СМІ характэрна для ўсёй праўладнай вертыкалі. У Магілёве ў студзені было апублікаванае рашэньне аблвыканкаму пра арганізацыю штогадовага абласнога спаборніцтва сярод дзяржаўных абласных, гарадзкіх і раённых газетаў, а таксама журналістаў, якія працуюць у гэтых выданьнях. Конкурс праводзіўся “з мэтай павышэньня ідэйна-зьмястоўнага ўзроўню дзяржаўных перыядычных выданьняў”. Ачольваў конкурсную камісію намесьнік старшыні аблвыканкаму па ідэалогіі Анатоль Глаз, сродкі для пераможцаў спаборніцтва былі выдзеленыя з абласнога бюджэту. Заўважым, што конкурс быў абвешчаны на самым пачатку выбарчай прэзідэнцкай кампаніі, а вынікі конкурсу падводзіліся ў красавіку, пасьля яе заканчэньня.

У лістападзе калегія Упраўленьня ідэалагічнай работы Гомельскага аблвыканкаму абмяркоўвала бізнэс-планы дзяржаўных раённых газетаў, якія былі распрацаваныя ў адпаведнасьці з даручэньнем Аляксандра Лукашэнкі з мэтаю перайсьці на бясстратную працу. Кожны такі план прайшоў праверку ва Упраўленьні ідэалагічнай работы аблвыканкаму.

У Акцябрскім раёне Гомельскай вобласьці ў артыкуле начальніка аддзелу ідэалагічнай работы райвыканкаму Вольгі Чумаковай “Зыходзячы з патрабаваньняў жыцьця”, які надрукавала раённая газета “Чырвоны Кастрычнік” (№58 ад 26.07.2006), гаворыцца пра метады данясеньня дзяржаўнай ідэалогіі да насельніцтва. Важная роля ў гэтым працэсе адводзіцца раённай газеце “Чырвоны Кастрычнік”, якая, на думку аўтара артыкулу, павінна прымаць актыўны ўдзел у “фармаваньні ў насельніцтва разуменьня і падтрымкі мэтаў, задачаў і курсу дзяржаўнай палітыкі”.

Прычым дастаўка такога “ідэалагічнага ежыва” да насельніцтва часта забясьпечваецца таксама праз адміністрацыйны ўціск. Як прыклад прывядзем абмеркаваньне падпісной кампаніі на дзяржаўную газету “Слонімскі веснік” на сесіі Слонімскага раённага

Савету дэпутатаў, якое ладзілася 22 верасьня. Дэпутатамі было прынятае рашэньне абавязаць кіраўнікоў слонімскіх прадпрыемстваў, арганізацыяў і гаспадарак правесьці падпісную кампанію на сваіх прадпрыемствах. Гэта, як правіла, азначае, што працоўных прымусова абавяжуць выпісаць па адным асобніку “Слонімскага весніку” на кожную сям’ю.

Пры падобнай сістэме кантролю за дзяржаўнымі СМІ пытаньне цэнзуры адпадае само па сабе, бо ў гэтых СМІ няма чаго цэнзураваць. Тым ня менш, на працягу 2006 году былі выпадкі адкрытага цэнзураваньня незалежнай інфармацыі, якая гучала па дзяржаўным радыё і телебачаньні. Гэтыя выпадкі былі зьвязаныя з правядзеньнем выбарчай прэзідэнцкай кампаніі. Паводле беларускага выбарчага заканадаўства, усе кандыдаты мелі магчымасьць выступіць са сваімі праграмамі па дзяржаўным радыё і тэлебачаньні. І тут беларускія ўлады, як і кіраўніцтва дзяржаўнага тэлебачаньня і радыё, не маглі адкрыта парушыць закон і не прадставіць дэмакратычным кандыдатам у прэзідэнты А.Мілінкевічу і А.Казуліну магчымасьць выступаў без папярэдняй цэнзуры. Але 2 сакавіка без паведамленьня кандыдату ў прэзідэнты А.Казуліну з боку Белтэлерадыёкампаніі, быў скарочаны ягоны выступ па дзяржаўным тэлебачаньні — было выразана 9 хвілінаў.

Гісторыя паўтарылася 6 сакавіка, калі радыёзвароты кандыдатаў у прэзідэнты А.Мілінкевіча і А.Казуліна да выбаршчыкаў выйшлі ў эфір з купюрамі. З 30 хвілінаў гарантаванага выбарчым заканадаўствам выступу па дзяржаўным радыё ў А.Казуліна былі выразаныя 7 хвілінаў. З выступу А.Мілінкевіча “таямніча” зьніклі некаторыя фразы, датычныя выказваньняў дзеючага прэзідэнта А.Лукашэнкі.

На працягу 2006 году таксама былі выпадкі цэнзураваньня замежных і забаўляльных СМІ. Так, у сакавіку была спыненая трансьляцыя міжнароднага расейскага тэлеканалу RTVi, на якім з лютага 2006 году выходзіла штотыднёвая телепраграма, прысьвечаная Беларусі “Вакно ў Еўропу”. Кабельны аператар каналу ў Беларусі “Космас-ТВ” пры гэтым спаслаўся на тэхнічныя прычыны, па якіх канал будзе недаступны беларускім тэлегледачам на ўвесь перыяд прэзідэнцкіх выбараў. Як высьветліў у перамовах з аператарам дырэктар каналу RTVi Міхаіл Баршчэўскі, “ім тэлефанавалі з нейкага “верху” і жорстка было запатрабавана адключыць канал на час выбараў. І толькі”. Кіраўніцтва RTVi ў сувязі з гэтым заявіла, што “ў Беларусі нас закрылі з палітычных прычынаў”.

10 сакавіка ў адной з забаўляльных перадачаў FM “Альфа-радыё” нечакана для ды-джэяў радыё прагучалі словы падтрымкі дэмакра-

тычнага кандыдата ў прэзідэнты А.Мілінкевіча: жыхарка Менску сказала ў адкрытым эфіры наступнае: "Я хачу павіншаваць Аляксандра Мілінкевіча з тым, што ён хутка набудзе новы статус. Вы ведаеце, пра што я кажу". Праз 20 хвілінаў Альфа-радыё зьнікла з эфіру. Як пазьней паведаміла інфармацыйная служба радыё, у будынку, дзе разьмяшчаецца радыё, на 20 хвілінаў было адключанае сьвятло.

Таксама былі выпадкі нявыхаду ў эфір радыёвыступаў дэмакратычных кандыдатаў і адмовы ў друкаваньні агітацыйных матэрыялаў падчас кампаніі выбараў у мясцовыя Саветы.

Таксама трэба адзначыць, што ў 2006 годзе працягвалася негалосная забарона на радыётрансьляцыю і тэлевізійны паказ выступаў некаторых музычных гуртоў, што закранула восем удзельнікаў канцэрту на плошчы Бангалор ў ліпені 2004 году, прысьвечаным дзесяцігодзьдзю праўленьня Лукашэнкі. Да гэтага часу па дзяржаўным беларускім тэлебачаньні ня ўбачыш выступы гуртоў "Палац", "Zet", "N.R.M.", "Drum Ecstasy", "Нейра Дзюбель", Аляксандра Памідорава, Зьміцера Вайцюшкевіча і "Kriwi". Таксама асьцерагаюцца даваць іхнюю музыку амаль усе забаўляльныя FM-станцыі. Узьнікаюць праблемы ў "нелаяльных" гуртоў і з атрыманьнем канцэртных пляцовак у Беларусі.

Створаная ў краіне сістэма жорсткага пакараньня незалежных СМІ шляхам штрафаў, прыпыненьня выданьняў, адмоваў у друку ды іншых рэпрэсіўных адміністрацыйных і гаспадарчых мераў, прымушае рэдакцыі выданьняў быць вельмі асьцярожнымі ў асьвятленьні грамадзка-палітычнага жыцьця і ўводзіць так званую "самацэнзуру".

Некалькі разоў на працягу 2006 году беларускія чыноўнікі вышэйшага рангу заяўлялі пра неабходнасьць ужыць абмежавальныя рамкі ў дачыненьні да карыстаньня Інтэрнэтам. Так, 16 мая міністр інфармацыі РБ заявіў, што ў законе аб СМІ, які мяркуецца "ўдасканальваць па артыкулах", найперш варта рэгламентаваць сферу Інтэрнэту, што ва ўмовах таталітарнай улады ў Беларусі несумненна прывядзе да цэнзураваньня грамадзка-палітычнай інфармацыі ў сусьветнай сетцы. У ліпені прадстаўніца берлінскага бюро міжнароднай арганізацыі "Рэпарцёры бяз межаў" Катрын Эвэрс заявіла пра тое, што валодае інфармацыяй пра перамовы паміж Беларусьсю і Кітаем адносна стварэньня сістэмы жорсткага цэнзураваньня ў Інтэрнэце. "Рэпарцёры бяз межаў" выказалі занепакоенасьць, што хуткім часам "Лукашэнка будзе спрабаваць кантраляваць Інтэрнэт, як і іншыя медыі".



Зьяўленьне такога "феномену" ў Беларусі, як дзяржаўная ідэалогія,

абумоўлена найперш пабудовай таталітарнага дзяржаўнага ладу, які патрабуе ідэалагічнага абгрунтаваньня ў ”абранасьці”, “асаблівасьці”, “правільнасьці” разьвіцьця ў краіне той сістэмы дзяржаўных, грамадзкіх, эканамічных дачыненьняў, на якой грунтуецца ўлада сёньняшніх правячых беларускіх “элітаў” і найперш самога А.Лукашэнкі.

Ідэя распрацоўкі дзяржаўнай ідэалогіі ўпершыню была агучаная А.Лукашэнкам. Ён ня раз заяўляў пра гэта: “Дзяржава без ідэалогіі, як і чалавек бяз думкі, ня можа жыць і разьвівацца, тым больш супрацьстаяць унутраным і зьнешнім пагрозам і выклікам. Ідэалогія для дзяржавы – тое ж самае, што імунная сістэма для жывога арганізму. Калі імунітэт слабее, любая, нават самая нязначная, інфекцыя становіцца сьмяротнай. Гэтак сама і з дзяржаваю:  калі разбураецца ідэалагічны падмурак грамадзтва, яго пагібель становіцца толькі справай часу, якой бы зьнешне дзяржава не здавалася моцнай і пагрозьлівай” (выступ на семінары працаўнікоў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў, 2003 г.).

Асноўнай праблемаю, з якой сутыкнуліся беларускія “тэарэтыкі” дзяржаўнай ідэалогіі, было тое, што яе існаваньне і ўвядзеньне ў практыку адкрыта супярэчыць беларускай Канстытуцыі, у якой замацаваны прынцып палітычнага плюралізму, розных думак, меркаваньняў і поглядаў (артыкул 33 Канстытуцыі РБ).

Задача ўскладнялася яшчэ тым, што распрацоўшчыкі “дзяржаўнай ідэалогіі” былі вымушаныя грунтаваць свае дасьледаваньні з улікам грамадзка-палітычных поглядаў самога А.Лукашэнкі, а то і проста займацца псеўданавуковым абгрунтаваньнем выказваньняў прэзідэнта. Пра гэта адкрыта сьцьвярджаецца ў навучальным дапаможніку для ВНУ “Основы идеологии белорусского государства» (Мн., 2004): “Выступы агульнанацыянальнага лідэра заўсёды зьяўляюцца праграмнымі, паколькі ў іх фармулююцца канцэпцыі, ствараюцца ідэалы беларускага грамадзтва, зьдзяйсьняецца складанейшы працэс мэтаскіраваньня (“целеполагания”) ў рамках дзяржаўнага кіраваньня”. А погляды прэзідэнта характарызуюцца мацнейшым эклектызмам, замяшаным на павярхоўных уяўленьнях пра гістарычныя працэсы разьвіцьця  раньняга славянства і “агульнарускай” еднасьці, дзяржаўнага праваслаўя і камуністычных пастулатах, “народнага сацыялізму” і нелюбові да ўсяго нацыянальнага беларускага і еўрапейскага, пошуках гістарычных аналогіяў у сталінскім і гітлераўскім рэжымах для апраўданьня збудаванай ім сістэмы ўлады.

Усе гэтыя супярэчнасьці, недагаворкі, размытасьці,  ваяўнічасьць і цемрашальства, элементарна нізкі ўзровень абазнанасьці ды прымітывізм навуковага аналізу былі ліхаманкава, на працягу 2003-

2004 гадоў, выплеснутыя на старонкі падручнікаў і дапаможнікаў. На базе гэтых распрацовак праводзяцца абавязковыя сьпецкурсы для студэнтаў у ВНУ, заняткі ў школах, "дні інфармаваньня" ў працоўных калектывах, будуюцца ўзаемаадносіны кіруючай вертыкалі і ўсіх групаў беларускага насельніцтва.

За 2006 год працэс ідэалагізацыі грамадзкага жыцьця ў Беларусі ўзмацніўся, набыў выразныя таталітарныя антыдэмакратычныя рысы. Вясною 2006 году галоўны ідэолаг адміністрацыі прэзідэнта А. Праляскоўскі, даючы тэлевізійнае інтэрв'ю, паведаміў, што "ўжо ўхвалены план пабудовы ў Беларусі карпаратыўнай дзяржавы", мабыць, не зусім уяўляючы сабе, што класічнай ідэалогіяй карпаратыўнай дзяржавы (як у Італіі пры Беніта Мусаліні) зьяўляецца фашызм.

Галоўная задача ідэолагаў-практыкаў, якія карыстаюцца гэткімі тэарэтычнымі напрацоўкамі, складаецца ў тым, каб пераканаць студэнтаў, працоўных у тым, што той курс грамадзка-палітычнага ды эканамічнага разьвіцьця, па якім ідзе сёньняшняя Беларусь, зьяўляецца адзіна правільным. У кантэксьце вышэйпрыведзеных цытатаў трэба разглядаць існаваньне ў краіне некалькіх тысячаў аплочваемых ідэалагічных работнікаў. Толькі ў Берасьцейскай вобласьці ў 2006 годзе працавала 139 тэрытарыяльных інфармацыйна-прапагандысцкіх групаў (1 – рэспубліканская, 6 – аблвыканкаму, 132 – гарвыканкамаў), у якіх налічваецца 1257 асобаў. За 9 месяцаў 2006 году імі было праведзена 1902 сустрэчы ў працоўных калектывах, а таксама па месцы жыхарства, на якіх прысутнічала 107 982 асобы.

Ідэалагічная вертыкаль адказвае за "правільныя" вынікі выбарчых кампаніяў. Менавіта яны зьяўляюцца "дырыжорамі" і арганізатарамі тых "бліскучых" перамогаў, якія атрымліваюць праўладныя кандыдаты ў дэпутаты падчас выбараў.

Як правіла, упраўленьні ідэалагічнай работы выканкамаў рыхтуюць інфармацыйныя матэрыялы для дакладчыкаў да "адзіных дзён інфармаваньня", яны вызначаюць ідэалагічны накірунак рэгіянальных СМІ. Кіраўнікі ідэалагічных аддзелаў прэзідэнцкай вертыкалі адказваюць за інфармацыйную палітыку ў рэгіёнах. Так, у лютым на запыт журналісткі Ірыны Макавецкай у Рэчыцкім райвыканкаме ёй патлумачылі, што згодна з "новымі правіламі для журналістаў", карэспандэнт павінен паведаміць райвыканкаму перад тым, як сустракацца з прадстаўнікамі раённых уладаў. У прыватнасьці, калі І. Макавецкая хоча паразмаўляць са старшынёй Холмецкага сельсавету, ёй давядзецца папярэдне патэлефанаваць загадчыку ідэалагічнага аддзелу райвыканкаму Юрыю Туміловічу і атрымаць ад яго дазвол.

Упраўленьні ідэалагічнай работы арганізоўваюць і іншыя ідэала-

гічна-прапагандысцкія акцыі. Так, да прыкладу, у студзені намесьнік старшыні Смаргонскага райвыканкаму спадар Шмыга разаслаў кіраўнікам 37 прадпрыемстваў гораду, прычым як дзяржаўнай, так і недзяржаўнай формаў уласнасьці, графікі прагляду відэафільму "Сьцяг і герб маёй краіны" і цыклу відэафільмаў "Навейшая гісторыя", якія маюць відавочны прапагандысцкі ідэалагічны накірунак.

Асаблівая ўвага надаецца ідэалагічнаму выхаваньню моладзі. Намесьнікі дырэктараў па выхаваўчай рабоце ўсіх школаў г.Менску абавязаныя былі здаць некалькі тэстаў па ідэалогіі беларускай дзяржаўнасьці і атрымаць залік у Інстытуце павышэньня кваліфікацыі, дзе існуе сьпецыяльны аддзел, які займаецца кантролем ідэалагічнай падрыхтоўкі настаўнікаў.

У некаторых гарадзенскіх школах у красавіку распаўсюджваліся анкеты, у якіх школьнікі павінны былі паставіць сабе адзнаку ад нуля да трох балаў за "прыняцьце ідэалогіі беларускай дзяржавы" і "ўзровень ідэйна-палітычнай сьвядомасьці". Па гэтых пытаньнях адзнакі мусілі выставіць таксама бацькі школьнікаў, а затым – настаўнікі, і – вывесьці сярэдні бал. Такім чынам школа ацэньвае лаяльнасьць вучняў да дзяржаўнай ідэалогіі.

Назіраецца сітуацыя ідэалагізацыі грамадзкіх навук. Так, 17 студзеня падчас прызначэньня новага дырэктара Інстытуту літаратуры Акадэміі навук Пётр Нікіценка (куратар секцыі грамадзкіх навук у Акадэміі), прадстаўляючы новага дырэктара, зьвярнуўся да прысутных: "Літаратары і іншыя ідэалагічныя работнікі". Пры знаёмстве з калектывам новы дырэктар В.Максімовіч зазначыў, што інстытут — дзяржаўная ўстанова, таму ў пэўным сэнсе павінна быць ідэалагічнай структурай.

Таталітарныя тэндэнцыі ў Беларусі ўзмацняюцца. Знакавай для 2006 году стала пабудова помніка былому старшыні ЧК Ф. Дзяржынскаму ў г.Менску, а таксама ўзьвялічваньне ролі камуністычнага дыктатара І.Сталіна. Для правядзеньня некаторых масавых дзяржаўных мерапрыемстваў прапаганда выкарыстоўвае муляж гэтак званай абарончай «Лініі Сталіна».

## 7. Парушэньне права грамадзянаў на свабоду асацыяцыяў

Права на свабоду асацыяцыяў гарантаванае грамадзянам Беларусі артыкулам 36 Канстытуцыі. Сябрамі грамадзкіх аб'яднаньняў і

палітычных партыяў ня могуць быць толькі пракурорскія работнікі, судзьдзі, супрацоўнікі органаў унутраных справаў, камітэту дзяржаўнай бясьпекі, ваеннаслужачыя.

Дзейнасьць грамадзкіх арганізацыяў і палітычных партыяў рэгулюецца Законамі Рэспублікі Беларусь “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях” і “Аб палітычных партыях” адпаведна. Абодва гэтыя законы былі выкладзеныя ў новых рэдакцыях у 2005 годзе.

Новая рэдакцыя Закону “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях” ад 19.07.2005 г. прадугледжвае абмежаваньні пры стварэньні і дзейнасьці грамадзкіх аб’яднаньняў. Паводле арт. 7 Закону, забараняецца стварэньне і дзейнасьць грамадзкіх аб’яднаньняў, якія маюць на мэце гвалтоўнае зьмяненьне канстытуцыйнага ладу альбо вядуць прапаганду вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасьці. На тэрыторыі Беларусі забараняецца дзейнасьць незарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў, саюзаў. Аналагічныя абмежаваньні для дзейнасьці палітычных партыяў усталяваныя арт. 7 новай рэдакцыі Закону “Аб палітычных партыях” ад 19.07.2005 г. Такім чынам, паводле дзеючага заканадаўства, незарэгістраваныя грамадзкія аб’яднаньні і палітычныя партыі зьяўляюцца незаконнымі незалежна ад мэтаў і метадаў іх дзейнасьці.

У адпаведнасьці з арт. 5 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, забараняецца дзейнасьць толькі тых палітычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў, якія маюць на мэце гвалтоўнае зьмяненьне канстытуцыйнага ладу альбо якія вядуць прапаганду вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасьці. Гэты прынцып цалкам адпавядае прынцыпам свабоды асацыяцыяў, выкладзеным у Пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах. Таму забарона на дзейнасьць незарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў і партыяў, якія не парушаюць вышэйназваных прынцыпаў, зьяўляецца неканстытуцыйнай і парушае права грамадзянаў Беларусі на свабоду асацыяцыяў.

Сітуацыя са свабодай асацыяцыяў ў 2006 годзе значна пагоршылася, і ў першую чаргу гэта зьвязана з увядзеньнем з 1 студзеня ў дзеяньне новых артыкулаў Крымінальнага кодэксу, якія прадугледжваюць крымінальную адказнасьць за дзейнасьць ад імя незарэгістраваных арганізацыяў. Сама наяўнасьць такіх артыкулаў груба супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і не адпавядае міжнародным дакументам у галіне правоў чалавека. З крытыкай гэтых палажэньняў выступілі вядучыя праваабарончыя арганізацыі Беларусі і сьвету, у тым ліку Міжнародная федэрацыя

правоў чалавека, Міжнародная ліга правоў чалавека, Міжнародная амністыя і іншыя.

У 2006 годзе ў Беларусі пачалі пазбаўляць волі грамадзянаў за прыналежнасьць да той ці іншай незарэгістраванай арганізацыі. Яскравым прыкладам зьяўляецца справа Грамадзянскай ініцыятывы “Партнёрства”, паводле якой Мікола Астрэйка, Аляксандр Шалайка, Цімафей Дранчук і Эніра Браніцкая былі асуджаныя судом да розных тэрмінаў пазбаўленьня волі за прыналежнасьць і дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. На працягу году перасьледу з боку ўладаў падвяргаліся сябры моладзевай незарэгістраванай арганізацыі “Малады Фронт”, а старшыня аб’яднаньня Зьміцер Дашкевіч быў асуджаны да году і шасьці месяцаў пазбаўленьня волі.

Выкарыстоўваліся таксама пракурорскія папярэджаньні за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай грамадзкай арганізацыі. Такая мера ўзьдзеяньня была прыменена, у прыватнасьці, Гомельскай абласной пракуратурай у адносінах да мясцовай актывісткі Юліі Сівец за дзейнасьць ад імя ліквідаванага ў 2003 годзе Моладзевага цэнтру “Гарт”.

На працягу году Камітэт ААН па правах чалавека прыняў рашэньні па некалькіх індывідуальных зваротах грамадзянаў Беларусі аб парушэньні з боку дзяржавы іх права на свабоду асацыяцыяў. Гэта рашэньні па справе ліквідацыі ў 2003 годзе грамадзкай арганізацыі ў г. Гомелі “Грамадзянскія ініцыятывы” і аб адмове ў рэгістрацыі Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь праваабарончай грамадзкай арганізацыі “Хельсінкі-XXI”. У сваіх рашэньнях Камітэт ААН адзначыў, што ўлады Беларусі дапусьцілі парушэньне права грамадзянаў (заяўляльнікаў) на свабоду асацыяцыяў і запатрабавалі ад уладаў прыняць неабходныя захады, скіраваныя на аднаўленьне парушаных правоў. У Камітэце ААН у вытворчасьці знаходзяцца яшчэ некалькі індывідуальных зваротаў грамадзянаў Беларусі аб парушэньні дзяржавай права на свабоду асацыяцыяў, у тым ліку — зварот старшыні Рады Грамадзкага аб’яднаньня “Праваабарончы цэнтр “Вясна” А. Бяляцкага і яшчэ 10 сяброў арганізацыі ў сувязі з ліквідацыяй цэнтру  Вярхоўным судом Беларусі ў кастрычніку 2003 г. Адначасова рэгістрацыя новых няўрадавых арганізацыяў Міністэрствам юстыцыі зьўялялася фактычна немагчымай.

Згодна з Указам прэзідэнта № 605 ад 06.10.2006 г., была ліквідаваная Рэспубліканская камісія па рэгістрацыі (перарэгістрацыі) грамадзкіх аб’яднаньняў, аднак гэта мела хутчэй прапагандысцкае значэньне, паколькі практыка рэалізацыі права на свабоду

асацыяцыяў грамадзянамі Беларусі засталася нязьменнай. Так, Міністэрства юстыцыі ўжо пасьля скасаваньня згаданай Камісіі, неабгрунтавана адмовіла ў рэгістрацыі грамадзкага аб’яднаньня пенсіянераў “Старэйшыны.” Афіцыйнае паведамленьне пра адмову было атрыманае ад службоўцаў толькі праз 3,5 месяцы — са значнай пратэрміноўкай. Фармальна арганізацыю адмовіліся зарэгістраваць з-за непрадстаўленьня дакументаў, якія, аднак, не былі пералічаныя ў якасьці абавязковых у законе і іншых актах аб рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў. Спроба абскардзіць адмову ў рэгістрацыі праз Вярхоўны суд не прынесла плёну.

Працягвалася практыка ліквідацыі непадкантрольных уладам арганізацыяў, сярод якіх — праваабарончыя, моладзевыя, рэгіянальныя аб’яднаньні, якія прымалі актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці краіны: удзельнічалі ў назіраньні за выбарамі і ў мабілізацыйных кампаніях, займаліся моладзевай палітыкай, студэнцкім самакіраваньнем і г.д. Падставамі дзеля ліквідацыі часьцей за ўсё зьяўляліся парушэньні правілаў справаводзтва, наяўнасьць дробных памылак ці іншых нязначных недахопаў у дакументацыі аб’яднаньняў.

Вельмі часта ліквідацыя адбывалася не за парушэньне Закону “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях”, а паводле арт. 57 Грамадзянскага кодэксу Рэспублікі Беларусь. Гэты артыкул рэгулюе парадак ліквідацыі юрыдычных асобаў і дазваляе іх ліквідацыю за “неаднаразовае ці грубае парушэньне дзеючага заканадаўства”. Пры гэтым артыкул ня ўтрымлівае тлумачэньня паняцьця “грубае парушэньне”, суд у кожным канкрэтным выпадку гэта вызначаў самастойна. Да-дзены артыкул дазваляе таксама ліквідаваць юрыдычную асобу за адно парушэньне, прычым ня ўтрымлівае тэрмінаў, на працягу якіх яно магло быць дапушчана.

20 чэрвеня рашэньнем судзьдзі Магілёўскага абласнога суда Людмілы Халадцовай было ліквідаванае Грамадзкае аб’яднаньне “Кола сяброў” (старшыня Алесь Асіпцоў). Рашэньне было вынесенае на падставе зыску да аб’яднаньня з боку абласнога ўпраўленьня юстыцыі, падтрыманага пракуратурай. Абедзьве інстанцыі абві-навацілі грамадзкае аб’яднаньне ў парушэньнях свайго ж статуту, а таксама некаторых палажэньняў заканадаўства. Аргументы абласнога ўпраўленьня юстыцыі прадстаўляла ў судзе загадчыца аддзелу рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў Аліна Хмяльніцкая.

4 траўня Вярхоўным судом Рэспублікі Беларусь была ўзбуджаная грамадзянская справа па зыску Міністэрства юстыцыі аб ліквi-

дацыі грамадзкага аб’яднаньня “Міжнародная акадэмія вывучэньня нацыянальных меншасьцяў”. У сваім зыску Мінюст спасылаўся на Указ прэзідэнта ад 31 мая 2005 году №247 “Пра дадатковыя меры па ўпарадкаваньні выкарыстаньня словаў “нацыянальны” і “беларускі”, якім усталяваны парадак выкарыстаньня гэтых словаў. Паводле Указу, недзяржаўныя арганізацыі ня маюць права мець у сваёй назьве слова «нацыянальны». Аднак нягледзячы на тое, што словазлучэньне «нацыянальная меншасьць» зьяўляецца тэрмінам і ніякімі іншымі словамі гэтую супольнасьць людзей нельга назваць, суд вынес рашэньне аб ліквідацыі арганізацыі.

18 красавіка Віцебскі абласны суд спыніў дзейнасьць грамадзкага аб’яднаньня “Прыватныя ініцыятывы” па зыску ўпраўленьня юстыцыі аблвыканкаму. Справа датычылася страты арганізацыяй юрыдычнага адрасу: ЖРЭТ Першамайскага раёну Віцебску адмовіўся працягнуць дамову на арэнду офісу, якая скончылася летам 2005 году. Кіраўнік аб’яднаньня Сяргей Шэлегаў неаднаразова спрабаваў знайсьці кампраміс і са ЖРЭТам, і з гарадзкімі ўладамі па праблеме юрыдычнага адрасу — двойчы зьвяртаўся ў гарвыканкам, аднак мясцовыя чыноўнікі не дазволілі “Прыватным ініцыятывам” далей арэндаваць памяшканьне. Яны пісьмова паведамілі пра сваё рашэньне толькі напрыканцы сьнежня. Амаль адразу ж пасьля гэтага адрэагавала ўпраўленьне юстыцыі аблвыканкаму і вынесла папярэджаньне арганізацыі, у якім прапанавала прыняць захады па ліквідацыі парушэньня да 17 студзеня 2006 году. Спробы знайсьці юрыдычны адрас для “Прыватных ініцыятываў” аказаліся безвыніковымі, і ў выніку адна са старэйшых дэмакратычных арганізацыяў Віцебску пазбавілася юрыдычнага статусу.

Вялікі грамадзкі рэзананс выклікала справа аб ліквідацыі ў Вярхоўным судзе найстарэйшай беларускай творчай арганізацыі “Саюз беларускіх пісьменьнікаў”. Падставай дзеля зыску Міністэрства юстыцыі стала адсутнасьць арыгіналу статуту, няправільна аформленая пячатка, герб “Пагоня” на шыльдзе Дому літаратара, а таксама правядзеньне ў гэтым будынку зьезду Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), хаця ён не належыць Саюзу. Судовыя слуханьні пачаліся ў красавіку, але пасьля некалькіх паседжаньняў 22 траўня Вярхоўны суд спыніў вытворчасьць па справе паводле хадайніцтва Міністэрства юстыцыі, якое адклікала ўласны зыск. Пісьменьніцкая арганізацыя выканала большасьць патрабаваньняў Мінюсту і змагла давесьці судзьдзі неабгрунтаванасьць абвінавачаньня ў нестатутнай дзейнасьці – правядзеньні з’езду БСДП(Г). У жніўні найстарэйшая беларуская пісьменьніцкая

арганізацыя была пазбаўленая арандаванага памяшканьня ў Доме літаратара.

Улады шырока выкарыстоўвалі нададзенае ім законам права часовага прыпыненьня дзейнасьці грамадзкіх аб'яднаньняў. Так, напярэдадні мясцовых выбараў, 11 сьнежня, у Вярхоўным судзе Беларусі адбыўся разгляд справы па зыску Мінюсту аб прыпыненьні дзейнасьці Рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня "Беларускі рэспубліканскі клуб выбаршчыкаў", якое ажыцьцяўляла незалежнае назіраньне за выбарамі. На працягу году Міністэрства юстыцыі вынесла два папярэджаньні грамадзкаму аб'яднаньню, і на падставе гэтага запатрабавала прыпыніць яго дзейнасьць тэрмінам на 6 месяцаў. Нягледзячы на тое, што адна з падставаў для прыпыненьня дзейнасьці арганізацыі не знайшла доказаў падчас судовага разгляду, Вярхоўны суд палічыў істотнай другую — адсутнасьць офіснага памяшканьня па зарэгістраваным юрыдычным адрасе, і вынес рашэньне аб прыпыненьні дзейнасьці арганізацыі на 6 месяцаў. У выпадку, калі падстава прыпыненьня дзейнасьці арганізацыі на працягу вызначанага судом тэрміну ня будзе выпраўленая, можа быць пастаўленае пытаньне аб ліквідацыі РГА "Беларускі рэспубліканскі клуб выбаршчыкаў".

Была прыпыненая дзейнасьць Моладзевага грамадзкага аб'яднаньня "Ветразь" і Грамадзкага аб'яднаньня "Воля да развіцьця" са Слоніму (Гарадзенская вобласьць) на падставе адсутнасьці юрыдычных адрасоў у незалежных ад мясцовай улады арганізацыяў. Вярхоўны суд таксама прыпыніў дзейнасьць грамадзкага аб'яднаньня "Беларуская жаночая ліга" на тэрмін шэсьць месяцаў на падставе недахопаў у вядзеньні справаводзтва.

У чэрвені Мінюст хадайнічаў аб прыпыненьні дзейнасьці РГА "Беларускі Хельсінскі камітэт" на падставе таго, што арганізацыя ня выплаціла 160 мільёнаў рублёў штрафаў і падаткаў з замежнай грашовай дапамогі паводле праграмы TACIS. Разгляд справы быў прыпынены да разгляду скаргаў праваабаронцаў адносна беспадстаўнасьці патрабаваньняў аб выплаце падаткаў, у якіх яны спасылаліся на пагадненьне паміж урадам Беларусі і TACIS аб вызваленьні ад падаткаў дадзеных праграмаў. У кастрычніку апошняя скарга БХК была адхіленая, і 1 лістапада Менскі гаспадарчы суд вырашыў канфіскаваць маёмасьць БХК, а Вярхоўны суд аднавіў разгляд зыску Мінюсту аб прыпыненьні дзейнасьці арганізацыі. Нагадаем, што яшчэ ўлетку 2005 году Гаспадарчы суд Менску зьняў з праваабарончай арганізацыі абвінавачаньні ва

ўхіленьні ад выплаты падаткаў па сродках, якія задзейнічаныя ў рамках праграмы TACIS. Аднак гэтае рашэньне апратэставаў намесьнік старшыні Вышэйшага гаспадарчага суда Яўген Сьмірноў. У сьнежні 2005 году прэзідыум ВГС задаволіў яго пратэст і абавязаў БХК выплаціць падаткі і штрафныя санкцыі ў суме, эквівалентнай прыкладна 75 тысячаў даляраў. Пры гэтым пастанова прэзідыуму ВГС супярэчыць іншаму працэсуальнаму дакументу – рашэньню сьледчага Дэпартаменту фінансавых расьсьледаваньняў Камітэту дзяржаўнага кантролю аб спыненьні крымінальнай справы супраць старшыні "Беларускага Хельсінскага камітэту" Тацяны Працькі, які пацьвярджае, што службовыя асобы БХК не павінны выплочваць падаткі па спрэчных грашовых сумах.  28 лістапада судовы разгляд зыску Міністэрства юстыцыі быў адкладзены Вярхоўным судом на нявызначаны тэрмін. Не ў апошнюю чаргу гэта было зьвязана з міжнароднай рэакцыяй на дзеяньні беларускіх уладаў. Міжнародная Федэрацыя Хельсінскіх камітэтаў з трывогай адзначыла, што "пры адсутнасьці праваабарончых групаў урад можа ўзмацняць сваю ўладу абсалютна, без кантролю грамадзтва і без усякай адказнасьці". Еўрапейскі Саюз таксама заклікаў беларускія ўлады спыніць кампанію перасьледу БХК, якая можа скончыцца закрыцьцём адзінай зарэгістраванай праваабарончай арганізацыі ў Беларусі.

Ва ўмовах правядзеньня кампаніі па ліквідацыі і перасьледзе непадкантрольных уладам няўрадавых арганізацыяў на працягу году праводзілася палітыка ўмацаваньня ролі праўрадавых грамадзкіх аб'яднаньняў.

19 ліпеня быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь "Аб рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадзкіх аб'яднаньнях". Паводле гэтага Закону, пад дзяржаўна-грамадзкімі аб'яднаньнямі разумеюцца заснаваныя на сяброўстве (членстве) некамерцыйныя арганізацыі, якія ствараюцца для выкананьня ўскладзеных на іх дзяржаўна значных задачаў. Умовы стварэньня такіх аб'яднаньняў вызначаюцца прэзідэнтам краіны ці па ягоным даручэньні Саветам Міністраў.

Улады фактычна адрадзілі ў Беларусі практыку і прынцыпы стварэньня псеўда грамадзкіх арганізацыяў, якая была характэрная для СССР. Найперш гэта датычыцца "Беларускага рэспубліканскага саюзу моладзі" — самай масавай праўладнай моладзевай арганізацыі, якая стала фінансуецца з дзяржаўнага бюджэту і выконвае тыя задачы, якія ставяцца перад ёю з боку ўладаў. Менавіта БРСМ на сёньня мае дзяржаўную манаполію на працу з моладзьдзю, пачынаючы са школаў і заканчваючы ВНУ і дзяржаўнымі прадпрыемствамі.

У БРСМ, як калісьці у ВЛКСМ, уведзеныя пасады вызваленых сакратароў, якія зьяўляюцца штатнымі прапагандыстамі дзяржаўнага палітычнага рэжыму. У Беларусі дзейнічаюць такія старыя савецкія арганізацыі, як ДТСААФ, АСВОД і іншыя. Усе яны ствараюцца па рашэньні дзяржаўных органаў і вырашаюць пастаўленыя дзяржавай задачы: патрыятычнае выхаваньне моладзі, падрыхтоўка юнакоў да службы ў войску і г.д. Улады планамерна звужаюць поле для працы НДА і ствараюць дзяржаўную манаполію на працу з рознымі катэгорыямі грамадзянаў.

З 1 студзеня па 1 верасьня 2006 году беларускімі ўладамі было зарэгістравана толькі 41 новае грамадзкае аб’яднаньне, у тым ліку: 2 міжнародных, 6 рэспубліканскіх, 33 мясцовыя, а таксама 2 саюзы грамадзкіх аб’яднаньняў. Сярод новастворaных арганізацыяў пераважаюць аб’яднаньні фізкультурна-спартовай, дабрачыннай і асьветніцкай скіраванасьці. Агульная колькасьць зарэгістраваных грамадзкіх аб’яднаньняў складала на 1 кастрычніка – 2 233 арганізацыі, з якіх 231 мае міжнародны статус, 722 – рэспубліканскі і 1280 – мясцовы.

Ня лепшым чынам складалася сітуацыя і з палітычнымі партыямі ў Беларусі. Прынятая ў 2005 годзе новая рэдакцыя Закону “Аб палітычных партыях” яшчэ болей ускладніла іх існаваньне. Роля палітычных партыяў у сучаснай палітычнай сістэме Беларусі заставалася вельмі нязначнай, і асабліва гэта датычыцца партыяў дэмакратычнага накірунку, якія фактычна пазбаўленыя магчымасьці выконваць сваю асноўную задачу: змагацца за ўладу ў краіне. Паводле створанай уладамі сістэмы правядзеньня выбараў у Беларусі, дэмакратычныя партыі фактычна пазбаўленыя магчымасьці мець сваіх прадстаўнікоў у парламенце краіны, у мясцовых Саветах, ва ўрадзе і г.д. Прадстаўнікоў дэмакратычных палітычных партыяў сістэматычна не ўключаюць у склад выбарчых камісіяў на выбарах усіх узроўняў.

Самі партыі і іх сябры ўвесь час падвяргаюцца ціску, а часам і адкрытаму перасьледу з боку ўладаў. Да 18 кастрычніка ўсе палітычныя партыі павінны былі правесьці перарэгістрацыю сваіх статутаў у Міністэрстве юстыцыі. Адной з вялікіх праблемаў стала рэгістрацыя першасных арганізацыйных структураў. Асноўнай прэтэнзіяй рэгіструючых органаў да палітычных партыяў стала наяўнасьць юрыдычных адрасоў першасных структураў у жылых памяшканьнях, што, на думку рэгіструючых органаў, супярэчыла патрабаваньням Жыльлёвага кодэксу Рэспублікі Беларусь. Пры

гэтым трэба адзначыць, што ўнітарныя прадпрыемствы, паводле дзеючага заканадаўства, маюць права рэгістравацца па месцы жыхарства іх уладальнікаў, а такія некамерцыйныя юрыдычныя асобы, як грамадзкія аб'яднаньні і палітычныя партыі, якія не вядуць гаспадарчай дзейнасьці, павінны мець юрыдычныя адрасы толькі ў нежыльлёвым фондзе. Знайсьці такія памяшканьні ў тэрміны, вызначаныя рэгіструючымі органамі, шмат якія палітычныя партыі ня здолелі, што прывяло да ліквідацыі абсалютнай колькасьці іх першасных арганізацыйных структураў. Трэба адзначыць, што наяўнасьць зарэгістраваных першасных арганізацыйных структураў мае вялікае значэньне пры правядзеньні выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў і парламенту, паколькі вылучэньне кандыдатаў у дэпутаты, сяброў выбарчых камісіяў, назіральнікаў адбываецца пры наяўнасьці зарэгістраваных адпаведных тэрытарыяльных арганізацыйных структураў палітычных партыяў.

9 жніўня ўпраўленьне юстыцыі Менгарвыканкаму праінфармавала Цэнтральны камітэт Партыі камуністаў Беларускай (ПКБ) аб тым, што Калегія ўпраўленьня юстыцыі Менгарвыканкаму вырашыла выключыць з журналу дзяржаўнай рэгістрацыі і пастаноўкі на ўлік трынаццаць арганізацыных структураў ПКБ у сувязі з парушэньнем заканадаўства. З рэестру былі выключаныя Менская гарадзкая арганізацыя ПКБ, а таксама раённыя арганізацыі. У якасьці падставаў дзеля прыняцьця такога рашэньня ўпраўленьне назвала парушэньні, якія нібыта былі выяўленыя ў выніку праверкі і мелі месца пры стварэньні і дзейнасьці арганізацыйных структураў. Такім чынам Партыя камуністаў Беларуская пазбавілася ўсіх арганізацыйных структураў у г. Менску. Прадстаўнікі партыі абскардзілі да-дзенае рашэньне спачатку ў Міністэрстве юстыцыі, а затым у Менскім гарадзкім судзе, аднак яно было пакінутае ў сіле. Разам з тым, у адпаведнасьці з палажэньнямі Закону “Аб палітычных партыях”, адсутнасьць абласных і менскай гарадзкой арганізацыйных структураў палітычных партыяў зьяўляецца падставай для ліквідацыі палітычнай партыі ў судовым парадку.

2 лістапада кіраўніцтва Аб'яднанай грамадзянскай партыі спрабавала аспрэчыць у Вярхоўным судзе рашэньне ўпраўленьня юстыцыі Менскага аблвыканкаму аб ліквідацыі першаснай партыйнай арганізацыі ў Клецкім раёне. Аднак Менскі абласны суд адмо-віўся разглядаць зыск, спаслаўшыся на тое, што скаргі на загады ўпраўленьня юстыцыі для палітычных партыяў суду не падведамасныя. Гэта ж пацьвердзіла і калегія грамадзянскіх справаў Вярхоўнага суда.

На працягу году ўладамі Беларусі прадпрымаліся спробы прыпыніць дзейнасьць апазіцыйных партыяў у судовым парадку. У верасьні Міністэрствам юстыцыі была накіраваная ў Вярхоўны суд адпаведная зыскавая заява адносна Партыі камуністаў Беларускай. У жніўні партыі было вынесенае пісьмовае папярэджаньне за адмову прадставіць у Міністэрства юстыцыі персанальны сьпіс сяброў ПКБ. Кіраўніцтва партыі ня выканала гэтае патрабаваньне, бо палічыла, што яно супярэчыць закону “Аб палітычных партыях”, а Мінюст у сваю чаргу падаў зыск аб прыпыненьні дзейнасьці ПКБ за дадзеныя “супрацьпраўныя дзеяньні”. Папярэджаньне камуністы абскардзілі ў Вярхоўны суд, але той падтрымаў пазіцыю Мінюсту і пакінуў папярэджаньне ў сіле. У той жа дзень ПКБ перадала ў міністэрства сьпіс на паўтары тысячы сяброў, а ў лістападзе Вярхоўны суд падчас папярэдняга судовага паседжаньня вынес пастанову: прыпыніць вытворчасьць справы аб прыпыненьні дзейнасьці Партыі камуністаў Беларускай да апублікаваньня афіцыйных вы-нікаў выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў 25-га склікаy. Рашэньне суд прыняў згодна з нормай Закону “Аб палітычных партыях”, якая забараняе прыпыненьне дзейнасьці палітычнай партыі падчас выбарчай кампаніі.

У сваіх прэтэнзіях да дэмакратычных палітычных партыяў Міністэрства юстыцыі часам даходзіла да абсурду. Так, у студзені былі вынесеныя пісьмовыя папярэджаньні Партыі БНФ і Партыі камуністаў Беларускай, падставай для якіх сталі звароты іх лідэраў Вінцука Вячоркі і Сяргея Калякіна ў раённыя органы ўлады з просьбай патлумачыць парадак фармаваньня ўчастковых выбарчых камісіяў, а таксама з заклікам выконваць патрабаваньні Выбарчага кодэксу, якія прадугледжваюць уключэньне ў склад выбарчых камісіяў прадстаўнікоў палітычных партыяў. Гэтыя лісты Міністэрства юстыцыі расцаніла як умяшальніцтва ў дзейнасьць дзяржаўных органаў і службовых асобаў. Вынесеныя папярэджаньні былі абскарджаныя, і ў красавіку Вярхоўны суд прыняў рашэньне аб іх скасаваньні.

Зафіксаваныя факты перасьледу грамадзянаў у сувязі з іх прыналежнасьцю да апазіцыйных палітычных партыяў па месцы вучобы і працы. 28 лістапада кіраўніцтва Партыі камуністаў Беларускай зьвярнулася ў Канстытуцыйны суд, Міністэрства юстыцыі і Міністэрства ўнутраных справаў Беларусі з патрабаваньнем “спыніць свавольства” ў дачыненьні да сяброў партыі. Справа датычылася парадку правядзеньня праверкі сапраўднасьці зьвестак пра сяброў

партыі Міністэрствам юстыцыі, супрацоўнікамі праваахоўных органаў і работнікамі выканкамаў. Падчас праверак на партыйцаў аказваўся псіхалагічны ціск, ім прапаноўвалася даць пісьмовыя тлумачэньні, прад’явіць партыйныя білеты з адзнакай аб выплаце партыйных складак, правяраючыя наведвалі іх па месцы працы, запрашалі на гутаркі ў райвыканкамы. Паводле зьвестак партыі, “такі парадак праверкі прапанаваны ў лістах упраў юстыцыі аблвыканкамаў, накіраваных у раённыя і гарадзкія выканаўчыя камітэты з прыкладаньнем сьпісаў членаў ПКБ”. Партыя камуністаў беларуская заявіла, што такія дзеяньні парушаюць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, а таксама законы “Аб палітычных партыях” і “Аб міліцыі”.

## 8. Парушэньне правоў грамадзянаў на свабоду мірных сходаў

Артыкул 35 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гарантуе свабоду правядзеньня мітынгаў, вулічных шэсьцяў, сходаў, дэманстрацыяў і пікетаваньняў, якія не парушаюць грамадзкі правапарадак і правы іншых грамадзянаў. Артыкул 188 Кодэксу “Аб шлюбе і сям’і” гарантуе дзецям права на ўдзел у мірных масавых мерапрыемствах. Пры гэтым дадзенае права разглядаецца як гарантыя свабоды асобы.

Парадак арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў рэгулюецца дзеючым заканадаўствам, найперш Законам “Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь” (выкладзены ў новай рэдакцыі ў 2003 г.), а таксама рашэньнямі мясцовых выканаўчых органаў улады. Гэтыя рашэньні вызначаюць месцы для правядзеньня мерапрыемстваў і месцы, дзе іх правядзеньне забароненае. Рашэньнямі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў вызначаецца таксама парадак аплаты выдаткаў, зьвязаных з аховай грамадзкага парадку, арганізацыі медыцынскага абслугоўваньня і прыборкай тэрыторыі пасьля правядзеньня масавых мерапрыемстваў (ч.4 арт. 6 Закону “Аб масавых мерапрыемствах”). Свабода мірных сходаў можа быць абмежаваная паводле арт. 23, 63 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (у мэтах абароны нацыянальнай бясьпекі, грамадзкага парадку, інтарэсаў грамадзянаў, падчас надзвычайнага ці вайсковага становішча), а таксама ў адпаведнасьці з арт. 10 Закону “Аб масавых мерапрыемствах” (абмежаваньне

на правядзеньне масавых мерапрыемстваў і на ўдзел у іх можа вызначацца заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь).

Закон “Аб масавых мерапрыемствах” і практыка яго выкарыстаньня сур’ёзна абмяжоўваюць свабоду мірных сходаў і выказваньня сваіх поглядаў і перакананьняў, гарантаваных Канстытуцыяй краіны і міжнароднымі актамі ў галіне правоў чалавека, найперш палажэньнямі Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах. Гэта неаднаразова пацьвярджалася рашэньнямі Камітэту ААН па індывідуальных зваротах грамадзянаў Беларусі, а таксама адзначалася ў шматлікіх рэзалюцыях міжнародных арганізацыяў па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, у тым ліку і ў апошняй Рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН.

Крытыка найперш датычыцца палажэньняў самога Закону “Аб масавых мерапрыемствах”. Так, некаторыя вызначэньні відаў масавых мерапрыемстваў выкладзеныя ў Законе такім чынам, што дазваляюць вельмі шырокае трактаваньне іх судамі і праваахоўнымі органамі. Напрыклад, «сходам», паводле Закону, прызнаецца сумесная прысутнасьць грамадзянаў у загадзя вызначаным месцы пад адкрытым небам альбо ў памяшканьні ў загадзя вызначаны час для калектыўнага абмеркаваньня і вырашэньня пытаньняў, што закранаюць іх інтарэсы. Пад такую фармулёўку “сходу” трапляе любая сумесная прысутнасьць людзей у любым месцы: знаходжаньне групы грамадзянаў у прыватнай кватэры, хуткаплынная сустрэча ў пэўным месцы без загадзя вызначанай мэты (напрыклад, футбольныя фанаты пасьля заканчэньня футбольнага матчу), флэш-мобы і г.д.

Неаднаразова фіксаваліся выпадкі прыцягненьня да адміністрацыйнай адказнасьці па арт. 167.1 КаАП Рэспублікі Беларусь (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў) за правядзеньне “несанкцыянаванага сходу” ў прыватных кватэрах.

Так, 14 лютага сябры ініцыятыўнай групы кандыдата ў прэзідэнты А.Мілінкевіча знаходзіліся ў кватэры аднаго з сяброў групы дзеля абмеркаваньня сваіх дзеяньняў. Гэтая сустрэча была спыненая міліцыяй як “несанкцыянаваны сход”, на ўсіх прысутных былі скла-дзеныя пратаколы з абвінавачаньнем ва ўдзеле ў несанкцыянаваным сходзе. 16 сакавіка суд Баранавіцкага раёну і г. Баранавічы вынес штрафы па 20 базавых велічыняў шасьці актывістам выбарчана штабу А.Мілінкевіча. Уладзіміра Гоўшу, Карнея Пятровіча, Мікалая Северцава, Віктара Аляхновіча, Міхаіла Мініна і Аляксандра Галькевіча судзьдзі прызналі вінаватымі ў правядзеньні

несанкцыянаванага сходу — менавіта так яны трактавалі знаходжаньне актывістаў у адной з прыватных кватэраў.

22 сьнежня ў кватэры намесьніка старшыні Партыі БНФ Алеся Міхалевіча праводзілася калядная студэнцкая вечарына. Пасьля яе заканчэньня, калі моладзь зьбіралася разыходзіцца, у кватэру ўвайшлі некалькі сьпецназаўцаў і міліцыянты ў цывільным, некаторыя з якіх былі з відэа- і фотакамерамі. Праз паўгадзіны пад'ехалі "аўтазакі", і 29 затрыманых удзельнікаў студэнцкай вечарыны былі дастаўленыя ў міліцыю Савецкага раёну. Ва ўсіх узялі тлумачэньні і перапісалі пашпартныя зьвесткі, з кожным з затрыманых размаўлялі супрацоўнікі КДБ. Суд Савецкага раёну Менску вынес дваім з затрыманых, Васілю Лепешу і Алесю Міхалевічу, да пяці сутак адміністрацыйнага арышту.

Закон "Аб масавых мерапрыемствах" рэгулюе парадак правядзеньня як сходаў, шэсьцяў, мітынгаў, дэманстрацыяў і пікетаў, так і іншых масавых мерапрыемстваў (спартовыя, культурна-масавыя і іншыя), нягледзячы на тое, яны маюць розную прыроду. Першыя зьвязаныя з рэалізацыяй грамадзянамі сваіх асноўных грамадзянскіх правоў – на мірныя сходы, выказваньне сваіх поглядаў, перакананьняў, а другія нярэдка носяць камерцыйны характар і скіраваныя на рэалізацыю спажывецкіх патрэбаў.

Вялікія прэтэнзіі да Закону "Аб масавых мерапрыемствах" датычацца палажэньняў, якія ўтрымліваюць абмежаваньні па месцах іх правядзеньня. Артыкул 9 надзяляе правам мясцовыя выканаўчыя органы ўлады сваімі рашэньнямі вызначаць сталыя месцы для правядзеньня масавых мерапрыемстваў, а таксама месцы, дзе іх правядзеньне забараняецца. На практыцы гэта прыводзіць да таго, што большасьцю рашэньняў мясцовых выканаўчых органаў дзеля гэтых мэтаў вызначаюцца аддаленыя ад цэнтру гарадоў месцы, у малалюдных парках, на стадыёнах і г.д. Правядзеньне масавых мерапрыемстваў у цэнтры большасьці гарадоў забаронена рашэньнямі мясцовых органаў, прычым гэта часта нічым не матывуецца, не разглядаюцца выпадкі, у якіх такая забарона можа дзейнічаць. Свабода мірных сходаў — гэта найперш права на свабоду выказваньняў асабістых перакананьняў, пратэсту з мэтай прыцягненьня ўвагі грамадзянаў, дзяржаўных органаў да пэўных грамадзкіх, палітычных, сацыяльных праблемаў. Правядзеньне ж, напрыклад, пікетаў з невялікай колькасьцю ўдзельнікаў у малалюдных месцах робіць гэтыя мерапрыемствы проста бессэнсоўнымі.

Мясцовыя органы ўлады, якія ўпаўнаважаныя разглядаць і выносіць рашэньні па заявах грамадзянаў на правядзеньне масавых мерапрыемстваў, паводле Закону надзеленыя правам забараняць іх правядзеньне, і вельмі часта злоўжываюць гэтым правам, выносячы нічым не матываваныя адмовы, ці забараняюць іх правядзеньне наогул. Акрамя таго, практыка аплаты грамадзянамі выдаткаў, зьвязаных з правядзеньнем масавых мерапрыемстваў (па ахове, медыцынскім абслугоўваньні, прыборцы тэрыторыі), не адпавядае міжнародным стандартам у галіне правоў чалавека. Права на мірныя сходы зьяўляецца правам грамадзянаў, гарантаваным дзяржавай, і адпаведна, дзяржава павінна забясьпечыць магчымасьці рэалізацыі гэтага права.

Але нават пры выкананьні ўсіх патрабаваньняў Закону, рэалізаваць права на свабоду мірных сходаў у Беларусі часта амаль немагчыма. Прычыны адмоваў называюцца вельмі розныя, у некаторых выпадках – абсурдныя. Напрыклад, 24 жніўня грамадзяне г. Баранавічы Віктар Сырыца, Сяргей Гоўша і Віктар Мезяк падалі заяву на правядзеньне 10 верасьня мірнага сходу пад назваю: “За свабодную, незалежную і квітнеючую Беларусь”. Арганізатарамі былі заключаныя дамовы на аплату з гарадзкім аддзелам міліцыі, станцыяй хуткай медыцынскай дапамогі, Баранавіцкай сьпецаўтабазай і Баранавіцкім гараддзелам па надзвычайным становішчы, як таго патрабуе Закон “Аб масавых мерапрыемствах”. Аднак за 5 дзён да правядзеньня плануемага мерапрыемства заяўляльнікі атрымалі ліст за подпісам намесьніка старшыні гарвыканкаму В.Аляксеева з наступнай фармулёўкай адмовы: “Гарвыканкам ня можа даць дазвол на правядзеньне сходу “За свабодную, незалежную і квітнеючую Беларусь” у гарадзкім парку культуры і адпачынку імя 30-годзьдзя ВЛКСМ ці ў іншым месцы. Сход з гэтай мэтай ужо быў праведзены ў зале гарвыканкаму 15 сакавіка 2006 году…” (маецца на ўвазе сход, які праводзіўся мясцовымі ўладамі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў). Рашэньне гарвыканкаму было абскарджанае, аднак суд Баранавіцкага раёну і г. Баранавічы, а таксама Берасьцейскі абласны суд адмовілі ў задавальненьні скаргі.

25 ліпеня берасьцейскія ўлады забаранілі мітынг “За свабоду! За незалежнасьць!”, прысьвечаны 16-й гадавіне прыняцьця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Спачатку Берасьцейскі гарвыканкам даў дазвол, аднак за дзень да запланаванага мерапрыемства арганізатараў выклікалі ва Упраўленьне ўнутраных справаў Берасьцейскага аблвыканкаму, дзе патлумачылі: мітынг

забараняецца на той падставе, што напярэдадні распаўсюджваліся ўлёткі з заклікам да ўдзелу ў мітынгу за подпісам “Аб’яднаных дэмакратычных сілаў Берасьця”, а такая арганізацыя ў вобласьці не зарэгістраваная.

У Менску ў ліпені мітынг у гонар гадавіны абвяшчэньня дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі быў забаронены гарадзкімі ўладамі на плошчы Бангалор на той падставе, што там у гэты час прахо-дзяць пікеты ў падтрымку палітзьняволенага Аляксандра Казуліна.

Неабгрунтаваныя забароны прыводзілі да таго, што грамадзяне вымушаныя былі арганізоўваць мірныя сходы без дазволаў мясцовых органаў улады. У выніку такія акцыі, як правіла, спыняліся праваахоўнымі органамі, іх удзельнікі арыштоўваліся і прыцягваліся да адміністрацыйнай, а ў шэрагу выпадкаў — і да крымінальнай адказнасьці. Любы выхад на вуліцу грамадзянаў з мэтай выказваньня пратэсту кваліфікаваўся ўладамі як несанкцыянаванае масавае мерапрыемства. Спыняліся нават такія бясьпечныя для грамадзкага парадку акцыі, як ланцугі грамадзянаў з запаленымі сьвечкамі ці партрэтамі палітвязьняў і зьніклых беларускіх палітыкаў, а затрыманьні ўдзельнікаў суправаджаліся ўжываньнем гвалту з боку прадстаўнікоў праваахоўных органаў.

За парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў установленая як адміністрацыйная адказнасьць, так і крымінальная. Першая частка артыкулу 167.1 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях (КаАП) прадугледжвае адказнасьць у выглядзе папярэджаньня альбо штрафу ў памеры ад 20 да 150 базавых адзінак ці адміністрацыйны арышт тэрмінам ад 3 да 15 сутак; другая частка — прадугледжвае адказнасьць у выглядзе штрафу ад 150 да 300 базавых велічыняў альбо адмініст-рацыйны арышт ад 10 да 15 сутак для асобаў, якія ўчынілі гэтыя дзеяньні паўторна на працягу году пасьля прыняцьця мераў адміністрацыйнага ўзьдзеяньня альбо ўчыненыя арганізатарам мерапрыемства. Адміністрацыйныя арышты і велізарныя памеры штрафаў за ўдзел у мірных сходах фактычна зьяўляюцца мерамі, скіраванымі на падаўленьне грамадзянскай і палітычнай актыўнасьці ў краіне.

Артыкул 167.2 КаАП прадугледжвае адказнасьць за карыстаньне падчас масавых мерапрыемстваў незарэгістраванымі ва ўстаноўленым парадку сьцягамі, вымпеламі, а таксама эмблемамі, сімваламі, плакатамі, зьмест якіх накіраваны на прычыненьне шкоды канстытуцыйнаму ладу, правам і законным інтарэсам грама-дзянаў. Названыя дзеяньні караюцца папярэджаньнем альбо

накладаньнем штрафу ў памеры ад 10 да 100 базавых велічыняў ці адмі-ністрацыйным арыштам тэрмінам ад 3 да 15 сутак. Гэты артыкул вельмі часта выкарыстоўваецца супраць грамадзка-палітычных актывістаў за нацыянальныя бел-чырвона-белыя сьцягі – дзяржаўную сімволіку Беларусі ў 1991-1995 гады.

Згодна з артыкулам 342 Крымінальнага кодэксу, прадугледжваецца адказнасьць за арганізацыю групавых дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак і спалучаныя з яўным непадпарадкаваньнем законным патрабаваньням прадстаўнікоў улады, ці актыўны ўдзел у іх. Менавіта па гэтым артыкуле ў розны час былі асуджаныя беларускія палітыкі Мікола Статкевіч, Павел Севярынец, Андрэй Клімаў і Аляксандр Казулін. Пры гэтым акцыі пратэсту, за якія яны былі асуджаныя, мелі выключна мірны характар і не ўяўлялі ніякай пагрозы грамадзкаму парадку.

У 2006 г. уступілі ў дзеяньне зьмены ў Крымінальны кодэкс, у тым ліку і ў арт. 293 — масавыя беспарадкі. Паводле гэтых зьменаў, прадугледжваецца крымінальная адказнасьць за падрыхтоўку, фінансаваньне і іншае матэрыяльнае забесьпячэньне такой дзейнасьці. Па дадзеным артыкуле пасьля прэзідэнцкіх выбараў быў асуджаны Сяргей Ляшкевіч са Шчучыну — актывіст перадвыбарчага штабу кандыдата ў прэзідэнты А. Мілінкевіча. “Падрыхтоўкай” да масавых мерапрыемстваў суд палічыў прагляд дакументальнага фільму “Звычайны прэзідэнт”, у якім ёсьць кадры разгону міліцыяй мірных акцыяў пратэсту.

Асаблівасьцю году стала масавае прыцягненьне да адказнасьці грамадзянаў за ажыцьцяўленьне права на мірныя сходы. Найперш гэта было зьвязана з правядзеньнем прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. Грамадзянаў затрымлівалі і арыштоўвалі за ўдзел у сустрэчах з кандыдатамі ў прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, у мірных акцыях супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў.

Артыкул 45 Выбарчага кодэксу на той час абавязваў атрымліваць дазвол мясцовых органаў улады толькі на правядзеньне сустрэчаў з выбаршчыкамі па абмеркваньні пытаньняў, вынесеных на рэферэндум. Аднак Цэнтральная камісія выдала пастанову, у адпаведнасьці з якой усе сустрэчы з выбаршчыкамі павінны былі адбывацца толькі ў адпаведнасьці з Законам “Аб масавых мерапрыемствах”, гэта значыць — для іх трэба было атрымліваць дазвол мясцовых органаў улады (толькі ў кастрычніку ў артыкул 45 Выбарчага кодэксу былі ўнесеныя адпаведныя зьмены, якія ўзаконілі гэтую практыку). У выніку фактычна ўсе перадвыбарчыя

сустрэчы кандыдатаў у прэзідэнты А. Мілінкевіча і А. Казуліна заканчваліся арыштамі іх удзельнікаў і арганізатараў. Дзеяньні затрыманых кваліфікаваліся як удзел у несанкцыянаваных сходах альбо як дробнае хуліганства.

Так, 12 сакавіка пасьля сустрэчаў А. Мілінкевіча ў Менску з выбаршчыкамі былі затрыманыя 16 удзельнікаў, з іх 15 – асуджаныя на розныя тэрміны адміністрацыйнага арышту і штрафы:

1. Міхаіл Волчак — 12 сутак адміністрацыйнага арышту па абвінавачаньні ў парушэньні арт. 156 КаАП РБ — дробнае хуліганства. Моцна зьбіты падчас затрыманьня, у яго зламаны палец на руцэ. З суда дастаўлены ў “хуткую дапамогу”, якая адмовіла яму ў шпіта-лізацыі.

2. Павел Кірушчанка — 10 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Наталя Пратасавіцкая;

3. Уладзімір Высоцкі — 3 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Наталя Пратасавіцкая;

4. Іван Шчарбакоў — 3 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Наталя Пратасавіцкая;

5. Сяргей Лаўрэнкін — 10 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Наталя Пратасавіцкая.

6. Ільля Петравец — 8 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Юлія Шумская;

7. Аляксандр Гойшык — 15 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынес судзьдзя Віктар Ганчар;

8. Уладзімір Валодзін — штраф у памеры 30 базавых велічыняў па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Тацяна Жукоўская;

9. Наталя Касарчук (грамадзянка Украіны) — 10 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Юлія Лукомская;

10. Мікола Карпінскі (грамадзянін Украіны) — 10 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Вікторыя Сьцяпанава;

11. Анатоль Яцэнка (грамадзянін Украіны) — 10 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Юлія Лукомская;

12. Мацьвей Цысьцік — 10 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Юлія Лукомская;

13. Сяргей Мацкойць - штраф у памеры 20 базавых велічыняў па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў); прысуд вынесла судзьдзя Вікторыя Сьцяпанава;

14. Алег Ларычаў — штраф 20 базавых велічыняў па арт. 167.1 КаАП РБ (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў).

15. Алег Лабаты — 3 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 156 КаАП РБ (дробнае хуліганства).

16. Максім Вінярскі — пратакол накіраваны на дапрацоўку. Судзьдзя Вікторыя Сцяпанава.

У мэтах прадухіленьня магчымых масавых акцыяў пратэсту ўлады Беларусі з дапамогай КДБ, органаў МУС прадпрынялі шэраг мераў, скіраваных на недапушчэньне масавага выхаду грамадзянаў на вуліцы пасьля правядзеньня выбараў. Дзеля гэтага былі выкарыстаныя самыя разнастайныя метады: ад прэвентыўных затрыманьняў актывістаў апазіцыі да запалохваньня грамадзянаў краіны праз СМІ.

За некалькі дзён да пачатку выбараў улады сіламі КДБ і міліцыі правялі аперацыю па інтэрнаваньні дзеячоў апазіцыі. Фактычна ўсе актывісты рэгіянальных штабоў кандыдатаў у прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча і Аляксандра Казуліна былі арыштаваныя на розныя тэрміны. Людзей затрымлівалі на вуліцах, у прыватных кватэрах і дамах па раней вызначаных сьпісах. Затрыманыя ў гэты перыяд актывісты абвінавачваліся ва ўчыненьні дробнага хуліганства (арт. 156 КаАП РБ), у большасьці выпадкаў – у нецэнзурнай лаянцы ў грамадзкіх месцах; затым на падставе пастановаў судоў арыштоўваліся.

Некаторыя актывісты апазіцыі адбывалі два, тры адміністрацыйныя арышты запар, не выходзячы з турмаў. Так, моладзевы актывіст з г. Бялынічы Алег Мяцеліца, затрыманы 16 лютага, быў арыштаваны на 15 сутак паводле пастановы суда Ленінскага раёну г. Менску па арт. 156 КаАП РБ (дробнае хуліганства). Пасьля адбыцьця пакараньня быў дастаўлены супрацоўнікамі КДБ у г.

Бялынічы, дзе зноў абвінавачаны ва ўчыненьні дробнага хуліганства і асуджаны судом Бялыніцкага раёну яшчэ на 15 сутак. Пасьля адбыцьця і гэтага тэрміну, не выходзячы з турмы, зноў быў асуджаны на 5 сутак арышту па арт. 156 КаАП (нібыта нецэнзурна лаяўся на ахоўнікаў).

Усяго на працягу выбарчай кампаніі да дня выбараў 19 сакавіка, згодна з дадзенымі Праваабарончага цэнтру "Вясна", было арыштавана 236 чалавек. Мэтай уладаў пры правядзеньні гэтай кампаніі было недапушчэньне арганізацыі мірных акцыяў пратэсту. Гэтая кампанія яшчэ раз яскрава прадэманстравала залежнасьць беларускай судовай сістэмы ад уладаў, якія зьяўляліся адной з частак рэпрэсіўнай машыны і выконвалі загад па ізаляцыі грамадзка-палітычных актывістаў.

Напярэдадні выбараў у мэтах запалохваньня грамадзянаў выкарыстоўваліся дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі. Былі праведзеныя некалькі прэс-канферэнцыяў з удзелам кіраўнікоў праваахоўных органаў, зьмест якіх шырока трансьляваўся па беларускіх тэлеканалах, радыё і ў друкаваных выданьнях. На прэс-канферэнцыі 1 сакавіка старшыня КДБ Сьцяпан Сухарэнка заявіў, што апа-зіцыяй у дзень выбараў рыхтуецца шэраг выбухаў у школах, дзе месьцяцца выбарчыя ўчасткі, што апазіцыя плануе заклікаць лю-дзей на плошчу пасьля заканчэньня прэзідэнцкіх выбараў і ўчыніць там крывавыя правакацыі. 16 сакавіка Сьцяпан Сухарэнка, а таксама старшыня МУС Уладзімір Навумаў і Генпракурор Пётр Міклашэвіч пагражалі ў тым ліку і сьмяротным пакараньнем за выхад на плошчу ў дзень выбараў. Старшыня КДБ заявіў: "15 сакавіка КДБ распачаў крымінальную справу па артыкуле 290 Крымінальнага кодэксу "пагроза ўчыненьня тэрарыстычнага акту". Нам вядомыя падазраваныя, тыя з іх, хто зьяўляюцца замежнымі грамадзянамі, пры зьяўленьні на тэрыторыі Беларусі, будуць прыцягнутыя да адказнасьці па нашых законах. Гэта ня спроба запалохаць народ напярэдадні выбараў, гэта іх ценявы бок. Праваахоўныя органы валодаюць інфармацыяй, сіламі і сродкамі, каб прадухіліць тое, што рыхтуюць актывісты апазіцыі: выбухі, падпалы і іншыя дзеяньні, накіраваныя на дэстабілізацыю становішча. Дзеяньні людзей, якія прыйдуць на плошчу 19 сакавіка, будуць расцэненыя як тэрарызм, што прадугледжвае пакараньне па розных артыкулах ад 8 гадоў да сьмяротнай кары". Міністр унутраных справаў дадаў, што з 10 сакавіка ўнутраныя войскі нясуць службу ва ўзмоцненым рэжыме, а таксама нагадаў, што колькасны склад МУС – 50 тысячаў чалавек.

Нягледзячы на запалохваньні, некалькі дзясяткаў тысячаў грамадзянаў Беларусі выйшлі ўвечары 19 сакавіка на Кастрычніцкую плошчу ў г. Менску. Масавыя затрыманьні пачаліся на наступны дзень, калі на плошчы ўдзельнікамі мірнай акцыі пратэсту былі ўсталяваныя намёты. Супрацоўнікі міліцыі затрымлівалі ўсіх, хто нёс на плошчу цёплыя рэчы, ежу ці проста ішоў выказаць падтрымку, кваліфікуючы гэтыя дзеяньні як “дробнае хуліганства”. Ліквідаванае намётавае мястэчка было ў ноч з 23 на 24 сакавіка, сотні лю-дзей арыштаваныя.

25 сакавіка ў Менску адбыліся дэманстрацыя і мітынг з нагоды Дня Незалежнасьці. Мірная акцыя была жорстка разагнаная сьпецпадразьдзяленьнямі МУС пад кіраўніцтвам камандзіра САХРу Дзьмітрыя Паўлічэнкі, калі ўдзельнікі накіраваліся да сьпецпрыёмніка, дзе знаходзіліся сотні арыштаваных за ўдзел у акцыі пратэсту на Кастрычніцкай плошчы. Калона дэманстрантаў, якая рухалася па ходніках, была атакаваная сьпецназам, які выкарыстаў супраць мірных людзей сьпецсродкі: гумавыя палкі, выбуховыя прыстасаваньні. Некалькі чалавек у выніку былі параненыя і шпіталізаваныя “хуткай дапамогай”. У  гэты ж дзень быў затрыманы і зьмешчаны ў СІЗА г. Жодзіна экс-кандыдат у прэзідэнты А. Казулін. Сярод вылучаных супраць яго абвінавачаньняў – арганізацыя 25 сакавіка групавых дзеяньняў, якія груба парушылі грамадзкі парадак (арт. 342 Крымінальнага кодэксу).

За перыяд з 20 па 25 сакавіка, па зьвестках Праваабарончага цэнтру “Вясна”, да адміністрацыйнай адказнасьці за ўдзел у мірных акцыях пратэсту ў г. Менску было асуджана 686 чалавек; яшчэ каля 50 чалавек — у рэгіёнах. Сярод вынесеных адміністрацыйных пакараньняў — толькі пяць штрафаў, астатнія — адміністрацыйныя арышты тэрмінам ад 4 да 15 сутак. Масавых затрыманьняў падобнага маштабу ў Беларусі яшчэ не было.

Улічваючы, што колькасьць месцаў у сьпецпрыёмніку-разьмеркавальніку ГУУС Менгарвыканкаму была абмежаваная, арыштаваныя разьмяшчаліся ў іншых месцах — ІЧУ Менскага раёну, ІЧУ г.Жодзіна. Пры гэтым ніякай інфармацыі аб месцы знаходжаньня арыштаваных сваякам не паведамлялася – іх родныя па некалькі дзён намагаліся высьветліць лёс сваіх блізкіх. Сярод арыштаваных былі як беларускія, так і замежныя грамадзяне, а таксама журналісты.

Паказальны характар насіў арышт на 14 і 15 сутак зьняволеньня практычна ўсіх буйнейшых палітычных лідэраў краіны: экс-канды-

дата ў прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча, старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі, старшыні ліквідаванай уладамі Беларускай Партыі працы Аляксандра Бухвостава, старшыні Партыі камуністаў Беларускай Сяргея Калякіна, намесьніка старшыні Партыі БНФ Віктара Івашкевіча, моладзевага лідэра Зьмітра Дашкевіча. Усе яны былі асуджаныя за арганізацыю мітынгу і шэсьця падчас Чарнобыльскага шляху 26 красавіка ў Менску па арт. 167.1 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў), хаця акцыя была дазволеная гарадзкімі ўладамі і насіла выключна мірны характар.

У сітуацыі, калі атрымаць дазвол на правядзеньне масавага мерапрыемства вельмі складана, а арганізатары і ўдзельнікі, як правіла, затрымліваюцца і асуджаюцца ў адміністрацыйным парадку, вялікі распаўсюд атрымала практыка правядзеньня флэш-мобаў: калі вялікая група людзей зьбіраецца ў папярэдне вызначаным месцы, праводзіць нейкую кароткую акцыю і хутка разыходзіцца. Аднак і такія хуткаплынныя і абсалютна бясшкодныя для грамадзкага парадку мерапрыемствы разганяліся супрацоўнікамі праваахоўных органаў, а іх удзельнікі затрымліваліся.

28 красавіка каля трохсот чалавек, у асноўным студэнты сталічных універсітэтаў, правялі ў Менску флэш-моб у падтрымку газеты “Наша Ніва”. Удзельнікі акцыі прайшлі па ходніку шэсьцем ад Кастрычніцкай плошчы да плошчы Перамогі, трымаючы ў руках асобнікі выданьня. Больш за дзясятак флэш-мобераў былі затрыманыя і дастаўленыя ў аддзяленьне міліцыі Цэнтральнага раёну сталіцы.

Пяцёра студэнтаў і адзін школьнік былі затрыманыя 21 верасьня ў Менску пасьля флэш-мобу ў падтрымку палітзьняволеных. Удзельнікі акцыі ўвечары на Кастрычніцкай плошчы пускалі мыльныя пузыры, дэманструючы, што абвінавачаньні супраць палітыкаў і грамадзкіх актывістаў надуманыя і беспадстаўныя.

Свабода сходаў, якая зьяўляецца адной з каштоўнасьцяў дэмакратычнага грамадзтва, на жаль, у сёньняшняй Беларусі гарантаваная толькі дэкларатыўна. На практыцы вялікая колькасьць грамадзянаў краіны ня толькі ня могуць скарыстацца гэтым правам, але і падпадаюць пад адміністрацыйны і крымінальны перасьлед. Суды па дадзеных справах выносяць выключна абвінаваўчыя рашэньні і фактычна зьяўляюцца толькі фармальнасьцю.

# 9. Дыскрымінацыя грамадзянаў па прыкметах мовы і нацыянальнай прыналежнасьці. Парушэньне правоў грамадзянаў на свабоду веравызнаньня

У Беларусі працягваецца пасьлядоўная палітыка русіфікацыі і дэнацыяналізацыі беларускага народу, якая зьяўляецца, па-сутнасьці, працягам нацыянальнай палітыкі, што праводзілі ўлады яшчэ Расейскай імперыі, а затым Савецкага Саюзу. І калі асноўнай мэтай такой палітыкі ў Савецкім Саюзе была пабудова ў персьпектыве адносна аднароднага ў нацыянальным плане грамадзтва і зьмяншэньне небясьпекі канфліктаў на нацыянальнай глебе, дык працяг такой палітыкі на сучасным этапе ў суверэннай Беларусі зьяўляецца яскравым “пасылам” для прасавецкі настроеных беларускіх грамадзянаў пра ідэалагічную пераемнасьць дыктатуры Савецкага Саюзу і сёньняшняга беларускага рэжыму. Руская мова, таксама як палітычная тапаніміка, якая ў асноўным захавалася з савецкіх часоў, дзяржаўная сімволіка, надзвычай набліжаная да савецкай, зьяўляецца сімвалам “савецкасьці” беларускага рэжыму. Руская мова, як інструмент кіраваньня шматнацыянальным грамадзтвам, засталася сёньняшняму беларускаму рэжыму ў спадчыну ад былой савецкай каланіяльнай сістэмы.

Нягледзячы на тое, што падчас апошняга перапісу каля 80 адсоткаў беларусаў назвалі роднай мовай беларускую, у краіне пры адміністрацыйным садзеяньні дзяржаўных органаў і органаў адукацыі працягвае няўхільна скарачацца колькасьць беларускіх школаў і вучняў, якія вучацца па-беларуску. А бацькі, якія дабіваюцца беларускамоўнага навучаньня, сустракаюць процідзеяньне мясцовых органаў улады.

Працягваецца палітыка Міністэрства адукацыі РБ, накіраваная на выцясьненьне беларускай мовы з навучальнага працэсу. Так, у 2006 годзе Міністэрствам адукацыі прынятае рашэньне, накіраванае на абмежаваньне выкладаньня ў школах прадмету “Гісторыя Беларусі” на беларускай мове. У знак пратэсту 1 верасьня актывісты беларускіх моладзевых арганізацыяў у цэнтры Менску наладзілі акцыю пратэсту ў выглядзе флэш-мобу.

Нягледзячы на неаднаразовыя звароты беларускай грамадзкасьці, зборы подпісаў, у Беларусі не існуе ніводнай вышэйшай навучальнай установы, дзе б выкладаньне вялося па-беларуску.

Адсутнічае рэальнае раўнапраўе, гарантаванае Канстытуцыяй Беларусі, беларускай і рускай моваў у галіне заканатворчасьці (заканадаўства прымаецца і публікуецца на рускай мове), правасудзьдзя, у працы дзяржаўных і адміністрацыйных органаў рознага ўзроўню (абсалютная большасьць дзяржаўных чыноўнікаў ад міністраў і ніжэй не выкарыстоўвае беларускую мову ў сваёй дзейнасьці нават пры стасунках з беларускамоўнымі грамадзянамі), у банкаўскай і фінансавай сістэме (усе кампутарызаваныя сістэмы аплаты рахункаў і іншых фінансавых аперацыяў разьлічаныя толькі на рускую мову), у войску, памежных і мытных службах, у медыцыне, спорце, маркіроўцы беларускай прамысловай прадукцыі ды іншых сферах дзяржаўнага і грамадзкага жыцьця выкарыстоўваецца толькі руская мова.

Беларуская мова фактычна зьнікла з асноўных тэле- і радыёканалаў, а публічна ўжываецца як самім А.Лукашэнкам, так і іншымі “зоркамі” беларускага тэлебачаньня, у большасьці выпадкаў у зьняважлівым і грэблівым сэнсе.

Падвяргаюцца цэнзураваньню, замоўчваньню, не друкуюцца ў дзяржаўных выдавецтвах і СМІ, перасьледуюцца іншым чынам (праз забарону публічных выступаў і сустрэчаў, публічнае шальмаваньне і зьнявагу) беларускамоўныя пісьменьнікі ды іншыя дзеячы культуры, якія адкрыта выступаюць у абарону беларускай мовы і культуры супраць палітыкі русіфікацыі і дэнацыяналізацыі, якую праводзяць беларускія ўлады.

Такім чынам, у Беларусі склалася ўнікальная сітуацыя моўнай дыскрымінацыі тытульнай нацыі, якая складае 81,2 працэнтаў ад агульнай колькасьці жыхароў Беларусі (па выніках перапісу 1999 году).

Палітыка падаўленьня ўсяго нацыянальнага распаўсюджваецца і на нацыянальныя меншасьці ў Беларусі. У першую чаргу гэта датычыцца польскай нацыянальнай меншасьці, якая складае даволі кампактную і колькасна значную групу насельніцтва ў Беларусі (па дадзеных перапісу 1999 году, каля 400 тысячаў чалавек). На працягу апошніх гадоў існуюць праблемы з разьвіцьцём польскамоўнай адукацыі ў Беларусі, якая набывае тэндэнцыі да звужэньня і сутыкаецца з супрацьдзеяньнем урадавай адміністрацыі.

Працягваецца перасьлед грамадзкіх дзеячоў, якія прадстаўляюць польскую нацыянальную меншасьць, у прыватнасьці, старшыні непрызнанага ўладамі “Саюзу палякаў на Беларусі” Анжалікі Борыс,

якая на працягу 2006 году шмат разоў выклікалася ў пракуратуру з розных прычынаў. У адносінах да актывістаў аб'яднаньня неаднаразова на працягу году выкарыстоўваліся рознага кшталту правакацыі. 29 кастрычніка Анжаліка Борыс і некалькі актывістаў СПБ былі затрыманыя на мяжы з Літвой, і ў выніку агляду іх аўтамабіля быў "знойдзены" пакунак з наркотыкам, па дадзеным факце была ўзбуджаная крымінальная справа. Ніяк інакш як «правакацыяй беларускіх праваахоўных органаў» не расцанілі дзеяньні праваахоўных органаў актывісты СПБ. 5 лістапада супраць кіраўніка Гарадзенскага гарадзкога аддзелу аб'яднаньня Мечыслава Яскевіча была ўзбуджаная крымінальная справа за "хуліганства" па абвінавачаньні ў разьвязваньні бойкі.

На працягу году неаднаразова фіксаваліся антысеміцкія інцыдэнты, прычым беларускія ўлады адмаўляліся прызнаць іх антысеміцкі характар. Так, у лістападзе на фасадзе будынку Ізраільскага інфармацыйна-культурнага цэнтру былі намаляваныя свастыкі і зробленыя надпісы "Бей жидов", але органы міліцыі адмовіліся расьсьледаваць гэты выпадак. Па словах начальніка аддзелу аховы правапарадку ўпраўленьня ўнутраных справаў Партызанскага раёну Менску Аляксандра Кальцова, у дадзеным факце "не заўважана наўмысных дзеяньняў, скіраваных на распальваньне нацыянальнай варожасьці, зьнявагу нацыянальнага гонару і годнасьці". Амбасада Ізраілю зьвярнулася ў праваахоўныя органы краіны з заклікам перагледзець рашэньне пра адмову ва ўзбуджэньні кры-мінальнай справы. "Нам падаецца надзвычай дзіўным, — заявіў ізраільскі амбасадар, — што ў Беларусі існуюць дзяржаўныя служачыя, тым болей у органах аховы правапарадку, якія лічаць надпісы "Бей жидов» і выявы свастыкі толькі забруджваньнем сьценаў" (нагадаем, арт. 130 Крымінальнага кодэксу прадугледжвае крымінальную адказнасьць за распальваньне нацыянальнай, расавай, рэлігійнай і іншай варожасьці).

Спыненае расьсьледаваньне і крымінальнай справы адносна апаганьваньня мемарыялу ахвярам Халакосту "Яма" на вуліцы Мельнікайтэ ў Менску. 15 лістапада на абеліск помніку была нанесеная свастыка, белай фарбай запэцканыя фігуры бронзавай скульптурнай кампазіцыі "Апошні шлях", а побач раскіданыя ўлёткі, якія заклікалі да барацьбы з "іюдаізмам і масонствам – ворагамі і здраднікамі Айчыны" за подпісам Фронту арыйскага супраціву "Белая Русь". Сьледзтва спыненае па прычыне "невысьвятленьня асобы, якая падлягае прыцягненьню ў якасьці абвінавачваемай".

Сітуацыя са свабодай сумленьня ў Беларусі заставалася трывожнай. Большасьць выпадкаў парушэньня правоў вернікаў былі зьвязаныя з дыскрымінацыяй і наступствамі выкарыстаньня заканадаўства аб веравызнаньні 2002 году, якое замацавала няроўны статус канфесіяў.

У Беларусі не дазваляліся сходы вернікаў для супольнай малітвы, сьвятары прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасьці і арыштоўваліся за правядзеньне рэлігійных сходаў ды набажэнстваў у прыватных кватэрах, адбіралася маёмасьць непажаданых канфесіяў, ствараліся перашкоды для місіянерскай дзейнасьці і высылаліся з краіны сьвятары з небеларускім грамадзянствам, ствараліся перашкоды для рэгістрацыі рэлігійных суполак. Міжнародныя эксьперты неаднаразова выказвалі трывогу, што дзеючы закон аб свабодзе веравызнаньня абмяжоўвае дзейнасьць многіх рэлігійных супольнасьцяў. Адначасова праваслаўная царква набывае ўсё большую перавагу над іншымі канфесіямі, у тым ліку праз урадавыя дамовы пра супрацоўніцтва і стварэньне прэферэнцыяў у сферы адукацыі.

Так, 3 сакавіка адбыўся суд над прэсьвітэрам Менскай царквы евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў “Запавет Хрыста” Георгіем Вязоўскім за правядзеньне малітоўнага сходу. Суд Партызанскага раёну Менску прызнаў яго вінаватым у парушэньні арт. 167.1 КаАП (парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавага мерапрыемства) і прысудзіў яму меру спагнаньня ў выглядзе арышту тэрмінам на 10 сутак. Аналагічны выпадак адбыўся ў траўні ў вёсцы Повітс Берасьцейскай вобласьці, дзе пастар Ільля Радкевіч быў аштрафаваны за правядзеньне малітоўнага сходу. У Менскім раёне пастар Сяргей Свор быў таксама абвінавачаны ў правядзеньні несанкцыянаванага сходу. Падчас адміністрацыйнай вытворчасьці па дадзенай справе былі канфіскаваныя Бібліі, якія так і не вярнулі сьвятару.

24 сакавіка юрыст зарэгістраванай грамадзкай арганізацыі “Хрысьціянская дзелавая ініцыятыва” Сяргей Шаўцоў за правядзеньне семінару па праблемах хрысьціянскага погляду на гісторыю быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці і асуджаны на 10 сутак адміністрацыйнага арышту.

2 ліпеня Сяргея Пазьняковіча, пастара баранавіцкай царквы пяцідзясятнікаў “Збаўленьне”, за правядзеньне абраду масавага хрышчэньня Баранавіцкі суд аштрафаваў на чатыры мільёны рублёў. Прычынай судовага перасьледу стала тое, што на хрост не было дазволу мясцовых уладаў. Чыноўнікі не далі афіцыйнага

дазволу, матывуючы адмову тым, што вада не адпавядае санітарным нормам. Да гэтага гарадзкія ўлады штрафавалі пастара на 100 000 рублёў за несанкцыянаванае набажэнства.

6 жніўня суд Маскоўскага раёну Менску прыняў пастанову аштрафаваць пастара царквы “Новае жыцьцё” Вячаслава Ганчарэнку на 30 базавых велічыняў за арганізацыю несанкцыянаванага багаслужэньня 4 чэрвеня. Судовае паседжаньне адбылося без Вячаслава Ганчарэнкі.

У сакавіку менскай суполцы хасідаў двойчы адмовілі ў дазволе на правядзеньне рэлігійнага сходу з нагоды сьвята Вялікадня. Рэлігійны сход суполка зьбіралася праводзіць у закрытым памяшканьні, і на гэта была заключаная дамова з уладальнікам залы.

9 жніўня мясцовыя ўлады пры дапамозе вайскоўцаў памежнай службы прымусовым чынам вывезьлі ў Менск удзельнікаў хрысьціянскага сямейнага летніку. Адпачынак, арганізаваны шматдзетнымі сем’ямі, праходзіў у в. Ціжышкі Смаргонскага раёну Гарадзенскай вобласьці на тэрыторыі і ў будынках, якія зьяўляюцца прыватнай уласнасьцю. Усяго на адпачынку знаходзілася каля 60 чалавек, з іх — 45 дзяцей. Бацькі накіравалі скаргу ў Менгарвыканкам, і ў адказе, падпісаным намесьнікам старшыні гарвыканкаму М. С.Ціцянковым было сказана, што “рашэньне аб спыненьні калектыўнага адпачынку на хутары было абумоўленае неабходнасьцю ліквідацыі прычынаў, якія пагражалі жыцьцю і здароўю дзяцей”. Удзел супрацоўнікаў Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў тлумачыўся “прыналежнасьцю часткі бацькоў і дзяцей да рэ-лігійных абшчынаў хрысьціянаў Поўнага Евангельля і неабходнасьцю высьвятленьня абставінаў арганізацыі калектыўнага знаходжаньня на хутары”. Пры гэтым у лісьце было напісана што, “паўнамоцтвы службовых асобаў перавышаныя не былі”.

18 красавіка пракуратура Ленінскага раёну Магілёву вынесла папярэджаньне супрацоўніцы габрэйскага дзіцячага садку Л. Ізаксан-Баўтоўскай за правядзеньне з дзеткамі “рэлігійнага сьвята” Пурым і выкарыстаньне ў сваёй працы “рэлігійнай сімволікі” ў выглядзе сямісьвечніка і зоркі Давіда.

У верасьні сямі ксяндзам і пяці сёстрам з Польшчы, якія працавалі на Гарадзеншчыне, беларускія ўлады адмовіліся працягнуць візы. Спробы дамагчыся адмены гэтага рашэньня аказаліся марнымі, і да канца сьнежня вышэйназваныя духоўныя асобы павінны былі пакінуць тэрыторыю Беларусі. Улады тлумачылі такое рашэньне патрэбай уладкаваць на вызваленыя месцы маладых сьвятароў

і сясьцёр — беларускіх грамадзянаў. Разам з тым, касьцёл кіруецца ўласным правам, і толькі біскуп, а ня сьвецкія ўлады, вырашаюць, якога сьвятара і на якую пасаду прызначыць.

На 78-гадовага ксяндза Антонія Кочку, грамадзяніна Польшчы, супрацоўнікі міліцыі склалі два адміністрацыйныя пратаколы. Паводле дакументаў, А.Кочка парушыў правілы знаходжаньня замежных грамадзянаў на тэрыторыі краіны, бо «не прайшоў абавязковую дзяржаўную рэгістрацыю пры ўезьдзе на тэрыторыю Беларусі». Па-другое, сьвятар праводзіў набажэнства ў касьцёле, ня маючы на гэта дазволу. У адпаведнасьці з беларускім заканадаўствам, замежныя сьвятары для занятку рэлігійнай дзейнасьцю павінны атрымаць дазвол Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў пры Савеце Міністраў, якога ў А. Кочкі не было. Ксёндз нарадзіўся ў Берасьцейскім раёне, дзе дагэтуль жывуць яго сваякі, і апошнія 15 гадоў служыў у вёсцы Замосьце Слуцкага раёну Менскай вобласці. Знаходзячыся праездам у Менску, 22 верасьня ён адслужыў імшу ў Чырвоным касьцёле, пасля чаго быў затрыманы прадстаўнікамі праваахоўных органаў і аштрафаваны на дзьве базавыя велічыні.

30 кастрычніка пастара царквы Хрысьціянаў веры евангельскай у г.Крупкі Менскай вобласьці Мікалая Барычэўскага выклікалі ў РАУС і склалі пратакол за пражываньне ў горадзе без прапіскі. Пастар прапісаны ў Менску, аднак амаль дзесяць апошніх гадоў жыў і працаваў у Крупках. А 23 лістапада Барычэўскага выклікалі ў райвыканкам і запатрабавалі прадставіць яго пазіцыю па стаўленьні да ўладаў, паказваючы пры гэтым дакументы адносна яго з КДБ Менскай вобласьці.

У Берасьці беларускія чыноўнікі па ўзгадненьні з мясцовымі сьвятарамі Маскоўскага патрыярхату аказвалі ціск на прыхаджанаў Рускай праваслаўнай царквы за мяжой з мэтай прымусіць іх адклікасьць свае подпісы з заявы на рэгістрацыю рэлігійнай суполкі. Пры гэтым яны наведвалі кватэры тых, хто паставіў подпісы ў заяве аб рэгістрацыі прыходу РПЦЗ, і прымушалі ад іх адмовіцца. Нагадаем, што часткай працэдуры рэгістрацыі зьяўляецца падпісаньне як мінімум 20 грамадзянамі Беларусі заявы аб намеры стварыць рэлігійную арганізацыю, пры гэтым падпісанты павінны пазначыць сваё поўнае імя, адрас, дату нараджэньня і паставіць подпіс.

У ноч з 10 на 11 лістапада быў ўчынены акт вандалізму адносна царквы “Збаўленьне” (Саюз хрысьціянаў веры евангельскай) у

Баранавічах. Чорнай фарбай невядомыя напісалі “Не верь сектам” ды закідалі камянямі і пустымі пляшкамі ад піва шыльду памерам 5 на 2,5 м (гэты інфармацыйны білборд даваў адрас і тэлефон рэлігійнай грамады) на скрыжаваньні вуліцаў Тэльмана і Першукевіча.

25 сьнежня невядомыя падпалілі драўляную царкву Сьвятога Георгія Пераможцы ў Мазыры, выратаваць будынак не атрымалася. Для падпалу зламысьнікі выкарысталі дызпаліва, якім аблілі куты храму знутры. На сьценах будынку падпальшчыкі выгравіравалі надпісы сатанінскага зьместу. Па факце падпалу была ўзбуджаная крымінальная справа.

15 верасьня Епархіяльная рада Беларускай праваслаўнай царквы “параіла” айцу Аляксандру Шрамку кінуць дзейнасьць у Інтэрнэце і засяродзіць свае высілкі непасрэдна на пастырстве. Гэта было зьвязана з тым, што айцец Аляксандр пісаў публіцыстычныя артыкулы на актуальныя пытаньні царкоўнага жыцьця ў Беларусі і публікаваў на сайце «Царква» і ў сваім блогу ў сістэме livejournal. com. Рэферэнт па сувязях са СМІ Беларускага экзархату архімандрыт Аляксей (Шынкевіч) адзначыў, што ў сваіх публікацыях айцец Аляксандр Шрамко выяўляў меркаваньні, якія «не адпавядаюць высокаму сану праваслаўнага сьвятара» і якія выклікалі негатыўную рэакцыю сярод праваслаўных інтэрнэт-карыстальнікаў.

2006 год адзначаны актыўнасьцю вернікаў-пратэстантаў і рымакатолікаў, якія арганізоўвалі акцыі пратэсту, зборы подпісаў і нават масавыя галадоўкі дзеля таго, каб адстаяць свае правы на свабоду веравызнаньня.

На пачатку году больш за 1000 жыхароў Барысаву, Маладэчна, Вілейкі, Жодзіна сабралі подпісы з патрабаваньнем вярнуць у Беларусь ксяндза Роберта Кшывіцкага, пробашча Барысаўскага касьцёлу, якому было адмоўлена ў падаўжэньні візы. Падпісанты былі “абураныя тым фактам, што з надуманай прычыны беларускіх грамадзянаў пазбаўляюць магчымасьці ажыцьцяўляць сваё права на свабоду рэлігійных перакананьняў”.

У кастрычніку доўгатэрміновае супрацьстаяньне менскай пратэстанцкай царквы “Новае жыцьцё” і ўладаў перайшло ў масавую галадоўку вернікаў, якія пратэставалі супраць адабраньня ў іх уладамі малельнага будынку. Галадоўка цягнулася 23 дні. Гэты маштабны канфлікт набыў шырокі розгалас у грамадзтве. Іван Пашкевіч, саветнік Старшыні саюзу евангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў, назваў

усе падзеі, зьвязаныя з ціскам на царкву “Новае жыцьцё” і арыштамі пратэстанцкіх святароў, “вайной з пратэстантамі”.

У Гародні з 1 па 6 сьнежня каталікі-вернікі разам з ксяндзом Аляксандрам Шэметам праводзілі галадоўку з прычыны таго, што на працягу 9 гадоў іх парафія не магла атрымаць дазвол на пабудову касьцёлу. У выніку абласныя ўлады пагадзіліся выканаць іх патрабаваньне.

У канцы сьнежня група вернікаў з вёсак Лаздуны і Юрацішкі Іўеўскага раёну таксама праводзіла галадоўку ў знак пратэсту супраць прыпыненьня візы для рыма-каталіцкага ксяндза, грамадзяніна Польшчы М.Ільяшэвіча, які некалькі гадоў ужо працаваў у Беларусі.

## 10. Ціск сьпецслужбаў на палітычна і грамадзка актыўных грамадзянаў

Адметнасьцю 2006 году зьяўляецца актыўнае ўключэньне Камі-тэту дзяржаўнай бясьпекі ў барацьбу з апанентамі рэжыму. У папярднія гады органы КДБ імкнуліся максімальна абстрагавацца ад прамога перасьледу актывістаў дэмакратычных арганізацыяў і партыяў, скіроўваючы сваю дзейнасьць у асноўным на вярбоўку, сачэньне за імі і праслухоўваньне тэлефонаў. Зараз жа КДБ зрабілася асноўным сегментам рэпрэсіўнай машыны, і па стылі сваёй працы, маштабах рэпрэсіяў стала нагадваць КДБ былога СССР.

Падчас кампаніі па выбарах прэзідэнта амаль кожны дзень праводзілісяператрусы ў кватэрах актывістаў, штабах дэмакратычных кандыдатаў. Нават каліператрусы праводзіліся фармальна па ініцыятыве сьледчых органаў МУС, па санкцыі пракуратуры на такіхператрусах заўсёды прысутнічалі прадстаўнікі КДБ, непасрэдна кіруючы працэдурай і цікавячыся любымі носьбітамі інфармацыі, выяўленымі падчас сьледчых дзеяньняў.

21 лютага супрацоўнікі ўпраўленьня Камітэту дзяржбясьпекі па Магілёўскай вобласьці правяліператрус у кватэры Аксаны Закрэўскай і канфіскавалі аргтэхніку. Пры гэтым яны заявілі, штоператрус праводзіцца паводле крымінальнай справы аб паклёпе на прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, аднак не патлумачылі, хто праходзіць па гэтай справе і якое дачыненьне да паклёпу мае сама спадарыня Закрэўская. У гэты ж дзень у Быхаве абшукалі кватэру бацькоў Аляксея Купрэева. Як высьветлілася з цягам часу, гэтыя

ператрусы праводзіліся ў межах крымінальнай справы адносна дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі “Партнёрства”.

Адчувальным быў ціск КДБ на шматлікіх асобаў, якія так альбо інакш былі зьвязаныя з выбарчым прэцэсам. Ігар Кучынскі з Берасьця, вылучаны ў якасьці назіральніка шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў на адзін з участкаў, пасьля трох дзён датэрміновага галасаваньня быў выкліканы ва ўпраўленьне КДБ. Запалоханы сьпецслужбамі, ён адмовўся ад далейшага назіраньня.

Перасьлед грамадзкіх актывістаў зьяўляўся не адзіным “метадам працы” сьпецслужбаў падчас прэзідэнцкай кампаніі. КДБ далучыўся да дзяржаўных СМІ ў распальваньні істэрыі і страху сярод беларускага грамадзтва. На адной з прэс-канферэнцыяў старшыня КДБ С. Сухарэнка заявіў, што палітычнай апазіцыяй рыхтуюцца тэрарыстычныя акты на выбарчых участках, а таксама выбухі падчас масавых акцыяў пратэсту. У “доказ” па тэлебачаньні быў прадэманстраваны запіс невядомага чалавека, які распавядаў, што ён зьбіраўся ўзрываць школы ў Менску, а падрыхтоўку прайшоў у адмысловых лагерах у Грузіі. Генеральны пракурор П.Міклашэвіч пракаментаваў, што асобы, якія прымуць удзел у пасьлявыбарчых акцыях пратэсту, будуць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасьці за “спробы зьвяржэньня канстытуцыйнага ладу гвалтоўным чынам” (санкцыя дадзенага артыкулу прадугледжвае ў тым ліку і сьмяротнае пакараньне).

Падобныя заявы вышэйшых асобаў сілавых органаў дзяржавы ня мелі нічога агульнага з прававой ацэнкай магчымых дзеяньняў грамадзянаў, а яскрава засьведчылі, што сёньняшнія КДБ і Пракуратура не выконваюць тых функцыяў, якія на іх ускладаюцца дзеючым заканадаўствам. У адпаведнасьці з Законам “Аб органах дзяржаўнай бясьпекі Рэспублікі Беларусь”, КДБ у сваёй дзейнасьці кіруецца прынцыпамі законнасьці, павагі і захаваньня правоў і свабодаў асобы, гуманізму. У адпаведнасьці з Законам “Аб пракуратуры Рэспублікі Беларусь”, гэтыя органы ажыцьцяўляюць агульны кантроль за дзейнасьцю органаў дзяржаўнай улады. Разам з тым, надзвычай сур’ёзныя абвінавачаньні старшыні КДБ так і не выліліся ў крымінальную справу, а органы пракуратуры так і не далі ацэнку гэтым заявам. Гэта стала пацьвярджэньнем таго, што заявы вышэйшых асобаў КДБ і Пракуратуры не грунтаваліся на фактах і сьведчаньнях, здабытых у выніку аператыўна-вышукных дзеяньняў, а зьяўляліся элементам агульнай кампаніі па запалохваньні беларускага грамадзтва.

Адным з асноўных відаў дзейнасьці КДБ працягвалі заставацца вярбоўкі і ціск па месцы працы ці вучобы грамадзка-актыўных грамадзянаў. Асаблівы размах такая незаконая дзейнасьць атрымала ў другой палове году, і ў першую чаргу была скіраваная на студэнтаў – сяброў розных моладзевых арганізацыяў і ініцыятываў ці проста палітычна актыўных маладых людзей. Часта кантакты КДБ з моладзьдзю арганізоўваліся пры садзеяньні адміністрацыяў навучальных установаў: студэнтаў выклікалі ў дэканаты, дзе іх чакалі супрацоўнікі КДБ, якія праводзілі “гутаркі”. Такім чынам, адміністрацыі ВНУ наўпрост аказваліся ўключанымі ў агульную сістэму ціску і запалохваньня, недапушчэньня палітычнай актыўнасьці моладзі. Пры гэтым большасьць кіраўнікоў навучальных установаў нават не задаваліся пытаньнем адносна законнасьці дзейнасьці супрацоўнікаў сьпецслужбаў.

21 красавіка студэнтаў БНТУ, якія былі затрыманыя падчас акцыяў 19-25 сакавіка, выклікалі ў рэктарат, дзе з імі размаўляў старэйшы ўпаўнаважаны КДБ Дзьмітрый Міхайлавіч Сьвістун. Сваё імя суппрацоўнік КДБ быў вымушаны назваць пасьля таго, як студэнт 2-га курсу Андрэй Шумароў катэгарычна адмовіўся размаўляць з незнаёмым чалавекам. Андрэю было прапанаванае супрацоўніцтва з КДБ, а ў выпадку адмовы — праблемы ў здачы сесіі. Студэнта 3-га курсу Міхаіла Літвінава супрацоўнік Камітэту дзяржбясьпекі вербаваць не спрабаваў, але пагражаў адлічэньнем з універсітэту за ўдзел ў грамадзкіх акцыях пратэсту.

Пасьля затрыманьня 16 красавіка за ўдзел у Дні салідарнасьці на студэнта БДУ Сяргея Карповіча пачаўся ціск з боку КДБ. Ад адміністрацыі універсітэту супрацоўнікі КДБ запатрабавалі “прыняць меры ўзьдзеяньня” адносна яго, а потым з іх дазволу забралі з заняткаў дзеля “размовы пра апазіцыю”.

У верасьні Сяргея Палуяна, студэнта Гомельскага дзяржаўнага універсітэту імя Ф.Скарыны, выклікалі да універсітэцкага ваенкома нібыта выправіць нейкія хібы ў дакументах. Падчас гэтага наведваньня студэнту прапанавалі прайсьці ў кабінет з шыльдаю “Сьпецаддзел”, дзе яго чакаў чалавек, які назваўся супрацоўнікам Камітэту дзяржбясьпекі. Прадстаўнік КДБ спачатку пацікавіўся месцам працы бацькоў студэнта, а пасьля гэтага пачаў распытваць пра ўдзел Сяргея ў штомесяцовых акцыях салідарнасьці. Не атрымаўшы ніякай інфармацыі ад Палуяна, супрацоўнік КДБ выклікаў “на размову” студэнтку таго ж універсітэту Вольгу Буранкову.


6 кастрычніка дырэктар Магілёўскага ліцэю № 5 прадаставіў

свой кабінет супрацоўнікам КДБ, якія спрабавалі завербаваць навучэнца Алеся Анісімава. Маладому чалавеку была прапанаваная дапамога ў паступленьні ў школу міліцыі, калі той будзе прадастаўляць інфармацыю пра грамадзкіх актывістаў Хрысьціну Шацікаву і Яўгена Суворава. Акрамя Анісімава, падобныя прапановы атрымалі таксама Уладзімір Шчыцінін і Яўген Адзінец. Усе хлопцы ад супрацоўніцтва адмовіліся.

Спробы вярбоўкі прадпрымаліся і адносна студэнтаў Паўла Краўчанкі, Яны Карповіч, Андруся Ігнатовіча, Вольгі Семчанкі, Анастасіі Александровіч і іншых, пра што яны адкрыта заявілі ў прэсе.

Алесю Буракову позва на “дачу тлумачэньняў” у КДБ па Магілёўскай вобласьці была дастаўленая па месцы працы — ён быў выкліканы ў кабінет дырэктара цэнтральнага ўнівермагу, дзе працуе бухгалтарам. Дакумент не ўтрымліваў ні прозьвішча, ні пасады таго, хто яго падпісаў. 26 красавіка ва ўпраўленьні КДБ супрацоўнік Камітэту Ігар Грыбайла правёў з Алесем Бураковым гутарку пра “барацьбу з ворагамі зьнешнімі і ўнутранымі” — да апошняй катэгорыі быў аднесены і праваабаронца Валадар Цурпанаў, які прысутнічаў падчас размовы.

15 чэрвеня ў вёсцы Веранейкі Магілёўскай вобласьці ўчастковы міліцыянт і супрацоўнік КДБ правялі “размову” з журналістамі незарэгістраванай газеты “Вольны горад” Сяргеем Няроўным і Мікалаем Гердзіем, якія расцанілі гэта як акцыю запалохваньня.

Бабруйскі праваабаронца Ігар Хоцька быў выкліканы ў мясцовы КДБ у сьнежні — пасьля падачы дакументаў на рэгістрацыю яго кандыдатам у дэпутаты гарадзкога Савету. “Размова” адбылася з намесьнікам начальніка Бабруйскага КДБ, прычыны выкліку актывісту так і не патлумачылі, але прапанавалі супрацоўніцтва ў абмен на дэпутацтва.

У адпаведнасьці з ч.1 арт. 12 Закону “Аб органах дзяржаўнай бясьпекі Рэспублікі Беларусь”, могуць праводзіцца аператыўна-вышукныя мерапрыемствы, сьледчыя дзеяньні ў дачыненьні да асобаў, грамадзкіх арганізацыяў, дзейнасьць якіх скіраваная на гвалтоўнае зьвяржэньне ці зьмену канстытуцыйнага ладу, распальваньне расавай, рэлігійнай, нацыянальнай варажнечы ці розьні. Аднак у большасьці выпадкаў, зьвязаных з ціскам на грамадзка і палітычна актыўных грамадзянаў Беларусі, дзейнасьць КДБ была скіраваная не на абарону канстытуцыйнага ладу, а на недапушчэньне іх актыўнасьці.

У адпаведнасьці з арт. 14 вышэйназванага Закону, супрацоўнікі органаў дзяржаўнай бясьпекі маюць права ўсталёўваць на канфідэнцыйнай аснове адносіны супрацоўніцтва з асобамі, якія далі на тое згоду, гэта значыць — выключна на добраахвотнай аснове. Пры гэтым у дачыненьні да грамадзка-актыўных грамадзянаў органы КДБ фактычна не выкарыстоўваюць права, якое ім нададзена законам, а менавіта — “выклікаць службовых асобаў і іншых фізічных асобаў, атрымліваць ад іх тлумачэньні па справах і матэрыялах, якія знаходзяцца ў вытворчасьці органаў дзяржаўнай бясьпекі”. На практыцы найчасьцей дзейнасьць сьпецслужбаў скіраваная не на добраахвотнасьць, а на схіленьне да супрацоўніцтва шляхам пагрозаў стварэньня праблемаў па месцы вучобы ці працы ў выпадку адмовы.

Закон Рэспублікі Беларусь “Аб аператыўна-вышукной дзейнасьці” таксама рэгламентуе дзейнасьць дзяржаўных органаў, прадугледжваючы немагчымасьць схіленьня да супрацоўніцтва пры адсутнасьці добраахвотнасьці. Аднак падобная незаконная дзейнасьць сьпецслужбаў ажыцьцяўляецца з маўклівай згоды органаў пракуратуры і судоў.

## 11. Выкарыстаньне катаваньняў, жорсткага ці негуманнага абыходжаньня з затрыманымі, падсьледнымі і арыштаванымі

Артыкул 1 “Канвенцыі супраць катаваньняў ды іншых бесчалавечных альбо прыніжаючых відах абыходжаньня і пакараньня” (прынятая Генеральнай Асамблеяй ААН 10 сьнежня 1984 і ратыфікаваная Рэспублікай Беларусь 21 студзеня 1987 году) утрымлівае наступнае азначэньне: “Катаваньне – азначае любое дзеяньне, якім нейкай асобе наўмысна наносіцца моцны боль альбо пакута, фізічная альбо маральная, каб атрымаць ад яе альбо ад трэцяй асобы зьвесткі альбо прызнаньні, пакараць яе за дзеяньне, якое ўчыніла яна альбо трэцяя асоба ці ва ўчыненьні якога яна падазраецца, а таксама запалохаць ці прымусіць яе ці трэцюю асобу, альбо па любой прычыне, заснаванай на дыскрымінацыі любога характару, калі такі боль альбо пакута прычыняюцца дзяржаўнай службовай асобай ці іншай асобай, якая выступае ў афіцыйнай якасьці, альбо па іх падбухторваньні ці з іх ведама альбо маўклівай згоды”. Згодна з арт. 2 Канвенцыі, “кожная дзяржава-ўдзельніца прадпрымае

эфектыўныя заканадаўчыя, адміністрацыйныя, судовыя і іншыя меры для папярэджаньня актаў катаваньня на любой тэрыторыі пад яе юрысдыкцыяй".

Закон Рэспублікі Беларусь "Аб міжнародных дамовах Рэспублікі Беларусь" (арт. 13) прадугледжвае, што агульнапрынятыя прынцыпы міжнароднага права і нормы міжнародных дамоваў, якія ўступілі ў законную сілу, зьяўляюцца часткай дзеючага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь права.

У адпаведнасьці з арт. 25 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, ніхто не павінен падвяргацца катаваньням, жорсткаму, бесчалавечнаму альбо прыніжаючаму ягоную годнасьць абыходжаньню ці пакараньню, а таксама без ягонай згоды падвяргацца медыцынскім і іншым досьледам. Дадзенае палажэньне захоўвае сваю сілу пры любых выключных абставінах (вайсковае становішча ці пагроза вайны, унутраная палітычная нестабільнасьць і г.д.).

Недапушчальнасьць катаваньняў і адказнасьць за іх выкарыстаньне прадугледжваюць і іншыя законы і нарматыўныя акты Рэспублікі Беларусь.

Так, п. 3 арт. 11 Крымінальна-працэсуальнага кодэксу (КПК) гарантуе недапушчальнасьць гвалту, іншых жорсткіх ці прыніжаючых чалавечую годнасьць абыходжаньняў у адносінах да ўсіх удзельнікаў крымінальнага працэсу. Арт. 12 КПК забараняе пры вытворчасьці па матэрыялах і крымінальнай справе дзеяньні і рашэньні, якія прыніжаюць гонар і годнасьць альбо ствараюць небясьпеку для жыцьця і здароўя ўдзельнікаў крымінальнага працэсу. Наступствы і матэрыяльная кампенсацыя маральнай шкоды, прычыненай пры ўчыненьні злачынства альбо незаконнымі дзеяньнямі службовых асобаў, якія вядуць крымінальны працэс, ліквідуюцца і ажыцьцяўляюцца ў парадку, прадугледжаным КПК.

Шэраг артыкулаў Крымінальнага кодэксу прадугледжвае адказнасьць за катаваньні і іншыя віды жорсткага абыходжаньня з боку службовых асобаў. Так, арт. 128 (злачынствы супраць бясьпекі чалавека) прадугледжвае адказнасьць за дэпартацыю, незаконнае ўтрыманьне ў зьняволеньні, масавае ці сістэматычнае ажыцьцяўленьне пакараньня без суда, выкраданьне людзей, у выніку чаго наступае іх зьнікненьне, катаваньні ці акты жорсткасьці, якія ўчыняюцца ў сувязі з расавай, нацыянальнай, этнічнай прыналежнасьцю, палітычнымі перакананьнямі і веравызнаньнем грамадзянскага насельніцтва. Таксама крымінальную адказнасьць за выкарыста-

ньне катаваньняў прадугледжваюць ч. 3 арт. 394 (прымус да дачы паказаньняў) і ч. 3 арт. 426 (перавышэньне ўлады ці службовых паўнамоцтваў) Крымінальнага кодэксу.

Пры гэтым дзеючы Крымінальны кодэкс ня ўтрымлівае тлумачэньня тэрміну "катаваньне", хаця ён двойчы ўзгадваецца ў дыспазіцыях арт. арт. 128 і 394 КК. Частка 2 арт. 394 прадугледжвае крымінальную адказнасьць за прымус падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага, сьведкі да дачы паказаньняў альбо эксьперта да дачы заключэньня з выкарыстаньнем гвалту ці зьдзекаў. Частка 3 гэтага ж артыкулу прадугледжвае адказнасьць за гэтыя ж дзеяньні, але ўжо з выкарыстаньнем катаваньняў. Такім чынам, у дадзеным выпадку незразумела, што меў на ўвазе заканатворца пад тэрмінам "катаваньне", калі ён не ахоплівае паняткаў "гвалт" і "зьдзекі".

Што тычыцца дыспазіцыі ч. 3 арт. 426 Крымінальнага кодэксу, то яна хаця і ня ўтрымлівае панятку "катаваньне" як такога, але пералік злачынных дзеяньняў, дадзены ў гэтай часцы артыкулу, цалкам адпавядае тэрміну ў ягоным міжнародным разуменьні. Пад перавышэньнем службовых паўнамоцтваў у дадзеным выпадку разумеецца выкарыстаньне службовай асобай дзеяньняў, якія відавочна выходзяць за межы правоў і паўнамоцтваў, што яму прадастаўленыя па службе, спалучаныя з ужываньнем гвалту, пакутаў ці абразай пацярпелага ці выкарыстаньнем зброі і сьпецыяльных сродкаў.

Пытаньне дапушчальнасьці і ўмоваў выкарыстаньня фізічнай сілы, сьпецыяльных сродкаў і зброі рэгулюецца найперш Законамі "Аб міліцыі" і "Аб унутраных войсках Міністэрства ўнутраных справаў Рэспублікі Беларусь".

Паводле арт. 18 Закону "Аб міліцыі", міліцыя выкарыстоўвае фізічную сілу, сьпецыяльныя сродкі і агнястрэльную зброю, калі іншымі сродкамі выкананьне ўскладзеных на яе абавязкаў зьяўляецца немагчымым; зыходзячы з абставінаў па рашэньні супрацоўніка міліцыі ў выпадках, прадугледжаных дадзеным законам. Калі гэта магчыма, аб выкарыстаньні сілы, сьпецыяльных сродкаў і агнястрэльнай зброі павінна быць зробленае папярэджаньне аб намеры іх выкарыстаць. Сьпецыяльныя сродкі і агнястрэльная зброя не выкарыстоўваюцца супраць жанчын з бачнымі прыкметамі цяжарнасьці, непаўнагадовых, а таксама інвалідаў з відавочнымі прыкметамі інваліднасьці, за выключэньнем выпадкаў учыненьня імі ўзброенага нападу ці іншых дзеяньняў, якія пагражаюць жыцьцю і здароўю людзей. Ва ўсіх выпадках, калі пазьбегнуць выкарыстаньня фізічнай сілы, сьпецыяльных сродкаў і зброі немагчыма, суп-

рацоўнік міліцыі абавязаны імкнуцца нанесьці найменшую шкоду здароўю, гонару і годнасьці, маёмасьці грамадзянаў, а таксама забясьпечыць прадстаўленьне пацярпелым медыцынскай і іншай дапамогі. Аб раненьні ці сьмерці асобы ў выніку выкарыстаньня фізічнай сілы, сьпецыяльных сродкаў ці зброі супрацоўнік міліцыі абавязаны паведаміць непасрэднаму начальніку для паведамленьня пракурору. Падставы выкарыстаньня фізічнай сілы і сьпецыяльных сродкаў рэгулююцца арт. арт. 19 і 20 Закону.

Міліцыя выкарыстоўвае фізічную сілу, у тым ліку баявыя прыёмы барацьбы, дзеля спыненьня правапарушэньняў, самаабароны, пераадоленьня супрацьдзеяньня законным патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі, калі негвалтоўныя сродкі не забясьпечылі выкананьне ўскладзеных абавязкаў. Міліцыя выкарыстоўвае кайданкі, гумавыя дубінкі, сродкі зьвязваньня, сьпецыяльныя хімічныя рэчывы, сьветагукавыя прыстасаваньні адцягваючага ўвагу ўзьдзеяньня, вадамёты, бронемашыны і іншыя сьпецыяльныя і транспартныя сродкі, а таксама службовых жывёлаў для: 1) абароны ад нападу на грамадзянаў і супрацоўнікаў міліцыі; 2) вызваленьня закладнікаў; 3) абароны ад нападаў на будынкі, памяшканьні, збудаваньні і транспартныя сродкі незалежна ад іх прыналежнасьці альбо вызваленьня захопленых аб’ектаў; 4) спыненьня непадпарадкаваньня ці супраціву законным патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі і іншых асобаў, які выконваюць службовыя абавязкі па ахове грамадзкага парадку, спыненьні правапарушэньняў; 5) затрыманьня і дастаўленьня ў міліцыю ці іншае службовае памяшканьне асобаў, якія ўчынілі правапарушэньне ці адмаўляюцца засьведчыць сваю асобу, а таксама канваіраваньня і ўтрыманьня затрыманых і падвергнутых арышту, калі яны аказваюць непадпарадкаваньне ці супраціў, а таксама калі ёсьць падставы меркаваць, што яны могуць уцякчы і прычыніць шкоду сабе ці іншым; 6) спыненьня беспарадкаў і групавых дзеяньняў, якія парушаюць грамадзкі парадак. Від сьпецыяльнага сродку і інтэнсіўнасьць яго выкарыстаньня вызначаецца супрацоўнікам міліцыі самастойна, зыходзячы з абставінаў, характару правапарушэньня і асобы правапарушальніка.

Хаця заканадаўства Рэспублікі Беларусь прадугледжвае адказнасьць службовых асобаў за ўжываньне катаваньняў, колькасьць асобаў, асуджаных за іх выкарыстаньне, зьяўляецца вельмі нязначнай. Гэтая праблема ў Беларусі носіць латэнтны характар. Інфармацыя аб ужываньні катаваньняў і іншых жорсткіх відаў абыходжаньня з арыштаванымі ці затрыманымі па падазрэньні

ва ўчыненьні злачынства вельмі рэдка зьяўляецца прадметам галоснасьці. Тое ж самае датычыцца і сітуацыі ў беларускіх турмах і сьледчых ізалятарах.

Разам з тым выпадкі ўжываньня катаваньняў у дачыненьні да палітычных і грамадзкіх актывістаў, удзельнікаў масавых акцыяў становяцца вядомыя ў выніку асабістых зваротаў да праваабаронцаў ахвяраў катаваньняў з боку праваахоўных органаў, а таксама са сродкаў масавай інфармацыі, паколькі гэтым фактам надаецца галоснасьць і прымаюцца захады да адстойваньня парушаных правоў.

Найбольшая колькасьць фактаў ужываньня катаваньняў і іншых бесчалавечных альбо прыніжаючых відаў абыходжаньня зафіксаваная ў перыяд кампаніі па выбарах прэзідэнта Беларусі і падчас пасьлявыбарчых акцыяў пратэсту.

Так, 17 сакавіка невядомымі асобамі ў цывільным, якія ў выніку аказаліся супрацоўнікамі міліцыі, быў затрыманы праваабаронца і грамадзкі дзеяч з г. Берасьця Уладзімір Вялічкін. Яго гвалтоўна запіхнулі ў машыну, наносячы пры гэтым удары кулакамі, потым на галаву надзелі чорны мяшок і на працягу дзьвюх гадзінаў у такім выглядзе вазілі па горадзе, абражаючы і запалохваючы. Затым Уладзіміра Вялічкіна адвезьлі ў суд, і судзьдзя вынес рашэньне згодна з арт. 156 Адміністрацыйнага кодэксу (дробнае хуліганства) – арышт 5 сутак. Праваабаронцу абвінавацілі ў тым, што ён быццам бы брыдка лаяўся.

Пасьля затрыманьня 22 сакавіка на Кастрычніцкай плошчы ў г. Менску за ўдзел у акцыі пратэсту Канстанціна Усянка супрацоўнікі ПМАП (палку міліцыі асобага прызначэньня) завялі ў фургон сьпецыяльнага прызначэньня ў аўтамабілі “МАЗ”, дзе пачалі зьбіваць. Затым адзін з міліцыянтаў сарваў з маладога чалавека майку і спрабаваў запіхнуць яму ў рот, прычыніўшы такім чынам цялесныя пашкоджаньні ў выглядзе разрыву вуздэчкі языка. Гэтыя дзеяньні суправаджаліся зьбіцьцём, грубай нецэнзурнай лаянкай і абразамі. Падчас правядзеньня асабістага дагляду рэчаў Канстанціна супрацоўнік міліцыі ў торбе знайшоў нажніцы і іншыя прылады цырульніка. Затрыманы растлумачыў, што працуе стылістам у адным з салонаў прыгажосьці Менску. На гэта супрацоўнік міліцыі, узяўшы нажніцы, адстрыг яму пасму валасоў на галаве. Канстанцін Усянок пасьля адбыцьця 10-сутачнага арышту зьвярнуўся з заявай у пракуратуру Цэнтральнага раёну г. Менску, у якой прасіў узбудзіць крымінальную справу ў адносінах да супрацоўніка міліцыі, які зьдзекваўся з яго.

У заяве ён указаў сьведку, які таксама знаходзіўся у гэтым фургоне і мог пацьвердзіць факт катаваньняў, а таксама прасіў выдаць накіраваньне на праходжаньне судова-медыцынскай экспертызы. Да заявы быў прыкладзены фотаздымак супрацоўніка міліцыі, які зьбіваў яго. Аднак пракуратура накіравала заяву К. Усянка на разгляд камандзіру ПМАП ГУУС Менгарвыканкаму Юрыю Падабеду — кіраўніку органу, дзеяньні якога абскарджваліся (гэта супярэчыць арт. 9 Закону "Аб звароце грамадзянаў", які наўпрост забараняе перадваць скаргі грамадзянаў у дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі (службовым асобам), дзеяньні якіх абскарджваюцца). У сваім адказе Юры Падабед паведаміў К. Усянку, што ў выніку праведзенай службовай праверкі факты, указаныя ў заяве, не пацьвердзіліся, дзеяньні супрацоўнікаў міліцыі ПМАП ГУУС Менгарвыканкаму прызнаныя правамоцнымі. Канстанцін Усянок паўторна зьвярнуўся з заявай аб узбуджэньні крымінальнай справы супраць супрацоўніка міліцыі ў пракуратуру Цэнтральнага раёну г. Менску ў сувязі з тым, што па першай заяве не была праведзеная належная праверка. Аднак і на гэты раз сьледчы пракуратуры Цэнтральнага раёну А. Бачыла адмовіў ва ўзбуджэньні крымінальнай справы, напісаўшы, што ў ходзе праверкі доказаў, якія б указвалі на супрацьпраўныя дзеяньні ў адносінах да К. Усянка з боку супрацоўнікаў міліцыі ПМАП ГУУС Менгарвыканкаму, выяўлена не было.

Падчас затрыманьня 11 сакавіка Міхасю Волчаку супрацоўнікі міліцыі зламалі вялікі палец на правай руцэ. Вось што ён паведаміў: "Я выйшаў з будынку па адрасе Мясьнікова, 78 і накіраваўся да прыпынку. Пад'ехаў тралейбус, адчыніліся дзьверы, я падышоў да іх... Раптам перада мною выскокваюць два здаровыя мужчыны і хапаюць мяне. Адчуваю, што нехта стаіць і за сьпінай... Я абедзьвюма рукамі схапіўся за парэнчы і пачаў крычаць: «Людзі, дапамажыце!». А гэтыя амбалы пачалі біць мяне па руках і цягнуць у машыну... Яны не прадстаўляліся, былі ў спартовых касьцюмах. Я нават ня ведаў, адкуль і хто яны. Потым выявілася, што гэта міліцыянты. Усё адбылося вельмі хутка. Яны так моцна ўдарылі мне па руках, што зламалі палец. Боль быў жахлівы. У «сьпецтранспарце» мяне працягвалі зьбіваць. Даволі доўга і жорстка... Там, у машынах, усё па камандзе. Старшына кажа: «Біць!» — яны б'юць. Кажа: «Ня біць!» — перастаюць. Я запомніў нумар тае машыны: 62-01 АА. Памятаю прозьвішчы тых, хто мяне затрымліваў: старшына А.Н. Круглікаў і супрацоўнік міліцыі С.Н. Шайко. Яны пасьля былі сьведкамі ў судзе. Усяго ў машыне было чатыры чалавекі — кіроўца, гэтыя два і яшчэ адзін — садыст па прозьвішчы Коржык. Ён у судзе не выступаў.

Пасьля завезьлі ў Маскоўскі РУУС. Мяне пасадзілі на крэсла пасярод пакою і працягвалі зьдзеквацца. Пагражалі... Білі так, каб не заставалася сінякоў — па сьпіне і па баках. Ня так, каб мяне забіць, а каб запалохаць". У выніку зьбіцьця Міхась Волчак быў дастаўлены ў бальніцу брыгадай "хуткай дапамогі". Але зьбіцьцё працягвалася і ў бальніцы: "За мной увесь час хадзілі тры чалавекі, «ахоўвалі...» У тэрапеўтычным кабінеце я пачаў прасіць дактароў, каб яны патэлефанавалі маім сваякам, даў тэлефон. Усё гэта адбывалася пры супрацоўніках міліцыі. Яны пачалі панікаваць. Мяне павялі рабіць рэнген. Калі мы ішлі па калідоры, міліцыянты ўдарылі мяне па сьпіне, пасьля па каленях... Я страціў прытомнасьць. Упаў на бетонную падлогу. Сінякі ад удару захаваліся нават да дня вызваленьня. Калі я апрытомнеў, мяне павялі ў рэнтген-кабінет. Там я ўжо ціха прасіў дактароў, каб яны патэлефанавалі дамоў... Я сказаў медсястры свой тэлефон. Яна хутка запісала. Яшчэ я пасьпеў сказаць тэлефон траім дактарам. Два з іх патэлефанавалі і паведамілі родным, што я затрыманы. Наклалі гіпс, павезьлі на Акрэсьціна. Там папрасілі маю медыцынскую даведку. У мяне быў высокі ціск, балела сэрца. Сказалі, што мяне з такім ціскам ня прымуць: «раптам праз гадзіну памрэ... ». Паехалі ў чацьвёртую бальніцу, рабіць кардыяграму. Зрабілі шмат уколаў, пасьля чаго кардыяграма аказалася нармальнай. Узялі даведку, што мяне можна «забіраць». Гэта была субота. Шок у мяне быў да аўторку. Я нават не адчуваў болю. У панядзелак на суд прыйшлі сябры. Гэта мяне вярнула да рэальнасьці. Я зразумеў, што яны ведаюць пра тое, што са мной адбылося. Мяне асудзілі на 12 сутак. Пасьля ўсіх гэтых падзеяў высьветлілася, што нідзе — ні ў паліклініцы, ні ў міліцыі — не зарэгістравана, што я там быў, што ў мяне перапом, і што мне накладалі гіпс. Няма і здымкаў пальца." З-за некваліфікаванай медыцынскай дапамогі косткі ў Міхася Волчака зрасьліся няправільна, было зроблена некалькі паўторных аперацыяў.

Зафіксаваныя таксама факты зьбіцьця супрацоўнікамі праваахоўных органаў журналістаў, якія выконвалі свае прафесійныя абавязкі. 2 сакавіка быў жорстка зьбіты карэспандэнт "Комсомольской правды в Белоруссии" Алег Улевіч каля Кастрычніцкага РУУС Менску, куды быў дастаўлены кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін. У выніку ўдару ў твар журналіст быў дастаўлены ў бальніцу з дыягназам "закрытая чэрапна-мазгавая траўма і перапом касьцей носу". Па заяве Алега Улевіча была ўзбуджаная крымінальная справа па ч.1 артыкулу 149 КК Беларусі: "Наўмыснае прычыненьне цяжкага цялеснага пашкоджаньня", якая некалькі разоў на працягу

году прыпынялася і зноў аднаўлялася. У выніку ніхто так і ня быў прыцягнуты да адказнасьці "ў сувязі з невызначэньнем асобы, якая належыць да прыцягненьня ў якасьці абвінавачваемага", нягледзячы на тое, што сьведкамі інцыдэнту былі каля 30 супрацоўнікаў міліцыі, трое з якіх вялі аператыўныя відэаздымкі, і каля 20 грамадзянаў.

Найбольш пацярпелі ўдзельнікі сьвяткаваньня Дня Волі ў Менску 25 сакавіка, калі супраць мірных дэманстрантаў былі выкарыстаныя гумовыя палкі і іншыя сьпецсродкі. Салдаты і сьпецназаўцы, экіпаваныя ў бронекамізэлькі, шлемы, шчыткі на нагах, зьбівалі кожнага, хто трапляў на шляху. Людзей кідалі на асфальт і зьбівалі нагамі і дубінкамі. Некалькі чалавек былі дастаўленыя ў бальніцы з рознымі траўмамі. 65-гадовы жыхар вёскі Дражна Віцебскага раёну Уладзімір Шадэнка быў дастаўлены ў 4-ю клінічную бальніцу Менску, дзе рэнтгенаграма паказала: у сталага чалавека ўзмоцнены сасудзісты малюнак у вобласьці цемя. Яму таксама быў пастаўлены дыягназ "чэрапна-мазгавая траўма, зрушэньне мозгу". Шадэнка страціў шмат крыві, яму наклалі вялікую колькасьць швоў, але са шпіталю вымусілі сысьці ўжо праз тры гадзіны, запісаўшы ў даведцы, што хворы знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'яненьня. Разам з тым, у менскіх бальніцах адмаўляліся прызнаваць, што да іх прывозілі пацярпелых ад сутычак з міліцыяй, у тым ліку — пра параненага Уладзіміра Шадэнку.

22 ліпеня ў Салігорску падчас акцыі ў падтрымку палітзьняволенага Аляксандра Казуліна з ужываньнем гвалту быў затрыманы лідэр салігорскіх маладафронтаўцаў Іван Шыла. Супрацоўнікі міліцыі яго зьбівалі, а потым кінулі яму цыгарэту ў швэдар, у выніку чаго ў маладога чалавека застаўся апёк. Ягоны брат Ільля, які фатаграфаваў затрыманьне, быў таксама моцна зьбіты і ў кайданках дастаўлены ў пастарунак. Незаконныя дзеяньні міліцыянтаў былі абскарджаныя ў пракуратуру, але гэта не прынесла станоўчых вынікаў.

Адной з нямногіх крыніцаў інфармацыі пра ўмовы ўтрыманьня ў беларускіх турмах, абыходжаньне з асуджанымі і асобамі, якія ўтрымліваюцца пад вартай, зьяўляюцца палітычныя вязьні.

Лідэр "Маладога Фронту" Зьміцер Дашкевіч, абвінавачаны ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі па арт. 193.1 Крымінальнага кодэксу, пра ўмовы ўтрыманьня ў СІЗА МУС г. Менску пісаў: "Кепска, што патрапіў на выходныя, таму тры дні вымушаны

сядзець у «адстойніку». Гэта такія камеры, што служаць перавалачнаю базаю перад самою «валадаркаю». У памяшканьні 12 квадратных метраў сядзіць 25 чалавек. Спалі трое сутак седзячы. Кумар ад цыгарэтаў такі, што ня бачна суседняй сьцяны – з усіх я адзін не палю”. А вось як Зьміцер Дашкевіч апісвае ўмовы ўтрыманьня ў камеры, дзе ён знаходзіўся да суда: “Умовы ўтрыманьня тут такія: 16 шконак (8 двайных нараў) і недзе 23 нас тут звычайна знаходзіцца. Самая вялікая праблема – недахоп паветра, бо тут на кратах стаяць «рэснічкі» (жалезныя жалюзі, якія ня рухаюцца, праз іх можна глядзець толькі наверх, і тое ў вузкую шчылінку). Неяк, пасьля візіту АБСЕ, іх паздымалі, а праз палову году зноў павесілі. Так што ў камеры на 36 квадратных метрах (я падлічыў дакладна) сядзіць 23 чалавекі, а вакно метр на метр і тое ўсё жалезам абваранае.”

Разам з тым, паводле арт. 2 Закону “Аб парадку і ўмовах утрыманьня асобаў пад вартай”, утрыманьне асобаў пад вартай павінна ажыцьцяўляцца на прынцыпах законнасьці, гуманізму, роўнасьці ўсіх грамадзянаў перад законам, павагі чалавечай годнасьці ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, агульнапрынятымі прынцыпамі і нормамі міжнароднага права, а таксама міжнароднымі дамовамі Рэспублікі Беларусь і не павінна суправаджацца жорсткім, негуманным абыходжаньнем, якое можа нанесьці шкоду фізічнаму і псіхічнаму здароўю асобы, што ўтрымліваецца пад вартай.

Моладзевы актывіст Артур Фінькевіч, які адбывае пакараньне тэрмінам у два гады абмежаваньня волі ў адной са сьпецыяльных камендатураў гораду Магілёву, пасьля аперацыі на нагах у прымусовым парадку быў дастаўлены з бальніцы ў інтэрнат установы. Нягледзячы на тое, што ногі ў яго яшчэ не загаіліся, Артур быў абавязаны выходзіць на працу на цагельны завод, дзе выконваў цяжкую фізічную работу.

Пра ўмовы ўтрыманьня ў беларускіх турмах распавёў пасьля свайго вызваленьня экс-дэпутат Сяргей Скрабец: “Зьняволеныя маюць дзьве гадзіны на прагулку, але максімум на паветры – 40 хвілінаў. На “этапах” са мной сядзелі хворыя на сухоты і на СНІД. Зараз іх ня ўтрымліваюць асобна. Хворых шмат і ў зоне, і ў “каранціне”. Для аховы гэта “не праблема”. Нават калі мы з Казуліным ляжалі ў медчастцы, да нас там ляжаў хворы на сухоты з закрытай формай. У камеры, здаецца, такіх хворых не было. Але зэкі ня хочуць гаварыць аб гэтым. Ніхто ня хоча прызнавацца, што ён хворы. Тым ня менш, мне даводзілася з такімі людзьмі размаўляць і нават разам піць гарбату. Прагулкі адбываюцца ў дворыку памерам два на

тры метры. У Берасьці на гэтых дворыках брудна і шмат пылу. Але там адносна добра ў параўнаньні з менскім СІЗА. На Валадарскага на месцах для прагулак проста ляжыць лайно. Я пісаў кіраўніцтву СІЗА №1, каб яны там папрыбіралі, бо гэта ўсё пераносіцца ў камеры і можа стаць прычынай хваробаў. Але рэакцыі на мае лісты не было. Душ – гэта проста зьдзек – раз на тыдзень, на 10 хвілінаў, без гарачай вады, адзін “душ” на пяць чалавек, — мыйся як хочаш. Хоць гэта ўтрыманьне да суда і віна зьняволеных яшчэ не даказаная. Каб даехаць з турмы ў Берасьці ў турму ў Менску патрэбны тыдзень. Гэты час я сядзеў у перасыльнай турме ў Баранавічах, а там увогуле нечалавечыя ўмовы: у адной камеры – 100 чалавек. У два ярусы насланыя дошкі, на якіх ляжаць людзі. Пры гэтым ўсе гэтыя 100 чалавек адначасова паляць. Я не палю. На ўсіх адна прыбіральня. Там я быў чатыры дні, і гэта быў вельмі цяжкі час. Там парушаюцца ўсе магчымыя правы – не даюць гуляць, увогуле нічога не даюць… Ёсьць людзі, якія там сядзяць па некалькі месяцаў. Затым – Менск. На Валадарскага мяне давялі ледзь не да вар’яцтва. Трое сутак я ляжаў на дошках з пацукамі, мышамі, вошамі. Сядзеў разам з бамжамі… Ставіліся да мяне проста паскоцку. У такіх умовах усіх утрымліваюць пасьля “этапу”, пакуль не “падымуць” у камеру. Людзей ўвесь час туды кідаюць і адтуль забіраюць. Там няма нараў, ёсьць “сцэна” – насьціл з дошак, на якім сьпяць.”

На падставе атрыманай інфармацыі можна зрабіць выснову, што ўмовы ўтрыманьня зьняволеных у беларускіх турмах зьяўляюцца небясьпечнымі для іх здароўя, зьневажаюць іх чалавечую годнасьць, не адпавядаюць мінімальным стандартам утрыманьня. Інфармацыя аб сітуацыі з выкананьнем правоў чалавека ў месцах пазбаўленьня волі па-ранейшаму застаецца закрытай для грамадзтва.

Між тым, 15 верасьня 2006 году Пастановай Савету Міністраў № 1220 было зацьверджанае палажэньне аб парадку ажыцьцяўленьня рэспубліканскімі і мясцовымі грамадзкімі аб’яднаньнямі кантролю за дзейнасьцю органаў і ўстановаў, якія выконваюць пакараньне і іншыя меры крымінальнай адказнасьці. Гэтае палажэньне прадугледжвае стварэньне грамадзкіх назіральных камісіяў дзеля ажыцьцяўленьня назіраньня за адпаведнасьцю і выкананьнем Канстытуцыі і міжнародных нормаў адносна правоў асобаў, якія адбываюць пакараньне. Прадугледжваецца фармаваньне камісіяў двух узроўняў: Рэспубліканскай камісіі пры Міністэрстве юстыцыі і абласныя і Менская гарадзкая камісіі пры ўпраўленьнях

юстыцыі адпаведных аблвыканкамаў і Менгарвыканкаму. Аднак у краіне фактычна не засталося зарэгістраваных праваабарончых арганізацыяў, які б маглі накіраваць сваіх прадстаўнікоў у названыя вышэй камісіі прапанаваць уладам рэальную дапамогу ў працэсе рэфармаваньня пенітэнцыярнай сістэмы ў краіне, у тым ліку — арганізаваць гуманітарную дапамогу, накіраваную на паляпшэньне ўмоваў утрыманьня зьняволеных.

## 12. Праваабарончая дзейнасьць. Ціск на праваабаронцаў і праваабарончыя арганізацыі.

Згодна з артыкулам 1 Дэкларацыі аб праваабаронцах (прынятай Генеральнай Асамблеяй ААН 8 сьнежня 1999 году), кожны чалавек мае права, індывідуальна і сумесна з іншымі, заахвочваць і імкнуцца абараняць і ажыцьцяўляць правы чалавека і асноўныя свабоды на нацыянальным і міжнародным узроўні. Артыкул 6 Дэкларацыі канстатуе, што кожны чалавек мае права “свабодна публікаваць, перадаваць ці распаўсюджваць сярод іншых меркаваньні, інфармацыю і веды пра ўсе правы чалавека і асноўныя свабоды; вывучаць, абмяркоўваць і мець меркаваньні адносна выкананьня ўсіх правоў чалавека і асноўных свабодаў як у заканадаўстве, так і на практыцы, і прыцягваць увагу грамадзкасьці да гэтых пытаньняў”.

У 2006 годзе беларускі ўрад працягваў палітыку ігнараваньня міжнародных механізмаў абароны правоў чалавека. Так і не атрымаў станоўчага адказу на просьбы аб наведваньні Рэспублікі Беларусь сьпецыяльны дакладчык ААН па пытаньні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі Адрыян Севярын. Заклапочанасьць з гэтай нагоды выказаная ў дакладзе Адрыяна Севярына, прынятым 27 верасьня Саветам па правах чалавека, а таксама ў Рэзалюцыі ААН па Беларусі, прынятай 19 сьнежня, дзе сказана: “Генеральная Асамблея (…) настойвае на тым, каб урад Беларусі ў поўнай меры супрацоўнічаў з усімі механізмамі Савету па правах чалавека, у тым ліку са сьпецыяльным дакладчыкам, які быў прызначаны згодна з Рэзалюцыяй 2005/13 Камісіі па правах чалавека, і мандат якога быў вызначаны ў Рэзалюцыі 2004/14 Камісіі”.

Беларускія ўлады на працягу году дэманстравалі непрыняцьце рашэньняў Камітэту па правах чалавека ААН па індывідуальных

зваротах грамадзянаў. Падпісаўшы і ратыфікаваўшы Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, а таксама факультатыўны пратакол да яго, Беларусь узяла на сябе добраахвотны абавязак прызнаваць кампетэнцыю Камітэту і добраахвотна выконваць ягоныя рашэньні. Аднак дзяржава па-ранейшаму працягвала ўхіляцца ад выкананьня міжнародных абавязкаў. Так, у канцы студзеня праваабаронца з Берасьця Уладзімір Вялічкін атрымаў з Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь адмову на свой зварот аб адмене рашэньня суда ад 2000 году (згодна з якім ён быў аштрафаваны на 20 базавых адзінак за распаўсюд Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека), спасылаючыся на высновы Камітэту па правах чалавека. Камітэт вырашыў, што ў адносінах да праваабаронцы былі парушаныя арт.19 пар. 2, арт. 2 пар. 3 (а) Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах і рэкамендаваў Рэспубліцы Беларусь кампенсаваць нанесеныя яму страты, прыняць іншыя меры, скіраваныя на аднаўленьне парушаных правоў. Аднак намесьнік старшыні Вярхоўнага суда В.Л. Калінковіч у сваім адказе адзначыў: “Дадзеная заява пакідаецца без задавальненьня, бо па ч.1 арт. 167-1, арт. 166 КаАП да адказнасьці вы (Вялічкін) прыцягнутыя абгрунтавана, адпаведна нацыянальнаму заканадаўству, дзеючаму на дзень ўчыненага вамі правапарушэньня”. Падобны адказ прадстаўніка судовай улады супярэчыць таксама арт. 8 Канстытуцыі Беларусі, дзе прызнаецца прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і неабходнасьць забесьпячэньня адпаведнасьці ім нацыянальнага заканадаўства.

Нягледзячы на тое, што Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, гарантуе кожнаму свабоду меркаваньняў, перакананьняў і іх свабоднае выказваньне (арт. 33), а таксама права на свабоду аб’яднаньняў (арт. 36), у краіне існуюць вельмі неспрыяльныя ўмовы для праваабарончай дзейнасьці як у індывідуальным парадку, так і для праваабрончых арганізацыяў. Агульная для Беларусі тэндэнцыя падаўленьня грамадзянскай супольнасьці распаўсюджвалася і на праваабарончую дзейнасьць. Выкарыстоўваліся розныя формы рэпрэсіяў і ціску на праваабаронцаў і праваабарончыя арганізацыі.

Адным з найбольш жорсткіх сродкаў зьяўляўся крымінальны перасьлед. Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў супраць актывіста “Беларускага Хельсінскага камітэту” з г. Астраўца Івана Крука была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 364 Крымінальнага кодэк-

су (гвалт ці пагроза гвалту ў адносінах да супрацоўніка міліцыі) за тое, што ён разьбіў свой уласны кампутар падчас правядзеньня вобыску ў ягонай кватэры. У траўні суд Лідзкага раёну Гарадзенскай вобласьці асудзіў Івана Крука на 6 месяцаў пазбаўленьня волі.

1 сакавіка Дэпартамент па фінансавых расьсьледаваньнях Камітэту дзяржкантролю аднавіў крымінальную справу па ч. 2 арт. 243 КК РБ (ухіленьне ад уплаты сумаў падаткаў, збораў) супраць старшыні РГА "Беларускі Хельсінскі камітэт" Тацяны Працькі. Старшыня БХК падазравалася ў тым, што нібыта не сплаціла каля 70 тысячаў даляраў падаткаў за грашовую дапамогу, атрыманую паводле праграмаў Еўрасаюзу TACIS (гэтая дапамога аказвалася Беларусі пры ўмове, што ня будзе абкладацца падаткамі). Вышэйшы гаспадарчы суд (ВГС) спачатку стаў на бок праваабаронцаў, але пазьней Прэзідыум ВГС адмяніў гэтае рашэньне. 28 сакавіка крымінальная справа была спыненая "ў сувязі з адсутнасьцю ў дзеяньнях Т. Працькі грамадзка небясьпечнага дзеяньня".

Нягледзячы на спыненьне крымінальнай справы супраць старшыні "Беларускага Хельсінскага камітэту", нявыплата згаданых падаткаў стала адной з прычынаў падачы ў траўні Міністэрствам юстыцыі ў Вярхоўны суд зыску аб прыпыненьні дзейнасьці арганізацыі. У зыску сказана: "Рэспубліканскім грамадзкім аб'яднаньнем "Беларускі Хельсінскі камітэт" дапушчаныя грубыя парушэньні падаткавага заканадаўства. Падчас праведзенай падатковымі органамі комплекснай праверкі ў адносінах РГА "БХК" даналічаныя плацяжы ў бюджэт і прымененыя эканамічныя санкцыі на суму звыш за 155 млн. рублёў. На працягу некалькіх месяцаў запазычанасьць РГА "БХК" па плацяжах у бюджэт не пагашаецца і мераў па яе пагашэньні не прымаецца. Вынесенае Міністэрствам юстыцыі за ўказаныя парушэньні папярэджаньне ігнаруецца". Працэс па справе прыпыненьня дзейнасьці БХК пачаўся 23 чэрвеня, але быў адкладзены да разгляду нагляднай скаргі на пастанову Прэзідыуму ВГС. У верасьні праваабаронцы атрымалі адказ на наглядную скаргу, згодна з якім суд не знайшоў падставаў да вынясеньня пратэсту на прынятае Прэзідыумам Вышэйшага гаспадарчага суда рашэньне. Судовае паседжаньне па прыпыненьні дзейнасьці БХК было прызначанае на 28 лістапада ў Вярхоўным судзе, але зноў было адкладзенае на няпэўны тэрмін. Такім чынам, створаная юрыдычная калізія да канца году не знайшла свайго вырашэньня, што не перашкодзіла 6 сьнежня судовым выканаўцам канфіскаваць частку маёмасьці "Беларускага Хельсінскага камітэту".

У 2006 годзе захоўвалася, характэрная для Беларусі на працягу апошніх гадоў, практыка абмежаваньня дзейнасьці і ліквідацыі праваабарончых арганізацыяў.

16 чэрвеня ГА “Магілёўскі праваабарончы цэнтр” (МПЦ) атрымаў ліст з Магілёўскага абласнога ўпраўленьня юстыцыі, у якім дзяржаўныя чыноўнікі рэкамендавалі МПЦ прыбраць са Статуту арганізацыі палажэньне аб тым, што “праваабарончы цэнтр забясьпечвае ў адпаведнасьці з заканадаўствам абарону правоў і законных інтарэсаў асобаў… — у судах, органах дзяржаўнай улады, грамадзкіх арганізацыях”. Кіраўнік арганізацыі У. Краўчанка адзначыў, што гэта ня першая спроба прымусіць праваабаронцаў пазбавіцца свайго асноўнага статутнага палажэньня, звузіўшы яго да права абараняць толькі саміх сябе – сяброў грамадзкага аб’яднаньня. Магілёўскія праваабаронцы адмовіліся ўносіць зьмены ў свой Статут.

27 красавіка Гаспадарчы суд горада Менску не задаволіў скаргу “Інавацыйнага фонду прававых тэхналогіяў” на беспадстаўную адмову Міністэрства юстыцыі ў рэгістрацыі зьменаў і дапаўненьняў у Статуце ў сувязі з новымі патрабаваньнямі Закону “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях”. Фармальнай прычынай адмовы стала тое, што назва арганізацыі не зьмяшчала пазнакі характару дзейнасьці Фонду, а ў Статуце ня вызначаныя канкрэтныя мэты, задачы і метады арганізацыі. 17 жніўня Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь не задаволіў касацыйную скаргу «Інавацыйнага фонду прававых тэхналогіяў», і рашэньне аб ягонай ліквідацыі ўступіла ў законную сілу. Нагадаем, што стварылі Фонд праваабаронцы, якія працавалі ў “Незалежным таварыстве прававых дасьледаваньняў” да ягонай ліквідацыі ў 2004 годзе.

Такім чынам, у Беларусі ў выніку кампаніі па ліквідацыі грамадзкіх аб’яднаньняў, большасьць праваабарончых арганізацыяў пазбаўленыя афіцыйнай рэгістрацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Частка арганізацыяў зарэгістраваныя ў Літве, Чэхіі, Украіне і іншых краінах, аднак гэтая рэгістрацыя не прызнаецца афіцыйнымі ўладамі Беларусі. Такая сітуацыя стала асабліва небясьпечнай пасьля ўнясеньня зьменаў у Крымінальны кодэкс, якія прадугледжваюць крымінальную адказнасьць за арганізацыю дзейнасьці альбо ўдзел у дзейнасьці арганізацыяў і фондаў, у адносінах да якіх уступіла рашэньне аб прыпыненьні іх дзейнасьці альбо закрыцьці. Атрымаць жа афіцыйную рэгістрацыю праваабарончай арганізацыі ці фонду ў Беларусі фактычна немагчыма.

Большасьць прадстаўнікоў праваабарончых арганізацыяў, якія ліквідаваныя ў судовым парадку на працягу апошніх гадоў ці ат-

рымалі адмову ў рэгістрацыі, накіравалі індывідуальныя скаргі на разгляд Камітэту па правах чалавека ААН. За 2006 год вядомае рашэньне Камітэту адносна адмовы ў рэгістрацыі праваабарончай арганізацыі “Хельсінкі XXI” (скарга была пададзеная ад імя праваабаронцы Барыса Звозскава і групы грамадзянаў). Нагадаем, што ў жніўні 2001 году Вярхоўны суд Беларусі пакінуў бяз зьменаў рашэньне Мінюсту аб адмове ў рэгістрацы “Хельсінкі XXI” з-за нежаданьня праваабаронцаў выключыць са Статуту палажэньні аб магчымасьці абароны ня толькі сяброў арганізацыі, але і іншых грамадзянаў, якія зьвернуцца па дапамогу. “Беручы пад увагу наступствы адмовы ў рэгістрацыі – незаконнасьць дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі на тэрыторыі дзяржавы-ўдзельніцы, Камітэт прыходзіць да высновы, што адмова ў рэгістрацыі не адпавядае патрабаваньням арт. 22 (2) Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах”, — сказана ў рашэньні. Камітэт таксама рэкамендаваў дзяржаве прадаставіць аўтарам адпаведную кампенсацыю і пераглядзець заяву на рэгістрацыю іх аб’яднаньня.

На працягу 2006 году ў адносінах да праваабаронцаў выкарыстоўваліся розныя формы ціску і перасьледу. Сярод іх – пагрозы, пракурорскія папярэджаньні, адміністрацыйныя штрафы і арышты, незаконныя вобыскі і іншыя.

Пагрозы выкарыстоўваліся таксама і ў адносінах да адвакатаў, якія ўдзельнічалі ў якасьці абаронцаў грамадзкіх і палітычных актывістаў, хаця іх дзейнасьць гарантаваная Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Найбольш яскравы прыклад — пагрозы на адрас адваката Паўла Сапелкі, які абараняў моладзевага актывіста Паўла Красоўскага. Падчас аднаго з допытаў старэйшы сьледчы па асабліва важных справах рэспубліканскай пракуратуры Аляксандр Расолька пагражаў адвакату пазбаўленьнем ліцэнзіі і тым, што сам Сапелка неўзабаве можа стаць падазроным па крымінальнай справе.

17 красавіка пракуратура Савецкага раёну Менску вынесла папярэджаньне па арт. 400 КК РБ – «заведама ілжывы данос» праваабаронцу Алесю Бяляцкаму ў сувязі з ягоным каментарам падзеяў гвалтоўнага разгону мірнай дэманстрацыі 25 сакавіка на сайце www.charter97.org. Такія ж папярэджаньні былі вынесеныя пракуратурай праваабаронцам Уладзіміру Лабковічу і Людміле Гразновай.

Падчас кампаніі па выбарах прэзідэнта праваабаронцы ва ўсіх рэгіёнах Беларусі масава арыштоўваліся і падвяргаліся адмініст-

рацыйным штрафам па надуманых прычынах. Часьцей за ўсё выкарыстоўваліся абвінавачаньні па арт. 156 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях – “дробнае хуліганства”, арт. 166 – “непадпарадкаваньне патрабаваньням супрацоўнікаў міліцыі”, а таксама па арт. 167.1 – “удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве”. Сярод асуджаных праваабаронцаў:

1. Шчукін Валеры, 17 сакавіка асуджаны на 7 сутак арышту па абвінавачаньні ў парушэньні арт.156 Адміністрацыйнага кодэксу судом Першамайскага раёну г.Віцебску;

2. Сазонаў Віктар, 15 сакавіка асуджаны па арт. 156 Адміністрацыйнага кодэксу на 7 сутак арышту, г.Гародня;

3. Вялічкін Уладзімір, 17 сакавіка асуджаны па арт.156 Адміністрацыйнага кодэксу на 5 сутак арышту; 22 сакавіка асуджаны на 7 сутак па абвінавачаньні ў дробным хуліганстве, арт. 156 КаАП, г.Берасьце;

4. Дзергачоў Алесь, 17 сакавіка асуджаны па арт.166 Адміністрацыйнага кодэксу на 5 сутак, г.Смаргонь;

5. Целяпун Уладзімір, 17 сакавіка асуджаны на 7 сутак арышту па 166 арт. Адміністрацыйнага кодэксу, г. Мазыр;

6. Берасьнеў Васіль, 14 сакавіка асуджаны на 7 сутак арышту па арт.167.1 Адміністрацыйнага кодэксу, г.Орша;

7. Ярашук Віктар, 14 сакавіка асуджаны на 5 сутак адміністрацыйнага арышту па арт. 156 КаАП; 19 сакавіка асуджаны на 5 сутак па арт.156 КаАП, г. Пінск;

8. Маслоўскі Ігар, 19 сакавіка арыштаваны на 7 сутак па арт. 156 КаАП, г. Берасьце;

9. Леўчанка Васіль, 15 сакавіка асуджаны па арт. 156 КаАП РБ на 7 сутак адміністрацыйнага арышту, г. Орша;

10. Леднік Ігар, 15 сакавіка асуджаны судом Цэнтральнага раёну Менску па арт.156 КаАП на 10 сутак арышту;

11. Пуціцкі Валеры, арыштаваны 16 сакавіка па арт.156 КаАП на 7 сутак, г. Рэчыца;

12. Гоўша Сяргей, 24 сакавіка па абвінавачаньні ў парушэньні арт 156 КаАП вынесены штраф у памеры 2 базавых велічыняў, г. Баранавічы;

13. Пятровіч Карней, 16 сакавіка вынесены штраф у памеры 20 базавых велічыняў за парушэньне арт.167.1 КаАП, г.Баранавічы;

14. Жлутка Алег, 22 сакавіка арыштаваны на 15 сутак па абвінавачаньні ў парушэньні арт. 167.1 КаАП, г. Менск;

15. Чавусаў Юры, 22 сакавіка арыштаваны на 10 сутак па абвінавачаньні ў парушэньні арт. 167.1 КаАП, г. Менск.

16. Болбат Вячаслаў, 14 сакавіка арыштаваны на 8 сутак па абвінавачаньні ў дробным хуліганстве – арт. 156 КаАП, г. Баранавічы.

Разгонам і затрыманьнямі скончылася 10 сьнежня, у гадавіну прыняцьця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, акцыя салідарнасьці з палітвязьнем Аляксандрам Казуліным у Менску. Падчас разгону акцыі амапаўцы білі людзей дубінкамі, тапталі нагамі. Сярод затрыманых — праваабаронцы Алесь Бяляцкі, Валянцін Стэфановіч (быў моцна зьбіты), Алесь Каліта.

Зьбіцьцё і катаваньні супрацоўнікі праваахоўных органаў неаднаразова выкарыстоўвалі ў адносінах да праваабаронцаў. Так, у сакавіку Уладзіміра Вялічкіна пасьля затрыманьня супрацоўнікі міліцыі некалькі гадзінаў вазілі па горадзе з чорным мяхом на галаве. Затрыманага Юрыя Чавусава амапаўцы кінулі на падлогу, білі кулакамі і нагамі па галаве, твары, нырках, сьпіне, душылі шалікам.

Зафіксаваныя напады на праваабаронцаў "невядомых людзей у цывільным", якія засталіся нерасьсьледаванымі. 3 красавіка ўвечары ў Менску быў зьбіты актывіст цыганскага руху Мікола Калінін. Да яго падышлі шэсьць невядомых хлопцаў з дзяўчынай, якая сказала, што Калінін яе абразіў. Невядомыя маладыя людзі нанесьлі некалькі моцных удараў, ад якіх Мікола Калінін упаў і страціў прытомнасьць. Гэты напад праваабаронца расцаніў як спланаваную акцыю запалохваньня.

11 траўня ў Гародні на прыватнай кватэры гарадзенскага журналіста і праваабаронцы Уладзіміра Хільмановіча і ў памяшканьні, дзе ён працуе, адбыліся два ператрусы, якія праводзілі супрацоўнікі Гарадзенскага УКДБ. Вобыскі, санкцыянаваныя Менскай гарадзкой пракуратурай у сувязі з крымінальнай справай незарэгістраванай арганізацыі "Партнёрства", скончыліся канфіскацыяй усёй кампутарнай тэхнікі. Абскарджаньні дзеяньняў супрацоўнікаў сьпецслужбаў не прынесьлі ніякіх вынікаў.

Пад асаблівым кантролем беларускіх уладаў знаходзіўся распаўсюд незалежнай інфармацыі пра сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі. 10 сьнежня на моладзевых актывістаў Франака Вячорку, Сяргея Карловіча і Максіма Вяльмовіча былі складзеныя пратаколы адміністрацыйнага правапарушэньня па арт. 172.3 КаАП РБ — распаўсюд друкаванай прадукцыі, зьмест якой наносіць шкоду дзяржаўнаму ладу, правам і законным інтарэсам грамадзянаў. "Праваапарушэньнем" супрацоўнікі міліцыі палічылі тое, што маладыя людзі мелі пры сабе даклад аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі Адрыяна Севярына.

 Штрафам у памеры 5 базавых велічыняў у сьнежні быў пака-

раны гомельскі праваабаронца, сьпецыяліст Гомельскага заводу пускавых рухавікоў, Анатоль Паплаўны. Яго прызналі вінаватым у адміністрацыйным правапарушэньні па ч.3 арт.172 КаАП (распаўсюд друкаваных выданьняў, зьмест якіх накіраваны на нанясеньне шкоды дзяржаўнаму і грамадзкаму парадку) за тое, што на працоўным месцы аднаго з рабочых намесьнік дырэктар заводу па ідэалогіі заўважыў 2 асобнікі незалежнай газеты “Свабода”. І хаця факт распаўсюду газеты Паплаўным ня быў пацьверджаны, быў вынесены максімальны памер штрафу, прадугледжаны дадзеным артыкулам.

Міжнародная супольнасьць неаднаразова на працягу году выступала супраць ціску на беларускія праваабарончыя арганізацыі і праваабаронцаў. Гэтая пазіцыя найшла сваё адлюстраваньне і ў сьнежаньскай Рэзалюцыі ААН па Беларусі, дзе сказана: “Генеральная Асамблея (…) настойліва заклікае ўрад Беларусі (…) спыніць палітычна матываваны судовы перасьлед, ціск і запалохваньне палітычных апанентаў і выступаючых за дэмакратыю актывістаў і праваабаронцаў”.

***Дадатак***

*19 сьнежня 2006 году Генеральная Асамблея ААН па рэкамендацыі Трэцяга камітэту ўхваліла Рэзалюцыю, якая асуджае парушэньні правоў чалавека ў Беларусі. Рэзалюцыю падтрымалі 72 дзяржавы*

**Арганізацыя Аб’яднаных Нацыяў**

**Генеральная Асамблея**

## Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі

Генеральная Асамблея,

кіруючыся мэтамі і прынцыпамі Статуту Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў, палажэньнямі Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, Міжнародных пактаў пра правы чалавека і іншых прымяняльных дакументаў у галіне правоў чалавека,

зноўку пацьвярджаючы, што ўсе дзяржавы абавязаныя заахвочваць і абараняць правы чалавека і асноўныя свабоды і выконваць свае міжнародныя абавязацельствы,

улічваючы, што Беларусь зьяўляецца ўдзельнікам Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах і Факультатыўных пратаколаў да яго, Міжнароднага пакту аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў расавай дыскрымінацыі, Канвенцыі супраць катаваньняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасьць відаў абыходжаньня ці пакараньня, Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын і Факультатыўнага пратаколу да яе і Канвенцыі аб правах дзіцяці і Факультатыўнага пратаколу да Канвенцыі, які датычыць гандлю дзецьмі, дзіцячай прастытуцыі і дзіцячай парнаграфіі,

спасылаючыся на Рэзалюцыі Камісіі па правах чалавека 2003/14 ад 17 красавіка 2003 году, 2004/14 ад 15 красавіка 2004 году і 2005/13 ад 14 красавіка 2005 году і на рашэньне 1/102 Савету па правах чалавека ад 30 чэрвеня 2006 году,

зьяўляючыся заклапочанай тым, што прэзідэнцкія выбары, якія адбыліся 19 сакавіка 2006 году, былі праведзеныя з сур'ёзнымі парушэньнямі і ў значнай ступені не адпавядалі ўскладзеным Беларусьсю ў межах Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтву ў Еўропе абавязацельствам у адносінах да правядзеньня свабодных і справядлівых выбараў, а таксама няўхільным пагаршэньнем сітуацыі ў галіне правоў чалавека ў Беларусі ў 2005 годзе, што дакументальна пацьверджана ў заключным дакладзе Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) і ў дакладзе Сьпецыяльнага дакладчыка па пытаньні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі,

адзначаючы, што ўлады Беларусі прынялі рашэньне правесьці выбары ў мясцовыя органы ўлады 14 студзеня 2007 году, і выказваючы надзею на тое, што яны будуць свабоднымі і справядлівымі і будуць праходзіць на падставе поўнага выкананьня міжнародных стандартаў правядзеньня выбараў,

выказвае глыбокую занепакоенасьць:

a) з нагоды таго, што ўрад Беларусі няе ў поўнай меры супрацоўнічае з усімі механізмамі Савету па правах чалавека, у прыватнасьці, са сьпецыяльнымі дакладчыкамі па пытаньні аб становішчы правоў чалавека ў Беларусі, адзначаючы сур'ёзную занепакоенасьць адносна пагаршэньня становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, якую выказалі сем незалежных эксьпертаў па пытаньнях правоў чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў у заяве ад 29 сакавіка 2006 году;

b) з нагоды таго, што, нягледзячы на падрабязныя рэкамендацыі Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтву ў Еўропе і на дыялог, які адбыўся паміж урадам і Арганізацыяй па бясьпецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ) пасьля папярэдніх выбараў, Беларусь зноўку ня выканала свае міжнародныя абавязацельствы адносна правядзеньня свабодных і справядлівых выбараў, у прыватнасьці, дапусьціўшы

адвольнае прымяненьне ўлады дзяржавы адносна кандыдатаў ад апазіцыі, пастаяннае запалохваньне, затрыманьні і арышты палітычных актывістаў і актывістаў грамадзянскай супольнасьці, стварэньне перашкодаў для рэалізацыі кандыдатамі ад апазіцыі іх права на доступ да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, выяўленьне ў негатыўным сьвятле ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі кандыдатаў ад апазіцыі і актывістаў, у тым ліку праваабаронцаў, а таксама сур'ёзныя парушэньні пры падліку галасоў, які праводзіўся без выкананьня мінімальных патрабаваньняў адносна транспарэнтнасьці;

c) з нагоды працягваючых паступаць паведамленьняў аб выпадках ціску, адвольных арыштаў і затрыманьняў каля 1000 чалавек, уключаючы кандыдатаў ад апазіцыі, да і пасьля выбараў, якія адбыліся 19 сакавіка 2006 году;

d) з нагоды працягу і пашырэньня крымінальнага перасьледу вядучых дзеячоў апазіцыі і праваабаронцаў, справы якіх разглядаюцца без выкананьня належнай працэдуры і ў межах закрытых палітычных разьбіральніцтваў;

e) з нагоды працягу ціску і затрыманьняў беларускіх журналістаў, якія распавядаюць пра дэманстрацыі апазіцыі на месцах, і з нагоды таго, што вышэйшыя службовыя асобы ўраду Беларусі, як сьцьвярджаецца, былі датычныя да гвалтоўнага зьнікненьня і/ці адвольнага сьмяротнага пакараньня трох палітычных апанентаў цяперашніх уладаў у 1999 годзе і аднаго журналіста ў 2000 годзе, а таксама з нагоды працяу ўтойваньня фактаў падчас праводзімых расьсьледаваньняў, што дакументальна пацьверджана ў дакладзе, зацьверджаным Парламенцкай Асамблеяй Савету Еўропы ў Рэзалюцыі 1371 ад 28 красавіка 2004 году;

f) з нагоды рашэньня ўладаў Беларусі адазваць ліцэнзію на адукацыйную дзейнасьць Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту ў Менску іануляваць дамову арэнды ягоных будынкаў, што пацягнула за сабой вымушанае закрыцьцё Ўніверсітэту;

g) з нагоды пастаянна паступаючых паведамленьняў аб ціску і закрыцьці няўрадавых арганізацыяў, арганізацыяў нацыянальных меньшасьцяў, незалежных сродкаў масавай інфармацыі, рэлігійных групаў, апазіцыйных палітычных партыяў і незалежных прафсаюзаў,

незалежных моладзевых і студэнцкіх арганізацыяў, а таксама з нагоды ціску і перасьледу прыватных асобаў, у тым ліку студэнтаў, якія ўдзельнічаюць у дзейнасьці, накіраванай на заахвочваньне і абарону правоў чалавека, вяршэнства закону і дэмакратыі;

настойліва заклікае ўрад Беларусі:

a) прывесьці выбарчы працэс і заканадаўчую базу ў адпаведнасьць з міжнароднымі стандартамі, асабліва стандартамі Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, прадэманстраваць такую прыхільнасьць у кантэксьце будучых выбараў у мясцовыя органы ўлады ў студзені 2007 году і ліквідаваць недахопы ў межах выбарчага працэсу, пра якія казалася ў дакладзе Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека ад 7 чэрвеня 2006 году, уключаючы законы аб выбарах і працэдуры іх правядзеньня, якія абмяжоўваюць магчымасьці кандыдатаў ад апазіцыі de facto у плане правядзеньня перадвыбарчай кампаніі, адвольнае прымяненьне законаў аб выбарах, уключаючы законы аб рэгістрацыі кандыдатаў, стварэньне перашкодаў для рэалізацыі права на доступ да сродкаў масавай інфармацыі, тэндэнцыйнае выкладаньне пытаньняў дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі і фальсіфікацыю вынікаў падліку галасоў;

b) спыніць палітычна матываваны судовы перасьлед, ціск і запалохваньне палітычных апанентаў і выступаючых за дэмакратыю актывістаў і праваабаронцаў, студэнтаў, незалежных сродкаў масавай інфармацыі і рэлігійных арганізацыяў, навучальных установаў і суб’ектаў грамадзянскай супольнасьці; спыніць ціск на студэнтаў і стварыць магчымасьці, каб яны маглі працягваць сваё навучаньне ў Беларусі;

c) паважаць права на свабоду слова, сходаў і асацыяцыяў і неадкладна вызваліць усіх палітычных зьняволеных і іншых асобаў, якія знаходзяцца пад вартай за ажыцьцьяўленьне імі гэтых правоў;

d) адхіліць ад пасадаў афіцыйных асобаў, якія, як сьцьвярджаецца, датычныя да любых справаў аб гвалтоўных зьнікненьнях, адвольных пакараньняў сьмерцю і катаваньняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасьць відаў абыходжаньня і пакараньня, на перыяд сьледзтва па такіх справах і забясьпечыць прыняцьце ўсіх неабходных мераў для ўсебаковага і бесстароньм-

няга расьсьледаваньня такіх справаў, прыцягнуць асобаў, якім інкрымінуюцца гэтыя злачынствы, да адказнасьці ў незалежным судзе і, у выпадку прызнаньня іх вінаватымі, забясьпечыць, каб яны былі пакараныя згодна з міжнароднымі абавязацельствамі Беларусі ў галіне правоў чалавека;

e) правесьці расьсьледаваньне і прыцягнуць да адказнасьці асобаў, якія вінаватыя ў кепскім абыходжаньні з мясцовымі і замежнымі журналістамі і іх арышце ў сувязі з выбарамі 19 сакавіка 2006 году і дэманстрацыямі пасьля іх завяршэньня;

f) забясьпечыць права на свабоду рэлігіі ці перакананьняў, уключаючы магчымасьць падтрыманьня сувязі з асобнымі людзьмі і грамадамі ў пытаньнях рэлігіі ці перакананьняў на нацыянальным і міжнародным узроўнях;

g) правесьці расьсьледаваньне і пакараць асобаў, адказных за кепскае абыходжаньне з актывістамі грамадзянскай супольнасьці і палітычнымі актывістамі, іх адвольныя арышты і пазбаўленьне іх волі ў перыяд да адбыўшыхся ў сакавіку 2006 году прэзідэнцкіх выбараў і пасьля іх, а таксама неадкладна і без якіх-небудзь умоваў вызваліць усіх палітычных вязьняў;

h) прадпрыняць усе іншыя крокі, да якіх заклікала Камісія па правах чалавека ў сваёй Рэзалюцыі 2005/13;

настойвае на тым, каб урад Беларусі ў поўнай меры супрацоўнічаў з усімі механізмамі Савету па правах чалавека, у тым ліку са Сьпецыяльным дакладчыкам, які быў прызначаны згодна з Рэзалюцыяй 2005/13 Камісіі па правах чалавека і мандат якога быў вызначаны ў Рэзалюцыі 2004/14 Камісіі, а таксама з Прадстаўніком Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ) па пытаньнях свабоды сродкаў масавай інфармацыі.

# Зьмест

*Уступ*..........3

*1.* Зьмены ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, якія датычаць правоў чалавека..........7

*2.* Сьмяротнае пакараньне – парушэньне права на жыцьцё..........19

*3.* Адстойваньне права на праўдзівую інфармацыю пра зьніклых..........22

*4.* Крымінальны перасьлед па палітычных матывах..........27

*5.* Перасьлед незалежных сродкаў масавай інфармацыі і журналістаў, парушэньне правоў грамадзянаў на свабоду слова і атрыманьне праўдзівай інфармацыі..........43

*6.* Перасьлед палітычных апанентаў і іншадумцаў, навязваньне дзяржаўнай ідэалогіі..........63

*7.* Парушэньне права грамадзянаў на свабоду асацыяцыяў..........96

*8.* Парушэньне правоў грамадзянаў на свабоду мірных сходаў..........106

*9.* Дыскрымінацыя грамадзянаў па прыкметах мовы і нацыянальнай прыналежнасьці. Парушэньне правоў грамадзянаў на свабоду веравызнаньня..........117

*10.* Ціск сьпецслужбаў на палітычна і грамадзка актыўных грамадзянаў..........124

*11.* Выкарыстаньне катаваньняў, жорсткага ці негуманнага абыходжаньня з затрыманымі, падсьледнымі і арыштаванымі..........128

12. Праваабарончая дзейнасьць. Ціск на праваабаронцаў і праваабарончыя арганізацыі..........138

Дадатак: Рэзалюцыя Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў «Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі»..........146

**У аналітычным аглядзе парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі ў 2006 годзе скарыстаныя фотаздымкі photo.bymedia.net, svaboda.org, Юрыя Дзядзінкіна, Сержука Серабро, а таксама інфармацыя інтэрнэт-сайтаў: spring96.org, svaboda.org, baj.ru, charter97.org і інш.**